№ 3-4 (78)
27 студзеня
1997 г.

НАША НІВА

беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску

Карэспандэнты "НН" працуюць у Грозным

У гэтыя дні спэцыяльныя карэспандэнты "НН" Алег Дашкевіч і Лёлік Ушкін працуюць назіральнікамі на прэзыдэнцкіх выбарах у Грозным.

Сярод афіцыйных міжнародных назіральнікаў за выбарамі ў Чачэнскай Рэспубліцы Ічкерыі 27 студзеня 1997 году — два назіральнікі зь Беларусі. Гэта супрацоўнікі газэты "Наша Ніва" і Грамадзкага Архіву Найноўшае Гісторыі Алег Дашкевіч і Лёлік Ушкін.

Працэс міжнароднага назіраньня за выбарамі ў Чачэніі арганізаваны пад эгідаю АБСЭ. Паездка беларускіх назіральнікаў наладжаная з ініцыятывы маскоўскіх праваабаронцаў, якія падтрымліваюць кантакты з "Нашай Нівай". Тэхнічна візыт арганізаваны маскоўскім фондам "Гласность" і Канстытуцыйным Судом Ічкерыі. АБСЭ надае вялікую ўвагу кантролю за выбарамі з боку міжнародных назіральнікаў, бо гэта дапаможа выкананьню дэмакратычных нормаў выбараў ды легітымацыі і прызнаньню іх вынікаў, у тым ліку з боку Расеі.

Ужо ў Маскве беларускія назіральнікі сутыкнуліся з праблемамі. Выконваючы адмысловы пашпартны рэжым расейскае сталіцы, маскоўская міліцыя, не разабраўшыся ў сытуацыі адразу, выставіла прэтэнзіі Алегу Дашкевічу й часова затрымала яго.

У часе апошняе тэлефоннае сувязі перад вылетам у Грозны нашыя калегі паведамілі, што прэзыдэнт Чачэніі Яндарбіеў заявіў пра немагчымасьць гарантыяў бясьпекі для журналістаў. Мы чакаем новых зьвестак ад нашых калегаў.

A.Dz.

P.S. Учора, у нядзелю, 26-га студзеня Алег Дашкевіч і Лёлік Ушкін затэлефанавалі у рэдакцыю ўжо з Грознага й паведамілі, што дэлегацыя беларускіх назіральнікаў атрымала накіраваньне кантраляваць выбары ў Ведзяно і сёньня выяжджае ў штаб Шаміля Басаева.

Анатоль Сідарэвіч пра карную псыхіятрыю ў БССР

Здымак Уладзімера Шлапака

Анатоль Сідарэвіч — публіцыст і гісторык, адзін з тых людзей, якія непасрэдна з-за свайго вальнадумства патрапілі пад рэпрэсіі з боку таталітарнае сыстэмы. У інтэрвію, якое сп. Анатоль даў Грамадзкаму Архіву Найноўшае Гісторыі, ён вельмі сьціпла акрэсьліў уласны шлях, затое даў досыць выразнае ўяўленьне пра функцыянаваньне мэханізму запалохваньня й рэпрэсіяў у БССР. На старонцы 6.

Дзяніс Раманюк. Малы трон. Выстава "Аутапартрэт іншага" (глядзі старонку 8).

Літаратура

Табе гамон!

Апавяданьне Лявона Вольскага

Сьцяпан Пятровіч працуе журналістам. Ён робіць рэпартажы, актуальныя інтэвію ды аналітычныя перадачы на тэлевізіі. Яшчэ ён працуе ў газэтах, піша камэнтары да розных падзеяў. Сьцяпан Пятровіч — ідэалягічны жуналіст. Калісьці даўно ён займаў даволі высокую пасаду ў партыйнай арганізацыі журналістаў. Тыя часы незваротна мінулі. Але Сьцяпан Пятровіч ніколі не сварыўся з уладамі. Пэўны час ён займаўся нарысамі нораваў, рабіў праблемныя матэрыялы. Цяпер жа, калі, нарэшце, усталявалася моцная ўлада, Сьцяпан Пятровіч стаўся рупарам гэтае ўлады. Сьцяпан Пятровіч мае вялікую кватэру (нядаўна зрабіў рамонт). Сьцяпан Пятровіч мае машыну. Сьцяпан Пятровіч мае жонку й сына...

На старонцы 14.

МОВА НАША І ВАША

Сёньня ў Беларусі ўжываюцца дзьве беларускія мовы, што ніяк не спрыяе кансалідацыі нацыянальных сілаў.

Чаму ў нашай краіне — у параўнаньні зь яе сярэднеэўрапейскімі суседзямі — усё адбываецца наадварот? Яны выйшлі або выходзяць з крызысу, у нас жа ён толькі паглыбляецца. Іх прымаюць у Эўрапарлямэнт, нас адтуль выкідаюць. Яны навялі ў сябе парадак, шануюць законы і свабоду, а ў нас ніхто ні за што не адказвае, законы "плахія", у турмы садзяць не бандытаў, а паэтаў і журналістаў. Яны стварылі свае дзяржавы, а ў нас задача — стаць часткай Расеі... Чаму?

Адказ просты: у суседзяў перамаглі сілы розуму і дабра. А ў нас — не перамаглі. Бо ня здолелі так, як у іх, аб'яднацца дзеля перамогі.

Адзін мой знаёмы журналіст кажа: у нас пацярпела паразу нацыянальная ідэя.

— У такім выглядзе, — удакладняю я.
— У такім выглядзе, — згаджаецца ён.
— А хто перамог? — пытаюся я.
— Ніхто, — адказвае ён.

Сапраўды, перамагла не якая-небудзь іншая ідэя альбо палітычная сіла. Перамог Ніхто. Перамагла гістарычная паўза, якую зараз запоўнілі ўчарашнія намэнклятуршчыкі, службісты, саўкі і братва. "Урламент", — як кажа другі мой знаёмы журналіст. Перамаглі так, як перамагае аўтсайдэр, калі фаварыт не выходзіць на рынг. Задача ніхтоўпераможцаў — толькі вяртаць старое: сымболіку, ссср, сталіцу-Маскву і г.д. Бо ствараць яны ў прынцыпе ня здольныя. Але рэч ня ў іх. Рэч у фаварыце, які ня выйшаў на рынг. Рэч у тым, чаму ў нас не адбылося кансалідацыі сілаў розуму і дабра, як гэта адбылося ў нашых сярэнеэўрапейскіх суседзяў?

Працяг на старонцы 3.

ГРАМАФОН.

Старонка вершаванага радка

Аляксандар Антончык, Язэп Вісарыёнаў, Яўген Гучок, Генадзь Драгун, Алесь Макрацоў, Агата Нагорная, Сяргей Папар, Браніслаў Пяткевіч, Тацяна Сьнітко, Яўген Сялюк, Тацяна Ульянычава, Андрэй Храпавіцкі, Юля Ціхановіч, Ірэна Янчанка.

На старонцы 14.

Анонс

У наступным нумары "НН":

... 29 і 30 красавіка 1933 году з Масквы і Менску былі адпраўленыя на працоўнае пасяленьне два эшалёны "дэклясаваных элемэнтаў". Гэтыя эшалёны, падбіраючы на шляху праходжаньня падобны ж кантынгент, прыбылі ў Томск, а затым на баржах — у Нарымскую акругу...

Артыкул Ігара Кузьняцова "Востраў сьмерці".

... У 1961 годзе ў шэрагу гучных назваў разнастайных фронтаў, партыяў і рухаў зьявілася абрэвіятура "ЕТА". Гэтак называлася арганізацыя, што аб'ядноўвала маладых басконскіх патрыётаў.

Артыкул Лёліка Ушкіна "Бацькаўшчына і свабода!"

...Няма на сьвеце нічога больш супраціўнага мысьленьню і Богу, чым забабонная і вар'яцкая вера ў магію лічбаў. Прароцтва — гэта не мэханічны і не матэматычны гвалт над рэчаіснасьцю. Няма болей сьмешных людзей, чым тыя, што з стагодзьдзя ў стагодзьдзе складаюць ды аднімаюць, абы нарэшце атрымаліся шасьцёркі або дзявяткі, або сотні...

Артыкул Андрэя Дынько "Сыход прарокаў".

НАСТУПНЫ НУМАР "НН" ВЫЙДЗЕ 10 ЛЮТАГА НА 24-Х СТАРОНКАХ.

Хто і як рыхтуе Нобэлеўскую ўзнагароду?

Кухня паджылых людзей

Чаму Леў Талстой ці Джэймс Джойс, пісьменьнікі першай велічыні, не атрымалі літаратурнай нобэлеўскай узнагароды? Бо ніколі не былі вылучаныя на яе!

Пра таямніцы Нобэлеўскага камітэту – у артыкуле на старонках 10-11.

Крах банкаўскага дому Вінні-Пуха

Ідэя Леліка Ушкіна. Малюнкі Сяргея Харэўскага

КЛЮЧЫ АД КАМЭРЫ

Судзілішча, якое чыняць у Віцебску над Славамірам Адамовічам, паўтарае клясычны сярэднявечны сюжэт пакараньня вядзьмаркі. Людзі, зусім далёкія ад літаратурнай творчасьці, імкнуцца ахапіць яе нормамі юрыспрудэнцыі. У анталягічным людзкім непаразуменьні выйграе той, у каго ёсьць ключы ад камэры.

Пры гэтым усе ведаюць, хто выйграе, хто ўжо перамог у глябальным гістарычным часе. Загоншчыкі стараюцца пра такія рэчы ня думаць, бо мысьляць толькі ў катэгорыях сёньняшняга дня. Адамовіч, наадварот, пра такія рэчы думае, і гэтыя думкі даюць яму сілы жыць.

Творчасьць і юрыспрудэнцыя заснаваныя на розных падмурках. Калі ў падмурку першай ляжыць праўдападабенства, выдумка, фікцыя, то другая апэруе толькі фактамі, доказамі, лёгікай. Суд над паэтам сьведчыць пра тое, што юрыспрудэнцыя пачала кіравацца ня праўдаю, а праўдападабенствам, што самое жыцьцё складаецца ня з фактаў, а з выдумак, што ў жыцьці стала зашмат літаратуры. Пра гэта, дарэчы, сьведчыць і тое, што ў беларускай літаратуры сёньня літаратуры замала. Народ не жыве, а як бы прыдумляе сваё жыцьцё. Людзі — ня людзі, а пэрсанажы. Так бывае не ад дабра, а ад таго, што ў жыцьці стала зашмат хлусьні. Праўдападабенства ў літаратуры — гэта і ёсьць хлусьня ў жыцьці.

Вось чаму ці не любы клясык сусьветнае літаратуры, прапушчаны праз чысьцілішча КГБ, можа сьмела разьлічваць на жорсткі прысуд. Але ў сучасным цывілізаваным сьвеце ўсе гэта як бы разумеюць і таму паэтаў за вершы ня судзяць.

Верш "Убей президента", надрукаваны ў віцебскай газэце "Выбар", выглядае сёньня зусім адпаведным задуме. Паводле прызнаньня аўтара, ён напісаны па-расейску дзеля таго, каб не псаваць родную мову тым, пра што ў ім распавядаецца. Да таго ж, верш напісаны *агіднай* расейскай мовай.

Герой верша — "президент" — у творы ніяк не ідэнтыфікуецца: хто такі і чаго ён прэзыдэнт. Тым ня менш, КГБ убачыла ў гэтым вобразе прэзыдэнта РБ, за што ўласна і быў рэпрэсаваны С.Адамовіч. Такая ідэнтыфікацыя ўскосна вынікае з паводзінаў самога А.Лукашэнкі, які фактычна зьнішчыў усялякія магчымасьці спаборніцтва з сабою за прэзыдэнцкае крэсла палітычнымі сродкамі: разагнаў парлямэнт, прафанаваў выбары, раз-пораз праводзіць рэпрэсіі супраць апазыцыі і незалежных сродкаў масавай інфармацыі. Такія дэспатычныя паводзіны першае асобы прымушаюць функцыянэраў рэжыму бараніць лідэра ад замахаў.

Увогуле іх стараньне можна зразумець, але ў дадзеным выпадку яны пераблыталі боб з гарохам, убачыўшы замах тэрарыста ў вершы С.Адамовіча. Зьяўляецца такое адчуваньне, што рэжым, які зрабіў усё, каб забясьпечыць сябе ад замаху, цяпер мроіць пра адно — пра тэракт. Але марна. Падобна на тое, што гэты рэжым сканае не ад замаху, а ад яго адсутнасьці, ад уласнага чаканьня, ад пераседжваньня. І адзіным ягоным здабыткам за ўсе гады праўленьня застануцца ня посьпехі ў эканоміцы, культуры ці дзяржаўным будаўніцтве, а — ключы ад камэры, у якой сядзіць паэт.

Рэдактар

Здымак Уладзімера Парфянка

Ад "Нашай Нівы" да Славаміра Адамовіча

У Лёндане на працягу апошніх гадоў ужо сталася традыцыяй, калі тутэйшыя беларусы і іх ангельскамоўныя сябры (у тым ліку і шатляндзкія патрыёты) у канцы году аддаюць даніну літаратурнай падзеі, што адбылася на працягу мінулых 12-ці месяцаў, чытаючы беларускія творы ў ангельскім перакладзе.

Такія літаратурныя вечарыны зьбірае Ангельска-Беларускае Таварыства, заснаванае ў 1954 г. Ужо 30 гадоў Таварыства праводзіць штогадовыя курсы па ўсіх аспэктах беларусістыкі. Пасьля таго, як падзеі 1991 г. выклікалі больш глыбокі інтарэс да Беларусі, лекцыі пачалі праводзіцца сумесна з Інстытутам славістыкі і ўсходне-эўрапейскіх дасьледаваньняў (School of Slavonic and East European Studies).

Штогадовыя вечарыны ладзяцца вядомай перакладчыцай беларускай паэзіі Верай Рыч і яе сябрамі. Сёлета ўзімку (вечарына ладзілася 8 студзеня) сябрамі былі Эн Эдгар-Уолтэрс (Anne EdgarWalters) — паэтка і акторка, Элісан Камэрон (Alison Cameron), якая адказвае за міжнародныя кантакты гарадоў-пабрацімаў Aberdeen (у Шатляндыі) і Гомеля, а таксама Адам Ньюі (Adam Newey) з рэдкалегіі часопіса "Index on Censorship" (Індэкс цэнзуры), заснаванага ў 1972 г. дзеля маніторынгу і паведамленьня пра выпадкі рэпрэсіяў супраць свабоднага слова, дзе б яны ні адбываліся. Да ўдзельнікаў далучыліся акторка Таня зь менскага тэатру "Дзе-я?" і адзін з даўніх і добра вядомых сяброў Беларусі ў Вялікабрытаніі Гай дэ Пікарда (Guy de Picarda). Вяла вечарыну Вера Рыч.

Праграма мела некалькі тэмаў. Першая, натуральна, — 90-ыя ўгодкі заснаваньня "Нашай Нівы". Гэты разьдзел пачаўся зь верша Янкі Купалы "Прарок" — "актуальнага і на сёньняшні дзень". За ім пасьледавалі яшчэ два купалаўскіх вершы, дзе гучыць надзея на тое, што вясна такі прыйдзе ў Беларусь. Затым былі зачытаныя выбраныя творы нашаніўскіх аўтараў — некаторыя зь іх добра вядомыя прысутным: "Песьня-звон" Алеся Гаруна, "Зорка Вэнэра" і "Слуцкія ткачыхі" Максіма Багдановіча ды іншыя.

"Мы аддаем даніну ня столькі друкаваным старонкам "Нашай Нівы", — сказала Вера Рыч, — колькі духу нашаніўскага пэрыяду, безь якога было б немагчым літаратурнае адраджэньне гэтых гадоў!"

Далей адзначылі дзьве асабістыя гадавіны самой Веры Рыч: яе 60-я ўгодкі, 40 гадоў яе працы ў якасьці перакладчыцы славянскіх літаратураў і 25-ыя ўгодкі з дня выхаду ў сьвет яе анталёгіі беларускай паэзіі "Як агонь, як вада". Для прэзэнтацыі ўласнай творчасьці яна выбрала свой верш, напісаны ў 1958 г., пад назвай "Да ўгодкаў Слуцкага паўстаньня" і прачытала яго ў ангельскім арыгінале і ў беларускім перакладзе. Анталёгія была адзначаная двума творамі, якія, як сказала Вера Рыч, "па зразумелых усім прычынах у свой час не друкаваліся ў БССР".

Дзясятыя ўгодкі Чарнобылю былі адзначаныя ўрыўкам "Бярозавы сок" Вольгі Іпатавай, апублікаваным ў Лёндане ў 1996 г. у анталёгіі пад назвай "Радыяцыя", а таксама вершам Іпатавай "Чарнобыль", апублікаваным у "Індэксе". З таго ж "Індэксу" было зачытанае эсэ "Гісторыя ліквідатара" пра афіцыйнае ўтойваньне інфармацыі пра чарнобыльскую аварыю адразу пасьля здарэньня.

Нарэшце, яшчэ два ўрыўкі з "Індэксу цэнзуры". Спачатку — эсэ, поўнае іроніі і забойчага гумару наконт наступу на незалежную прэсу ў Беларусі, а пад канец вечарыны — твор, які заплянавана ўключыць у першае выданьне "Індэксу" за 1997 г. Гэта — "Луста чорнага хлебу" Славаміра Адамовіча, апублікаваная ў "Нашай Ніве" улетку 1996 г.

"Londoner"

Пераклад з ангельскай У.Б.

"Жанчына з газэты "Имя"

У першым нумары ангельскага часопіса "Index on Censorship" за гэты год у перакладзе Веры Рыч надрукаваны верш Славаміра Адамовіча "***Кавалак чорнага хлеба...", які быў напісаны паэтам у рэанімацыйным блёку шпіталя КГБ у Менску летась 23 чэрвеня і ўпершыню апублікаваны ў "Нашай Ніве" 1 ліпеня. У вершы паэт распавядае пра тое, як да яго ў шпіталь інкогніта пранікла журналістка з газэты "Имя". Гэта была Алена Лукашэвіч, якая выдала сябе за нявесту Адамовіча.

Як паведаміла "НН" спадарыня Вера Рыч, напярэдадні аднаўленьня суда над паэтам у Віцебску (3 лютага) у лёнданскай англіканскай царкве Сьв. Брыгіты (St. Bride's) адбудзецца імша ў гонар Славаміра Адамовіча. Брыгіта — ірляндзкая сьвятая, патронка акушэраў, журналістаў, паэтаў і ўсіх людзей, якія працуюць уначы.

(БРАТ)

SLAVAMIR ADAMOVICH

'A morsel of black bread'

On 25 November, the trial began of Slavamir Adamovich, the first poet in Belarus since the Stalinist era to be prosecuted for his writings. The poem in question, a satirical verse entitled 'Kill the President', appeared in the spring of 1995 in the Vitebsk independent paper *Vybar*. Adamovich was arrested a year later, in the aftermath of the Chernobyl memorial rally in Minsk, which was treated by the authorities as a subversive act and broken up violently by the police.

While in pre-trial detention, Adamovich went on hunger strike, which brought him close to death. He was taken into the intensive care unit of Minsk's KGB Hospital (the old name is still used), where he wrote the following poem:

A morsel of black bread,
Our own bread from our own rye,
Give to me, broken in two halves —
For you and for me — and moistened with honey
Still not solid, still fragrant with wax
And our wide spaces,
Let's have a snack my friend,
Let our bodies be replete
With the high energy of the primaeval forest
And the horizontals of the field
After so many days of dying
There's a fragrance of the wild rain
In the mint and camomile posy
Brought us by an incognito
Woman from the newspaper *Name*.

KGB Hospital, 23 June 1996

Translated by Vera Rich

Пошта

Шаноўная Рэдакцыя,

Распачаць гэты аповед мяне вымусілі дзьве прычыны: па-першае, хацелася падзяліцца сваімі думкамі, а па-другое, я абавязаны папрасіць прабачэньня ў аднаго чалавека.

Сам я вырас на вёсцы, якая межавала з горадам. Першапачатковую адукацыю ўзяў у сялянскай 3-клясавай школцы. Потым, атрымаўшы кватэру ў горадзе, бацькі аддалі мяне, ня ведаю як цяпер, а тады — у адну з самых узорных школ Менска, у СШ №4, якая месьцілася каля Ленінскай бібліятэкі і шмат якіх іншых ленінскіх установаў.

Лягічна, што ў гэтай школе вучыліся пераважна дзеці з прэстыжных раёнаў і, натуральна, з намэнклятурных сем'яў. Якія маглі быць іх адносіны да мяне, нічым не прыкметнага хлопца з простай сям'і, а галоўнае, зь вёскі? Натуральна, абразьлівыя. У мяне і так вочы разьбягаліся ад усяго гарадзкога (поўная супрацьлегласьць сялянскаму жыцьцю — як у побыце, так і ў адносінах паміж людзьмі), а тут яшчэ нічым, на маё разуменьне, не апраўданыя крыўды. Можа іншы на маім месцы адразу стаў бы нацыяналістам, але ў дзесяцігадовым узросьце са мною такога ня здарылася, на жаль. І я стаў прыстасоўвацца да "гарадзкіх".

Цяпер я разумею, што прычынай, якая праз зьдзекі прымушала мяне і шмат каго іншага прыстасоўвацца, выкараняць і без таго слабую беларускую мову, мяняць лад мысьленьня, — была мэтанакіраваная барацьба (нават вайна) зь Беларусяй, вайна, якую падтрымвалі як так званыя кіраўнікі краіны, так і простыя, зацікаўленыя рознымі спосабамі настаўнікі. Скуль мне ўсё гэта было ведаць тады? Тым больш, што фізычнага болю было больш, чым духоўнага.

Прайшло пяць гадоў. Ня ўсіх яшчэ беларусаў да 1985 году абмаскалілі так, як мяне. Засталіся вёскі, якія знаходзяцца далёка ад гарадоў. І людзі там не саромяцца гаварыць на мове, якая дасталася ім ад дзядоў, не саромяцца расказаць пра свой сялянскі побыт, пра сваю працу, якая корміць і іх, і горад. Хлопца з адной такой вёскі маці адпраўляе атрымліваць адукацыю ў тое самае СПТВ, у якое найшоў вучыцца і я. Ён апынуўся ў падобнай сытуацыі, што я пяць гадоў таму.

Вы думаеце, я падтрымаў яго ці стараўся заступіцца хаця б тады, калі яго білі (хто вучыўся ў тыя гады ў так званай "хабзе", той зразумее, што значыць біць)? Каб! Я ўжо сам удзельнічаў у вайне, на жаль, на баку Масквы.

Яго звалі Ваня Масевіч. Ніколі цяпер не забуду, як яго зьневажалі ня толькі "гарадзкія", але і такія ж "сяляне", але з больш "гарадзкой" мовай, як ён сыходзіў з інтэрнату і блукаў суткамі ў раёне чыгуначнага вакзалу ў пошуках спакою. Я зьвяраю свой лёс зь лёсам Вані. Мы перажылі адно й тое ж. І гэта цяпер я паступіў бы па-іншаму, але сёньня мне застаецца папрасіць прабачэньня, у першую чаргу ў Івана Валяр'янавіча Масевіча, а потым і ва ўсіх астатніх сумленных беларусаў, за позьняе асьвятленьне, ды позьняе далучэньне да Беларускай ідэі.

Маці Вані, відаць, усё разумела. Прыехаўшы адзін, другі раз, нарэшце, на трэці — яна проста забрала сваё дзіця з нашай "хабзы" і аддала ў іншую навучальную ўстанову. Як склаўся ягоны лёс, я ня ведаю. Дый успамінаць і аналізаваць усё былое я пачаў толькі пасьля прыходу да ўлады ППРБ. Але цяпер я ведаю, што падказаць сваім дзецям, калі яны будуць чуць сьмешкі за беларускую мову. Я навучу іх бараніць сабе, сваю сям'ю і сваю Беларусь.

Ван Дзік Матусевіч

Вельмі шаноўныя стваральнікі "НН"!

Віншую Вас, Вы зноў патэзілі ў "дзясятку"! Вялікі дзякуй за №1-2. Вечнасьць ёсьць найвялікшай канстантай нашага быцьця. Таму перадусім варта пісаць пра яе. Яна ёсьць апірышчам духу, што зазнае сёньня цяжкія выпрабаваньні. Хай пра ўвесь маразм гэтае ўлады піша той, хто залежыць ад яе. Але нам гэны летапіс чытаць нецікава. Мы маем СВАЮ газэту, якая сталася нашай рэальнасьцю і віртуальнасьцю. Яе нам дастаткова.

Янка Хранавіцкі,

Глыбокае

Паважаная рэдакцыя,

Сп-ня Гэды Здановіч зьвярнулася да мяне з просьбай, каб я Вас паінфармаваў пра сьмерць некалькі месяцаў таму яе мужа. Дык у гэткім выпадку, будзьце ласкавыя, не высылайце больш "НН" на імя нябожчыка. Сп-ня Здановіч — швэйцарка і пабеларуску не разумее.

Ул.Грэмяка,

Англія

АД РЭДАКЦЫІ

Аляксандар Здановіч быў ня толькі падпісчыкам, але й аўтарам "НН". Некалькі разоў ён дасылаў нам зь Лёндану свае допісы і ўспаміны, якія зьмяшчаліся на старонках газэты і, пэўна, запомніліся чытачам (напр., тэкст "На бальніцу" ў пятым, "весным нумары" "НН" за 1995 г.) Рэдакцыя вельмі разьлічвала на працяг супрацоўніцтва са сп. Аляксандрам. На жаль, гэтыя разьлікі ўжо ня спраўдзяцца...

МОВА НАША І ВАША

Працяг са старонкі 1

У нас ніхто не стаяў, узяўшыся за рукі, адным Балтыйскім Шляхам на працягу 700 км. і 300-тысячны мітынг не сьпяваў адну песьню. У нас "разборкі" дэмпартыяў паміж сабою і заляцаньне да ўладаў мела не эпізадычны, а часта вырашальны характар.

Магчыма, рэч у тым, што беларусы — сапраўды самая савятызаваная нацыя. І таму нават у першых шэрагах пад лёзунгамі незалежнасьці, дзяржаўнасьці і антыкамунізму стаялі людзі, якія паводле сутнасьці сваёй не перасталі быць савецкімі. Не было ў нас ганебнага слупа, да якога б цьвікамі прыбівалі партбілеты, не было ўнутранай люстрацыі, ці ня кожны пакідаў сабе нейкія шляхі для адступленьня.

І Рубікон не перайшлі. У адраджэнскім асяродзьдзі выгадавалася цэлая пляяда дзеячоў — экс-капэсэсьнікаў, якім прасьцей знаходзіць агульную мову з сучаснымі нэакамуністамі, чым з тымі кволымі зародкамі беларускага грамадзтва, якія паўсталі ўжо на тым беразе Рубікону — з маладымі адраджэнцамі. Па самым вялікім рахунку ніхто нічым не ахвяраваў. Таму ніхто толкам і не аб'яднаўся.

Ёсьць такія словы ў вершы Ігната Канчэўскага: **"Мы разам, бо нас яднае супольнасьць ахвяры"**...

Напэўна толькі С.Адамовіч сёньня ратуе гонар беларускай дэмакратыі. Але й гэтая ахвяра недаацэньваецца прасавечаным вокам. Знаходзіцца маса агаворак і апраўданьняў бязьдзейнасьці: то герой "не такі", то яшчэ што... Між тым, першымі заўсёды ідуць "не такія". А пасьля — усе астатнія. Толькі пасьля бывае ўжо позна.

Акрамя супольнай ахвяры аб'яднаць сілы розуму і дабра можа **супольны вораг**. Але разгледзець ворага амаль немагчыма, калі ты сам не прамыў вочы ад савецчыны. "Савецкі беларус" Лукашэнка такімі вачыма ўспрымаецца зусім неадназначна.

У гэткім тумане размытых прынцыпаў і канстантаў беларуская дэмакратыя варожыць над уласным лёсам, спрабуючы зразумець, дзе ж яна і што робіць: ці то ў саўне абшчаецца з іванамі іванавічамі, ці то лічыць патроны ў туманнай пойме партызанскай ракі...

У нашых суседзяў найважнейшым кансалідантам стала **рэлігія**. У Польшчы кажуць, што "Салідарнасьці" не было б, калі б не было касьцёла. Адна рэлігія кансалідуе. У Беларусі як мінімум тры: праваслаўе, каталіцтва і нэапратэстантызм, якія сёньня хутчэй расколваюць грамадзтва, чым яднаюць.

Гістарычная сьведамасьць яшчэ настолькі кволая, дый не дасца яна за год-другі. Асабліва ва ўмовах недахопу літаратуры, фальсыфікацыяў, разброду гістарыяграфічных трактовак (то мы балты, то ня балты)... Словам, не кансалідуе таксама.

Памятаю, як летась 2 красавіка 50 тыс. чалавек апынуліся каля рэстарацыі "Канстанцін", накрычаліся лёзунгаў, намахаліся сьцягамі і — адчулі няёмкасьць, нейкую пустату. Нібы рэсурс яднаньня быў вычарпаны.

Няўжо ўсё, што нас яднае — гэта сьцяг і "Жыве Беларусь!"? Але гэтага мала.

Там, каля "Канстанціна" мусіла загучаць **песьня**. Натоўп мусіў засьпяваць. У нас, сьпеўнае нацыі (адных вясельных песень — шэсьць таўшчэзных тамоў), — нібы ком у горле. Народ згубіў сваю песьню. Песьня, магутны кансалідант, не кансалідуе.

Падобна на тое, што толькі **мова** магла б стаць найбольш эфэктыўным зьядняльнікам беларусаў. Безь яе не спрацоўваюць ані незалежнасьць, ані дзяржаўнасьць. Але мовы ў нас таксама дзьве...

Наша мова прыйшла ў незалежнасьць і апазыцыю, так і не пазбавіўшыся дэфармацыяў савецкага часу. Яна стала антыкамуністкай, так і ня выняўшы з кішэні свой партбілет. Яна разьвіталася зь мінулым не рашуча і безаглядна, ня раз і назаўсёды, а як бы на час, як бы на ўсякі выпадак. Яна не перайшла водападзелу эпох, постсавецкае чысьцілішча і ня стала прынцыпам аб'яднаньня.

Мова падзялілася надвое. Дакладней, падзялілася яна яшчэ ў 30-я гады, калі **побач з проста беларускай мовай узьнікла беларуская савецкая мова**. В.Вячорка назваў проста мову **тарашкевіцай**, а савецкую — **наркомаўкай**.

(Я кажу "мова", бо гэта ня толькі розны правапіс, але й марфалёгія, і вымаўленьне, і лексыка... Мінск і Менск, рускі і расейскі...)

Нагадаю. Сучасны беларускі правапіс стварaўся ў пачатку стагодзьдзя, у нашаніўскую пару. Вынікам гэтае працы стала "Беларуская Граматыка" Браніслава Тарашкевіча (адсюль – тарашкевіца). У 1933 г. у кантэксьце сталінскае палітыкі сваю рэформу беларускае мовы правялі народныя камісары (адкуль – наркомаўка).

Так паўсталі дзьве мовы, два законы, паводле характару і мэтаў скіраваныя ў адваротныя бакі: тарашкевіца імкнулася ўзаконіць жывую беларускую мову, падкрэсьліць яе багацьце, адметную гармонію і здольнасьць абслугоўваць усе сфэры жыцьця нацыі. Наркомаўка імкнулася "спрасьціць" беларускую мову, "наблізіць" яе да расейскай, падкрэсьліць яе "грубасьць" і няздольнасьць перадаваць "глыбокія думкі" (апошнім гэтую тэзу ўзяў на ўзбраеньне А.Лукашэнка).

Пасьля татальнага ўвядзеньня наркомаўкі, якое адбылося ў 30-я гады паралельна зь фізычным вынішчэньнем соцень тысячаў лепшых прадстаўнікоў беларускае нацыі, тарашкевіца засталася жыць ў эміграцыі, у несавецкіх беларускіх асяродках, якія за 60 гадоў так і не адчулі патрэбы перайсьці на наркомаўку, бо ставілі на мэце выжываньне культуры, а якая культура можа выжыць на грунце сурагату?

Наркомаўка, якая стваралася для "зблізжэньня" з расейскай мовай, як бы закладаная на гістарычную непазьбежнасьць

русыфікацыі Беларусі, а тарашкевіца, створаная ў тым ліку і дзеля "водападзелу", — на незалежнасьць.

Як Ластоўскі стварыў першую нацыянальную гісторыю, так і Тарашкевіч стварыў сваю граматыку — каб паказаць самакаштоўнасьць гісторыі і мовы. У 30-я гады народныя камісары кіраваліся адваротным: паказаць несамастойнасьць гісторыі і мовы.

Наркомаўка стала дэкаратыўным прыкрыцьцём русыфікацыі. Можна толькі дзівіцца, як усе гэтыя 60 гадоў сотні беларускіх пісьменьнікаў у БССР пісалі літаральна сурагатам. Гэта ж усё адно як граць на піяніне біз чорных клявішаў, без дыезаў і бэмоляў! Але сытуацыя зробіцца зразумелай, калі прыгадаць, што выступы старэйшых літаратараў Янкі Скрыгана і Максіма Лужаніна за вяртаньне тарашкевіцы ў 70-я гады ўспрымаліся як сапраўдныя акты грамадзянскае мужнасьці.

Тарашкевіца — гэта зусім поўная, не шчарбатая моўная "клявіятура". Тут улічаны ўвесь досьвед разьвіцьця беларускае мовы, у тым ліку, дарэчы, і традыцыя лацінскага шрыфту (тарашкевіца "канвэртуецца" на лацінку). Гэта значыць, што мы можам кірыліцай узнаўляць тэксты Багушэвіча, Каліноўскага, а не прафанаваць іх. Зь іншага боку, менавіта наркомаўка, гэтая паўмова, не заключаная ў рамкі пэўнае гармоніі і штучна набліжаная да расейскае мовы, паспрыяла легалізацыі ў грамадзкай сьвядомасьці так званай трасянкі. Сёньняшняй намэнклятуры гаварыць так, як яна "хаціць", — ня сорамна.

Рэч у тым, што ў кантэксьце тарашкевіцы трасянка ўспрымаецца як адзін з стылёвых пластоў — як анальфабэтызм, як "некультурная мова". "Красіваму ўсё красіва". Па-свойму гэта толькі ўзбагачае мову. Бо ня мова характарызуе сама сябе, а носьбіт трасянкі паказвае сябе як анальфабэта. У кантэксьце наркомаўкі (зь яе тэндэнцыяй да спрашчэньня і русыфікацыі) трасянка калі і ўспрымаецца як памылка, то ў адным стылёвым полі. Гэта памылка тэксту і характарызуе яна самую мову.

Тое самае адбываецца і з русізмамі, якія ў тарашкевіцы ўспрымаюцца як барбарызмы, а ў наркомаўцы – як знакі фатальнага лёсу беларускае мовы, будучыня якой пад пытаньнем.

Спрабуючы пісаць макаранічныя (беларуска-расейскія) тэксты і трасянкавыя дыялёгі ў наркомаўцы, я як аўтар не дасягаю таго эфэкту характарыстык, якога дасягаю ў тарашкевіцы. У наркомаўцы такі тэкст успрымаецца як недарэчнасьць (что он эцім хацел сказаць?). Між тым такія дыялёгі бяруцца з жывое моўнае практыкі і адлюстроўваюць рэальнасьць.

Тарашкевіца кіруецца законамі ўласнае гармоніі, адсюль яе сьведамая "самадысцыпліна". Наркомаўка праўяраецца ня ўнутраным гарманічным кодам, а акадэмічным слоўнікам і акадэмічнай граматыкай. Апошнім часам зьявіўся і сучасны тарашкевічны правапіс (часопіс "Спадчына" №5 за 1995 год). Ён здымае большасьць праблемаў ды разыходжаньняў і на парадак меншы за акадэмічны, але гэтага карыстальніку дастаткова.

Стыхійнае беларускае адраджэньне канца 80-х, якое ўвасабляла моладзь, адразу і цалкам паслугоўвалася тарашкевіцай. Усе (!) незалежныя дэмакратычныя выданьні выйшлі тады тарашкевіцай. "Беларуская Кроніка", "Беларуская Сьвятыня", "Беларуская Трыбуна", "Беларускі Калекцыянэр", "Навіны БНФ", "Свабода", "Студэнцкая Думка" (Менск), "Абуджэньне" (Магілёў), "Бабруйскі Кур'ер", "Вольнае Глыбокае", "Вольны Мазыр", "Івейская Крыніца", "Куцейна" (Ворша), "Пагоня" (Горадня), "Раніца" (Маладэчна) ды шмат іншых.

Мова ставала прынцыпам дэсавецізацыі, які трэба было ўвесь час сьцьвярджаць і адстойваць. Сьледам за незалежнымі пачалі пераходзіць на тарашкевіцу і некаторыя дзяржаўныя выданьні (напрыклад, часопісы "Бярозка" і "Спадчына"). У выдавецтве "Беларуская Энцыкляпэдыя", дырэктарам якога быў Б.Сачанка, пачалі паступова ўводзіць нормы тарашкевіцы (напрыклад, замест "з'ява" ўжо пісалі "зьява"). Гучалі галасы пра патрэбу моўнае рэформы, якая б узгадніла адзіны правапіс беларускае мовы.

Незалежныя выданьні чыталі. Іх тыражы дасягалі 10-50 тысяч. **Беларушчына ў яе дарэформавым выглядзе трывала зьвязвалася з дэмакратыяй і антыкамунізмам**. (У наступныя гады гэтая сувязь была разбураная.)

Ці магло быць інакш? Ці маглі адраджэнцы на мяжы 80-х і 90-х зрабіць стаўку на наркомаўку? Не. Па-першае, яны не маглі прыняць рэформу 1933 г. гэтаксама, як не маглі прыняць сталінскія рэпрэсіі. Па-другое, наркомаўка не магла быць прынцыпам, за які трэба змагацца, які трэба сьцьвярджаць, вакол якога можна яднацца. Бо гэта САВЕЦКАЯ мова. І яна ня можа кансалідаваць дэмакратаў гэтаксама, як савецкая сымболіка або беларускі савецкі гімн. **Дэмакратычная думка мусіла адцурацца ад злачынстваў папярэдніх рэжымаў**.

Дзе сёньня тыя тарашкевічныя выданьні? Большасьць сыйшла з арэны, некаторыя перайшлі на наркомаўку. Магутны аб'яднаўчы прынцып быў разбураны. Чаму?

Першыя нацыянал-дэмакратычныя ініцыятывы не былі падтрыманыя "кадравай" нацыянальнай інтэлігенцыяй. Мова ня стала кансалідантам.

Ці маглі тады, у 90-м, ЛіМ, часопісы СП, ТБМ перайсьці на тарашкевіцу? Маглі. І нават унутрана былі амаль гатовыя да гэтага. Але не перайшлі. Іх аргумэнты: народ і да наркомаўкі не прывык, а вы — з тарашкевіцай; настаўнікі беларускай мовы ня поймуць; у рэдакцыях няма карэктараў, якія б вычытвалі тарашкевіцу...

Што да дзяржавы, то яна, па сутнасьці ўсё яшчэ савецкая, ня толькі не прыняла несавецкую тарашкевіцу, але й стала змагацца зь ёю. Некалькі гадоў таму А.Бутэвіч прысылаў ганцаў у дзяржаўныя выданьні, якія перайшлі на тарашкевіцу, з пагрозаю закрыць выданьне, калі ня здымуць мяккія знакі. Казалі нават, што ў тарашкевічных пэрыёдыкаў будуць забіраць рэгістрацыйныя пасьведчаньні.

"Хай ведаюць хоць такую мову" у аргумэнтацыі "кадравай" інтэлігенцыі нічым не адрозьніваецца ад *"Хай ведаюць хоць такую гісторыю"*. Але народ не прываблівся ані хлусьлівай гісторыяй, ані дэфармаванай мовай. Народ прывабліваецца ўвогуле тым, што ёсьць **прынцып**, а не аморфная інэрцыя мінулых часоў.

Што ж, вынікі гэтае аргумэнтацыі ўсе ведаюць. Мы разбурылі прынцып кансалідацыі, мова засталася існаваць пераважна ў сваім спрошчана-русыфікаваным непрывабным абліччы. Як сурагат.

Калі ўважліва прасачыць сувязі, то мы ўбачым, што за савецкім часам наркомаўка ў БССР надавала ўсёй беларушчыне код чагосьці факультатыўнага, неабавязковага і не зусім сур'ёзнага. За гэтым як быццам толькі фармальным чыньнікам бачацца сутнасныя наступствы. У полі беларушчыны тады так і ня ўзьнік праваабарончы рух, а сёньня моўная беспрынцыпнасьць перарастае ў канфармісцкія дачыненьні з антыбеларускім рэжымам. Пэўная дыфузія паміж гэтым рэжымам і культурай, якая існуе на базе наркомаўкі, ужо становіцца рэальнасьцю. Што да тарашкевічных выданьняў, то форма адносінаў да іх адна — судовыя зыскі.

Наркомаўка не ўтрымае, ужо ня ўтрымлівае адраджэньня, якое стыхійна пачала тарашкевіца. Бо наркомаўка і сымбалізуе не самавітасьць, а бязродзтва.

З-за дзьвюхмоўя сёньня ў Беларусі не адбываецца пераемнасьці культуры. Лукашэнка дабівае старыя культурныя пляцоўкі, якія так і не пажадалі перайсьці Рубікон, а новыя пляцоўкі ўзьнікаюць на "гэтым беразе" на голым месцы. Між тым тарашкевіца набыла сваю вагу і скіраваная ў будучыню. Бо яе ўнутраны код — выжываньне. Выходзяць пэрыёдыкі, кнігі, нават слоўнікі. Можна толькі ўявіць сабе, колькі страціў гэты працэс з-за няўдзелу старэйшых! Але будучыня — за тарашкевіцай, якая возьме ўсё патрэбнае культуры з папярэдніх дзесяцігодзьдзяў. І пераклад на тарашкевіцу будзе абазначаць той самы Рубікон, водападзел эпохаў. Наркомаўка адамрэ разам зь яе карыстальнікамі, бо не арыентаваная на выжываньне.

Тарашкевіца вымагае волі, самасьцьверджаньня і ініцыятывы. Наркомаўка ж нічога гэтага не патрабуе.

Лукашэнка выдатна паказаў, што палітыканству немагчыма супрацьстаяць палітыкай. Яго можна пераадолець толькі культурай — жывой, дзейснай, ачышчанай ад дэфармацыяў, прынцыповай. Шкада, што гэтага ня хочуць разумець аўтарытэты старых культурных пляцовак, якія ставяць на мэце не выжываньне, а — дажываньне.

Ня ўзьбіўшыся на тарашкевіцу і аб'яднаньне вакол яе, інтэлігенцыя не спазнала салідарнасьці. Справа С.Адамовіча — яскравы прыклад. У абарону зьняволенага беларускага паэта выступаюць расейская, польская, ангельская інтэлігенцыя, міжнародныя арганізацыі. Ніводная творчая беларуская арганізацыя ані словам не азвалася на арышт паэта.

* * *

Ня ўзьбіліся і на незалежнасьць. Паўза працягваецца. Усе чакаюць, калі яе зойме якая небудзь ідэя або палітычная сіла, тады ўжо сьвядомыя беларусы наплачуцца, нарыдаюцца над лёсам мовы, культуры, Бацькаўшчыны. Адзіным кансалідантам, як ні парадаксальна, стаў сёньня савецкі мэнталітэт.

Цяпер шмат хто кажа пра героя, які б перамог цмока. Але, на маю думку, такі герой можа зьявіцца толькі ў выніку ачышчэньня прынцыпаў і аб'яднаньня вакол іх усёй нацыянальнай дэмакратыі. Трэба перайсьці Рубікон (а не стаяць пасярод ракі) і цягнуць на той бераг усю краіну зь яе электаратам. Імкненьне незалежнікаў спадабацца народу прывяло да кепскіх наступстваў. Народу павінны падабацца нашыя прынцыпы, а ня мы самі, гатовыя сваімі прынцыпамі ахвяраваць. Мы мусім стварыць маральную большасьць. Якраз мова, ачышчаная ад дэфармацыяў, і стане "объеденителем"* нумар адзін.

Сяргей Паўлоўскі

*Слова з такім сэнсам у беларускай мове дагэтуль няма.

Чацьвертая рэспубліка

Беларуская гісторыя дасягнула таго маштабу падзеяў, калі ўжо ствараецца пэрыядызацыя сваіх палітычных рэжымаў. Адначасова адбываюцца мэтамарфозы з адпаведнымі тэрмінамі — ужываньне ў звыклай сытуацыі робіцца неадпаведным іх дакладнаму сэнсу. Адно з такіх словаў — рэспубліка.

Дэфармацыі тэрміну адбыліся яшчэ ў савецкую эпоху, калі замест дзяржаўнага ладу рэспубліка стала пазначаць адміністратыўна-тэрытарыяльную адзінку. БССР — усяго толькі назва правінцыі. Гэтага сындрому падмены паняцьцяў у Беларусі 90-х пазбаўляліся доўга, пакуль нарэшце нават у афіцыйнай прэсе не замацавалася слова краіна. Якая, у такім разе, функцыя застаецца за словам "рэспубліка"?

Для Беларусі XX стагодзьдзе — гэта век рэспубліканскай традыцыі. У палітычным сэнсе сам знак Беларусь атаясамляецца з Рэспублікай — абвешчанай у 1918 годзе, акупаванай у тым жа годзе, новай Рэспублікай, створанай у 1991 годзе. Ранейшая гісторыя нашай краіны зьвязана зь іншым знакам — Літва, і іншай юрыдычнаю традыцыяй — афіцыйна манархічнай. Бо Статуты замацоўвалі ў Вялікім Княстве манархічны лад. Нават парлямэнтарызм Рэчы Паспалітае й рэспубліканскія памкненьні шляхты ня здолелі зьнішчыць гэтую юрыдычную норму. У канцы XVIII ст. манархічныя тэндэнцыі ў Рэчы Паспалітай нават узмацніліся, і Канстытуцыя 3 траўня 1791 году абвясьціла спадчыннасьць трону ўзамен ранейшаму абраньню караля.

Такім чынам, Першая рэспубліка ў Беларусі — гэта БНР. Другая рэспубліка праіснавала ад 25 жніўня 1991 году, калі "Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі" быў нададзены статус канстытуцыйнага закону, да 15 сакавіка 1994 году — дня прыняцьця Канстытуцыі, якая абвесьціла Беларусь прэзыдэнцкай рэспублікай. З прыняцьцем Канстытуцыі распачалася гісторыя Трэцяй рэспублікі, якая канчаткова пала ў выніку дзяржаўнага перавароту 24 лістапада 1996 году.

Надалей тэрмін "рэспубліка" адносна Беларусі пераўтвараецца ў эўфэмізм і зьяўляецца хутчэй сынонімам тэрміну "краіна". Бо ліквідацыя прадстаўнічай улады й незалежнага суда, наданьне галаве дзяржавы неабмежаваных паўнамоцтваў часова прыпыняе ў Беларусі функцыянаваньне рэжыму рэспубліканскай улады. Сёньня Беларусь — не рэспубліка! Узнаўленьне рэспублікі ў Беларусі будзе азначаць усталяваньне рэжыму Чацьвертай рэспублікі.

Чацьвертая рэспубліка ня будзе паўторам Трэцяй рэспублікі — ні юрыдычна, ні псыхалягічна. Гэта дыктуецца як самою спэцыфікай пераходу ад дыктатуры да Рэспублікі, так і недасканаласьцю прававой базы Трэцяй рэспублікі, дзе быў закладзены мэханізм самаразбурэньня. Вяртаньне Канстытуцыі 1994 году зьяўлецца неабходным для легітымацыі пераходнага пэрыяду ды падрыхтоўкі новай Канстытуцыі й абраньня новых органаў дзяржаўнага кіраваньня.

Усталяваньне дэмакратычнай формы кіраваньня, адраджэньне Рэспублікі афармляецца ў сучаснай Беларусі ў лёзунг Чацьвертай рэспублікі.

Алег Дзярновіч

Выбранае з гісторыі

Церкви и приходы Минска (история и современность). — Менск, 1996.

На выспах Карыбскага мора, у былых францускіх калёніях існуе мова патуа, якая склалася са старафранцускіх дыялектаў паўночнае Францыі з дамешкам архаічнае лексыкі народаў Заходняе Афрыкі. Многія словы патуа ўжо ня йснуюць ні ў Эўропе, ні ў Афрыцы. Паводле старажытнай традыцыі, мове і звычаям у карыбскіх нэграў навучаюць бабулі, якіх, у сваю чаргу, вучылі іхныя бабкі, пакуль бацькі ад сьвітанку да ночы ўраблялі плянтацыі, часам ня бачачы сваіх дзяцей тыднямі. Таму ўнукі тут памятаюць і адчуваюць менавіта так, як адчувалі людзі за пакаленьне да іх. Так выжыла мова патуа й сярэднявечная духоўная культура Трапічнае Афрыкі на Карыбах.

Што мусілі прышчапіць нам нашыя бабкі, каб мы гадаваліся на іхных руках, а не ў ясьлях, дзіцячых садках, "прадлёнках" і ў "акцябрацкіх" зьвеньнях, у кароткія выходныя назіраючы, як бацькі ўвіхаюцца ў хатніх клопатах? Яны б распавялі нам сваё жыцьцё і яно стала б нашым жыцьцём, яны гаварылі б з намі сваёй моваю і яна стала бы нашаю мовай. Нам не давялося б пазьней абіраць сабе веру, шукаць словаў Сакрамэнту, сумнявацца ў сьвятасьці... Гісторыя ўяўлялася б нам непарыўнаю чарадою...

... Уладыка Мэльхісэдэк ў 1922 годзе ачоліў Праваслаўе ў Беларусі і ў 1927-м абвясьціў Аўтакефалію. Ягонае слова і ягоны дух сягалі так высока, што нават бальшавікі доўга не наважваліся яго зачапіць. Але ў тым жа 1927 годзе Мэльхісэдэк быў высланы, на беларускіх сьвятароў былі абрынутыя рэпрэсіі.

Калі глядзіш на здымак мітрапаліта Мэльхісэдэка (Паеўскага), ня можаш ня думаць пра тое, што гэты чалавек быў варты свайго вялікага імя. Ён нават зьнешне падобны на героя Старога Запавету. Чалавек, які ўзяў на сябе адказнасьць... Дзякуючы дзейнасьці Мэльхісэдэка, беларускае Праваслаўе, нават не дамогшыся поўнае Аўтакефаліі, да 1934 году заставалася асобным ад Масквы (у 1924-34 дзейнічала Аб'яднаньне беларускіх япархіяў абнаўленчае царквы — Беларуская Аўтаномная Праваслаўная Царква). Пасьля 1934 году амаль усе сьвятары, беларусы паводле паходжаньня, былі вынішчаныя, а на іх месца прыбыў "дэсант" з Масквы і Беларуская Праваслаўная Царква была гвалтоўна наноў падпарадкаваная Маскоўскаму Патрыярхату.

На жаль, у кнізе "Церкви и приходы Минска" гэтых фактаў няма, хоць гісторыя царквы выкладаецца падрабязна. Кніга разьлічаная на тое пакаленьне, якое ня мае гістарычнае памяці, і аўтар бярэцца за прэпарацыю гісторыі, вымаючы зь яе кавалкі.

Аўтар гістарычнага нарыса Г.Шэйкін нагадвае, што ў 1941 годзе ў Менск пачалі прыбываць беларускія сьвятары менавіта з Заходу краіны, але ня згадвае пра другое абвяшчэньне Аўтакефаліі заступнікам Мэльхісэдэка мітрапалітам Панцеляймонам (Ражноўскім) пасьля скліканьня Сыноду ў 1941 годзе і пра падпарадкаваньне БАПЦ у 1943-м Беларускай Цэнтральнай Радзе. Выбарачная памяць, выбраная гісторыя...

Калі аўтар апісвае пэрыяд нямецкае акупацыі, ён ледзь стрымліваецца ад словаў удзячнасьці: "... Адраджэньне царкоўнага жыцьця ў горадзе прыпадае на 1941-44 г., калі ён быў акупаваны нямецкім войскам", "... Акупацыя цягнулася 1100 дзён. За гэты час у горадзе былі адчыненыя ўсе праваслаўныя бажніцы, якія захаваліся пасьля пагрому 20-30-х гадоў". Сапраўды, праваслаўная царква ў Беларусі ў гэты час акрыяла. Але прычынаю таму было ня толькі касаваньне сталіншчыны, але й выгнаньне маскоўскае адміністрацыі. Паўстала нарэшце Беларуская царква і ў ёй загучала роднае слова. Праваслаўе ў Беларусі ў 1941-44 г. паводле духу і арыентацыяў радыкальна разышлося з Маскоўскім Патрыярхатам. Можна падзівіцца і таму, што аўтар ніяк не згадаў рэпрэсіяў з боку гітлераўцаў у дачыненьні да насельніцтва і сьвятарства, не сказана і пра ўдзел сьвятароў у супраціве новым акупантам.

А падрабязна пішучы пра татальныя паваенныя рэпрэсіі, аўтар ня згвае пра тое, што нашых сьвятароў, якія не пасьпелі ў эміграцыю, зьнішчалі не за праваслаўнасьць, а за беларускасьць. Не прыгадалася аўтару, адкуль пазьней былі завезеныя ў Менск новыя сьвятары: архіяпіскап Васіль (Ратміраў), мітрапаліт Піцірым (Сьвірыдаў) і гэтак далей — да Філярэта (Вахрамеева). А вось — проста інсынуацыя: "... Менск стаў катэдральным цэнтрам новага для Беларусі царкоўнага ўтварэньня на чале з Патрыяршым Экзархам (намесьнікам). Другім афіцыйным найменьнем Беларускага Экзархату зьяўляецца "Беларуская Праваслаўная Царква". Дазволю сабе нагадаць аўтару і чытачам, што сёньня афіцыйны назоў праваслаўнае царквы ў Беларусі — "Беларускі Экзархат Маскоўскага Патрыярхату Расейскае Праваслаўнае Царквы".

Ці варта паглыбляцца ў аналіз выкладзенае ў кнізе старасьвецкае гісторыі, калі на тытуле кнігі выяўлены герб Менску з маленькаю датай "1793" — датай акупацыі гораду Расейскай імпэрыяй, пасьля чаго была заснаваная і менская эпархія?.. Што да канцэпцыі гісторыі праваслаўя, то яна просьценькая, як і сто гадоў таму: першыя бажніцы былі праваслаўныя, іх захапілі ўніяты, акаталічылі, апаплячылі расейскі люд, прыйшло вызваленьне ў 1793 годзе і ўсё вярнулася на сваё законнае месца і так будзе надалей.

Калі заходняя і ўсходняя цэрквы ўпершыню разышліся ў 1054 годзе, адкуль у аўтара перакананасьць, што першая менская бажніца была праваслаўнай?

Навуковасьць "рэканструкцыі" першае менскае царквы Лаўровым наогул не падлягае крытыцы, па-першае, таму, што царква не была пабудаваная. Падобнымі "рэканструкцыямі" насычаны і сам тэкст: "паводле паданьня", "паводле некаторых зьвестках", "як вядома". Да прыкладу: "Як сьведчыць паданьне, манастырская царква Спаса-Ўвасабленьня (Сьвята-Петра-Паўлаўскага жаночага манастыра. — С.Х.), якая знаходзілася на месцы сучаснага будынка АТ "Белпрампраект" пры лесьвічным сходзе ад пляцу Свабоды да Нямігі, у XVIII ст. была аддадзеная за пазыкі жыдам, якія ўтварылі на гэтым месцы сынагогу"...

Па-першае, на тым месцы, якое вызначыў аўтар (былая вуліца Школьная), сапраўды існавала сынагога зь яшываю (школай, ад якой і атрымала назву вуліца з XVII ст.), самая старая ў Менску, напрыканцы XVI ст. яе драўляны будынак замянілі на мураваны, абсталяваўшы пры ёй рытуальны басэйн для амавеньняў, падчас апошняе вайны яна была зруйнаваная. Па-другое, Сьвята-Петра-Паўлаўскі манастыр сапраўды прадаў жыдам будынак на Нямізе (унікальны помнік готыкі), які атрымаў народную назву "халодная сынагога", хоць ніякае сынагогі ў ім не было. Дзе дакладна месьціўся праваслаўны ЖАНОЧЫ Сьвята-Петра-Паўлаўскі манастыр, невядома (ці існаваў ён наогул?).

Альбо: "Будаўнікі кляштару бэрнардынак узьнесьлі яго менавіта на тым месцы, дзе да пачатку XVII ст. існаваў праваслаўны манастыр..." У гэтым выпадку сэнс "гістарычнае" даведкі зразумелы — трэба абгрунтаваць, чаму галоўны праваслаўны сабор Беларусі месьціцца ў касьцёле, які да таго 227 гадоў належаў бэрнардынкам, пакуль расейцы іх ня выгналі... Цяпер гэты помнік нібыта трапляе ў сьпіс гістарычных дзейных цэркваў, які быў папоўнены за кошт Крыжовае царквы ў Эпархіі, якая была заснаваная ў 1985 годзе. Такім чынам гістарычнымі ў Менску аўтары налічылі пяць цэркваў...

Не патрапілі ў кнігу зьвесткі пра старажытную Пятніцкую царкву, зямлю якое набыў у 1614 годзе мула Сулейман, і з таго часу Пятніцкі канец стаў звацца Татарскім, а царкву урэшце разабралі. Пра тое, што Кацярына падаравала царкве Пятра і Паўла некалькі сукняў са свайго гардэробу, паставіўшы на чале менскае эпархіі аднаго з Пацёмкіных, былых ужо не ў фаворы, на зьдзек у горадзе, дзе жыла пара дзясяткаў праваслаўных сем'яў. Пра тое, што гэтай жа царкве Павал І ахвяраваў пару падсьвечнікаў і грошы...

У астатніх разьдзелах кнігі разьмешчана шмат карыснае інфармацыі для тых, каго цікавіць далейшы лёс праваслаўнае царквы. Упершыню чытач можа пазнаёміцца з плянамі пашырэньня сеткі прыходаў і праектамі будучых цэркваў. З гэтага разьдзелу вынікае, што Расейская Праваслаўная Царква не зьбіраецца надалей трываць сёньняшняга стану, калі ў Менску колькасьць яе прыходаў роўная колькасьці каталіцкіх (рыма-каталіцкіх парафіяў — 4, беларуска-каталіцкіх — 2) і шматкроць меншая за колькасьць пратэстанцкіх. Паводле праграмы пэрспэктыўнага разьвіцьця, у Менску колькасьць праваслаўных прыходаў мусіць быць даведзеная да 16, плянуецца пабудаваць яшчэ 10 бажніцаў, школы, дамы міласэрнасьці. Сетка прыходаў павінна больш-менш раўнастайна ахапіць увесь Менск ад Паўднёвага Захаду да Чыжоўкі.

Праекты, здымкі якіх зьмешчаныя ў кнізе, выклікаюць пытаньні. Хто аўтар гэтых праектаў? Альбо: чаму ў мікрараёне Серабранка Сьвята-Андрэеўская царква будзе мець выгляд узору пскоўка-ноўгарадзкага дойлідства XII-XIII ст.?

Тое, што бажніцы традыцыйнае канфэсіі лягічна будуць мець традыцыяналісцкі выгляд, не зьдзіўляе. Зьдзіўляе шырокае поле кампіляцыяў зь небеларускіх традыцыяў (гэта тычыцца ня толькі Менску): ад чарнігаўскае школы XI-XII ст. да ўладзімера-суздальскае XVI-XVII ст. Часам аўтары праектаў выяўляюць няведаньне асноўных прынцыпаў формаўтварэньня старажытнае архітэктуры, напрыклад, у праекце Сьвята-Георгіеўскае бажніцы на вуліцы Галадзеда, дзе крыніцы натуральнага сьвятла разьмешчаныя ня ў сьценах, а ў прасьценках і па кутах, парушаючы лёгіку архітэктонікі. Слабое ўяўленьне праектантамі пра чужыя традыцыі, ігнараваньне ўласных, пагражае пераўтварыць будаўнічую праграму Маскоўскага Патрыярхату ў Менску ў экстэнсіўную прапаганду кепскага густу, якая па інэрцыі будзе падхопленая па ўсёй краіне.

Ня маючы трывалае гістарычнае памяці, ня маючы моўнае і рэлігійнае еднасьці, беларусы ў чарговы раз становяцца аб'ектам беспрэцэдэнтнае культурнае экспансіі. Фактычна дзеля гэтага і выдадзеная кніга "Церкви и приходы..." — высокага паліграфічнага ўзроўню, добра ілюстраваная, з падрабязным даведачным апаратам.

Сяргей Харэўскі

Дзеці неўтаймаванай гардыні

Ці гордыя людзі беларусы? Калі вы сёньня запытаецеся пра гэта ў саміх беларусаў, наўрад ці хто вам адкажа станоўча. Ну як жа, вядома, — рахманыя, памяркоўныя, талерантныя, нехлямяжыя. Набор традыцыйны. І самому беларусу, і небеларусам, якія гадаваліся на прасторы былога Саюзу, звыкла было чуць пра тое, што гордымі могуць быць толькі дзеці Каўказу, таксама як вялікай можа быць толькі Расея.

Стэрэатып засеў стрэмкаю ў мазгах. Але ж калі годнасьць нацыі не выяўляецца нармальным чынам, то яна, яе энэргія, трансфармуецца і выходзіць іншым бокам. Бо "няма такога, каб нешта зьнікала. Калі нешта недзе адымецца, то значыць абавязкова недзе прыбавіцца" (Казьма Пруткоў).

Так і з годнасьцю беларусаў. Калі гэта дачыненьні зь людзьмі іншых нацыянальнасьцяў, беларусы звычайна займаюць другую ролю, так ім прасьцей і спакайней. Спакой сканчаецца, калі іншаземцаў няма і паўстае праблема лідэрства сярод уласна беларусаў, у іх асяродку. Вось тут скалечаная нацыянальная гордасьць праяўляецца з такім размахам, што проста дзіва. Гордасьць перарастае ў гардыню з усімі нэгатыўнымі наступствамі. Ці то на ўзроўні звычайнага калхозу, ці на ўзроўні нацыянальным, сярод тых, хто прымае рашэньні, якія вызначаюць лёс нацыі.

Такую трансфармацыю заціснутай гордасьці ў гардыню кожны, калі задумаецца, знойдзе ў сабе самім. Калі цяжка, калі нехта нядобры наверсе, то беларусы больш-менш трымаюцца разам, як нядобрага няма — больш разьяднаных за беларусаў знайсьці цяжка.

Што тычыцца палітыкі пэрыяду незалежнасьці, то яна наскрозь працятая гардыняй яе айчынных суб'ектаў. Спачатку Пазьняк не лічыў за дэмакрата Шушкевіча, потым Кебіч ня здолеў дамовіцца з Шушкевічам, пасьля людзі Шушкевіча ставілі ножкі Карпенку, урэшце прыйшоў Лукашэнка і сказаў, што ён, вядома, беларус, але канечна і расіянін, пааму што радзіўся на самай мяжы з Расеяй...

Вялікі грэх беларусаў — гардыня — ізноў заняў сваё месца ў іхным жыцьці. Беларусы — народ ня горды. Гэты народ — супэрганарлівы.

Алег Дашкевіч

Тацяна Ждановіч

Рэха забытага Гораду

Нічога ня здарылася. Проста прыйшоў ліст. Ад Марыны Віктараўны. З Расеі. Праз год.

Тады мы разам зьяжджалі з Горада на аўтобусе, які ня значыўся ў раскладах. Раскладаў там больш не было. Сьвяціла сонца. Зіма ўпівалася моцным марозам. Кіроўца моўчкі корпаўся ў маторы, правяраючы нешта ў жалезе. Я круціла ў руках дробную жалезіну, знойдзеную побач, у каменьні. Жалезінка потым стане сувэнірам.

Ад'яжджаць не хацелася... І тут у аўтобус увайшла яна. Села побач, уладкавала рэчы. Ніхто тады ня ведаў, што мы прагаворым чатыры гадзіны шляху. Што гэткай жа, толькі хмурнай і слотнай, млявай, бязвольнай, ужо нашай, менскай раніцай да яе напішацца ліст, на які я перастану чакаць адказу. Але ён прыйшоў...

Ліст прыйшоў ужо ў іншую краіну, а калі раптам будзе яшчэ адзін, краіна будзе зноў ня тою. Расея і Беларусь тады, ССР цяпер. ССР і Чачэнія. У якую яшчэ тады на мяжы з Расеяй спрабавалі запатрабаваць візы. Тыя, хто абараняў "цэласнасьць".

Марына Віктараўна нічога не абараняла. І ні за што не змагалася. Яна не магла зразумець, чаму Горад трэба пакінуць. Тут была яе радзіма. Нават да нацыянальнага багацьця якой яе сям'я мела дачыненьне. З той прычыны, што бацькі і дзядзька зь цёткай калісьці распрацоўвалі праекты нафтавых скважын.

Адзін з братоў бацькі Марыны Віктараўны, той, што стаяў ля вытокаў чачэнскае шафты, пазьней быў рэпрэсаваны Сталіным. Асуджаны на сьмерць. Таму для іхняй сям'і магчымае вяртаньне ў "савецкі рай" — успамін ня толькі пра "стабільнасьць".

— Ну і як вам у нас? — спытала яна тады, даведаўшыся, адкуль я.

— Нармальна, — пачала я.

— Нармальна?! Гэта — нармальна?!

У Марыны Віктараўны не было адрасу, акрамя "паштамт, да запатрабаваньня". Быў, праўда, дом другога яе дзядзькі, нерэпрэсаванага — тады ў доме рухнула толькі адна сьцяна.

Зараз ліст распавядае пра "ўсе колы чачэнскага пекла": сакавіцкія падзеі 96-га, жнівеньскія... "Нас з Васілём Аляксандравічам ледзь не забіла мінай, што разарвалася крыху вышэй кухоннага вакна. Мы былі ў кухні і цудам выйшлі зь яе за паўхвіліны да выбуху... Гэта было 14 сакавіка, а падзеі доўжыліся з 6-га да 16-га ўключна". Потым, у час зацішша, яны "лячылі жытло", аднаўлялі згарэлыя дакумэнты і працавалі. Яна — на нафтавым прадпрыемстве, яе дзядзька — ў школе. Мне хочацца трапіць на ўрок гісторыі да Васіля Аляксандравіча і паслухаць, пра што пытаюцца ў яго, вайсковага пэнсіянэра, філёляга і гісторыка, грозьненскія дзеці. Што ён гаворыць ім пасьля ўсяго пражытага, засвоенага за савецкім часам, і пражытага ў час незалежнай вялікай Расеі. Што для яго маленькая Чачэнія?

"... Нас захліснула трэцяя ударная хваляй (трэцяе кола пекла) — падзеі з 6-га да 23-га жніўня. Сваёй сілай і дынамікай яны нагадвалі студзень 95-га..." Горад быў фактычна здадзены "баевікам". Ужо ў канцы ліста яна згадае, што тады ў Грозным загінуў брат яе зяця, але штамп "баевікі" для яе — напэўна, проста міжвольнае адчуваньне сытуацыі, калі ні на адным баку няма "сваіх". Хто б ні страляў, усе кулі трапляюць у роднае, і нават сьцены тут здаюцца жывымі. Як казалі старыя бабулькі ў Чачэніі, расейкі, казачкі: "Не дачакаюцца! Ня зьеду адсюль". Хто не дачакаецца? А ўсе, найперш гэтая расейская авіяцыя, а потым усе астатнія. Бо тут магілы бацькоў, сяброўкі — гэткія ж старыя чачэнкі, тут мы і памрэм разам — дай Бог, каб сваёй сьмерцю. Так казалі бабулькі, а вочы іх блішчэлі ўпартасьцю, а душа прасіла слухача. "Нікуды я не паеду ад нашых чачэнаў — за ўсё жыцьцё ніводнай зь імі спрэчкі не было..."

Чытаючы вершы Васіля Аляксандравіча, гэтага чалавека, старога, гатовага на ўсё дзеля сканчэньня вайны (некаторыя вершы прысьвечаныя забітым таварышам — па падвалах, а не акопах), я ўспамінаю вочы маскоўскіх вайсковых чыноўнікаў. Адзін з гэтых генэралаў казаў, што быў супраць баявых дзеяньняў у Чачэніі, другі маляваў мне страшэнныя карціны — і абодва не зрабілі нічога, каб хаця б паспрабаваць спыніць... Адзін сёньня ў сумесным расейска-беларускім урадзе: дапамагае фактычна пашыраць межы імпэрыі. Другі шкадуе, што "нашы ў Аўганістане дзейнічалі ня так" і ставіць у прыклад Тамэрлана. Заваяваўшы Аўганістан у старажытнасьці, той "спачатку стаў сябрам насельніцтву": караў сьмерцю тых са сваёй каманды, хто насельніцтва крыўдзіў, прычым "невзирая на лица". А потым, папоўніўшы свае войска мясцовымі атрадамі, рушыў далей...

Такая згадка расейскага генэрала невыпадковая. Надта ўжо шмат у распрацаваных ім тэорыях расейскай бясьпекі адведзена Беларусі. Надта падрабязна расьпісаная стратэгія "інфармацыйнай вайны" і тактыка заваёваў без баявых дзеяньняў. Ім ненавісная ўсялякая незалежнасьць, мроіцца паўзабыты ГУЛАГ, яны плююць нават на ўласны народ. Але: "Чачэнія — палітычная і стратэгічная памылка".

А Беларусь — "палітычны і стратэгічны посьпех"?

Марына Віктараўна, што вымушаная сёньня жыць у 60 кілямэтрах ад Будзёнаўска, напэўна, ня будзе галасаваць за Шаміля Басаева. Я ня ведаю, за каго яна будзе галасаваць. Але многім расейцам там часам сорамна за прыналежнасьць да гэтай нацыі. Яна казала: "Мы — напалову татары, па веры — былыя савецкія людзі, а радзіма ў нас чачэнская". І ўздыхнула. І добра, што ў яе ёсьць паняцьце "радзіма". Бо для многіх іншых радзіма — Савецкі Саюз, а першае пытаньне для гасьцей: "Вы за каго?" Так сустрэлі мяне на ганку ў Крыме. "За Беларусь — значыць, ня любіце маскалёў?" Не разумею. Не люблю людзей, у якіх няма за душой радзімы, бо менавіта яны першыя кідаюцца помсьціць — за гэтую адсутнасьць. Часта — чужымі рукамі і падманам.

"... 10 жніўня пры выкананьні службовых абавязкаў загінуў родны брат майго зяця — радавы Вячаслаў Халадзінаў 1973 году нараджэньня. Пасьля сканчэньня Іванаўскага політэхнічнага інстытуту, дзе не было вайсковай катэдры, ён быў прызваны ў армію. 30 чалавекам прапанавалі служыць у Валгаградзе, а апынуліся яны ў Чачэніі, у Шалях. У жніўні іх кінулі ў Грозны... Ён быў сумленным і шчырым. Ваяваць у Чачэніі, дзе ішла несумленная вайна — ён не хацеў!"

Сям'я ня можа паверыць, што хлопца няма ў жывых, а "цынк" не ўскрывалі, бо пахаваньне адбывалася толькі праз месяц. У Казахстане, дзе Вячаслаў нарадзіўся і вырас...

Адзін кінарэжысэр з жахам сьцьвярджаў, што на ўласныя вочы бачыў у Маскве архіўныя здымкі з Чачэніі з сапраўднымі "заградатрадамі" накшталт савецкіх у гады вайны. А ў жніўні ля блёк-паста насупраць узарванага Палаца Прэзыдэнта ў Грозным стаяў абгарэлы танк, зь якога тырчэла... рука забітага расейскага салдата. Яна была прыкаваная ланцугом. Праз дзень руку і ланцуг прыбралі, каб не прыцягвалі ўвагу замежных карэспандэнтаў.

"... 14 жніўня кватэра Васіля Аляксандравіча была бітая трэці раз з трэцяга боку. Вялізныя разбурэньні гораду балюча і горка бачыць. Цярпелі ўсе: і рускамоўныя, і тутэйшае насельніцтва. Зноў дзяліліся і кавалкам хлеба, і душэўнай цеплынёй".

І раптам — з клічнікамі, размашыстым почыркам: "Няма кепскіх нацыяў! Ня трэба іх нацкоўваць адна на адну!"

Няма, Марына Віктараўна. І ня трэба. Але тыя расейскія генэралы, што аб'ядноўваюць нас з вамі ў краіну са сталіцай "Масква" — родам зь Беларусі. Яны беларусы — па пашпарце, а па духу — ніхто... Ім хочацца, каб такімі былі ўсе. Трыццаць дзён у падвале, трыццаць гадоў за "жалезнай сьцяной". Розьніца вялікая, але ўсё менш істотная. Як сказаў адзін з генэралаў: "Чачэнія — папярэджаньне нам усім".

Выгнаньнікі Горада вераць, што вернуцца туды. Назаўсёды.

Менск.

Ганна Матусэвіч

Рагнеда

Мы з мужам ехалі ў дальнюю дарогу на лыжах, хоць маглі зайцамі ехаць у электрычцы. Але апошняе стала ўжо нуднай справай. Захацелася нечага новенькага. Уласна кажучы, "новенькае" было нават не забытым старым, ды проста сёньняшнім днём, скіраваным у будучыню.

Мы пачыналі дарогу. Сонца радасна сьляпіла нашыя вочы. Ды хутка я намуляла нагу й паўзла на лыжах без асаблівага энтузіязму, але ж трэ было падтрымліваць мужа.

Ён захацеў скараціць шлях і паехаць агародамі. Выйшла наадварот далей. Я не стрымалася і абазвала сябе дурніцай за тое, што пакарысталася чужым розумам. Бо надта стамілася амаль дзьве гадзіны брысьці дзе па цальнягу, дзе па раскоўзанай машынамі дарозе. А ўперадзе – раптоўны спуск і яшчэ болей стромкі пад'ём. Можна й пазьбегнуць такой ліхой долі. Направа ляжыць хоць і расьсьлізганая, ды ўсё ж роўная дарога. Муж прыпыніўся ў роздуме. Затое я была як заведзеная толькі на адну праграму марыянэтка. Ня бачачы іншай магчымасьці, я наўпрост паляцела з гары. Муж вымушаны быў зрабіць тое самае. Цальнёг, далей стромкая горная скала. Муж гукаў мне, каб ішла далей па сьнегавой раўніне. Я не хацела болей жыць чужым розумам і, скінуўшы лыжы, стала няўзброенымі нагамі заваёўваць горную вяршыню. Я ўскараскалася на самую гару і адтуль ужо ўбачыла рацыю мужа. У некалькіх мэтрах далей ад маёй вяршыні ляжаў спадзісты цальнёг. Мужу зь ягоным высокім ростам была відаць гэтая пакатасьць, а мне з маёй самаўпэўненай нізкаросласьцю – не разгледзець. Я зноў абазвала сябе дурніцай, на гэты раз – шчасьлівай дурніцай. Бо мы ўжо фінішавалі, і я ня помніла пра намуленую нагу.

Я адагрэлася на цёплай печы, і мы зноў рушылі ў двухгадзінны пераход. Па пракладзенай сьцежцы ісьці намнога весялей. Ды яшчэ калі табе пакідаюць прэзэнты на сьнезе: то сэрца са стралой, то Ганку-каханку... Але галоўны прэзэнт за авантурную вандроўку нас чакаў у вясковай краме, дзе мы прыдбалі таннай мукі. Муж зайшоў у памяшканьне, а я вартавала ад свавольных дзяцей нашыя лыжы ды пляцакі. Каб ня ўстыць ад сьцюжы, я стала прыдумваць імя нашай будучай дачушцы. І вырашыла, што назаву яе Рагнедай. Бо зь яе пачнецца рэальнае адраджэньне нашай нацыі.

Мы скончылі дарогу. Зусім маладзенькі маладзік гарэзьліва хаваўся за нашымі сьпінамі.

Койданава

Лявон Юрэвіч

Маска

Падарожжа займае хвілін дваццаць ад аўтобуснай станцыі ў Нью-Ёрку — мінуўшы мястэчка зь літоўскай назвай Сікаўкус, даехаць да гарадка Рутэрфорд, што ў суседнім штаце Нью-Джэрсі. Звычайна я еду сюды па справах: тут знаходзіцца часовая сядзіба Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва. Але сёньня мяне цікавяць два дні ў чэрвені 1958 году, 28 і 29, калі ў гэтым гарадку ў хаце свайго сябра, лекара і паэта Ўільяма Ўільямса бавіў свае апошнія гадзіны на амэрыканскай зямлі Эзра Паўнд. (Цікава, што і першыя пераклады Паўнда на беларускую мову зьявіліся ў "Запісах" БІНіМ).

У ЗША багата месцаў, зьвязаных зь ягоным імем. Да прыкладу, вашынгтонская вар'ятня Сьв. Элізабэт. Калі паэта-выгнанца гвалтам прывезьлі дадому ўвосені 1945-га, калі паваенны сьвет назіраў за судом над ім, абвінавачаным у здрадзе, у падтрымцы рэжыму Мусаліні праз радыёперадачы з Італіі, калі адвакаты здолелі давесьці суду мэнтальную непаўнавартаснасьць і тым самым выратавалі падсуднага — Сьв. Элізабэт дала яму прытулак на 13 гадоў. І вось, адпушчаны ў траўні 1958, Паўнд спыніўся ў Рутэрфордзе, каб зьехаць у Італію і назаўсёды пакінуць сваю бацькаўшчыну.

У дарогу я ўзяў самую лёгкую для ўспрыняцьця ягоную кнігу —"Абэцэду чытаньня". Яе можна разгарнуць на любым месцы: "Нацыя, якая ня дбае пра разуменьне сваіх мастакоў, зьнікае. Яна перастае рухацца і адно спрабуе выжыць". Або: "Няма сэнсу казаць пра нешта людзям, што ня могуць пабачыць гэта без папярэдняе падказкі". Ці такое: "Перад тым, як вырашыць, чалавек проста дурань ці добры мастак, няблага ня толькі зазначыць "ён уражвае сваёй арыгінальнасьцю", але і спытаць: "ці бачыць ён нешта, чаго мы ня бачым?""

Пазіраю ў зацемненае акно аўтобуса і спрабую ўявіць, як Эзра глядзеў праз краты акенца Сьв. Элізабэт і крычаў: "Вось дзе здраднікі!" Тое было крыкам не чужынца, не экс-патрыёта, што здабыў сабе права і ролю крытыка, а шчырага амэрыканца.

Аўтобус спыняецца, мне сыходзіць. Гарадок Рутэрфорд клясычны для Амэрыкі: адсутнасьць гарадзкога транспарту, лічаныя адзінкі пешаходаў на вуліцах; паўсюль тыя самыя шыльды, што і ў Нью-Ёрку — амэрыканец нідзе не пачуе сябе ня дома. Куды б ты ні прыехаў, ты паўсюль знойдзеш "МакДональдс" з родным гамбургерам, тыя самыя супэрмаркеты і кнігарні. Праўда, ёсьць у ім мілая правінцыйнасьць, нясьпешнасьць, калі здаецца — яшчэ крыху, і ты пачуеш галасы птушак.

Дзівіць, што тут няма бараў — зусім! У горадзе валадараць, здаецца, лютаране, нашчадкі квакераў, на сваіх сьвятах самі ня п'юць і іншым навокал не дазваляюць. Суворасьць трымаюць і ў астатнім. Жарты сказаць: гэбраі ці ня дзесяць гадоў дамагаліся адкрыцьця сынагогі, што для Штатаў проста ўнікальны выпадак! Пра астатніх — праваслаўных там ці што іншае — я й не кажу нават. Але краму з напоямі адшукаць усё ж можна.

Вось чаго я не знайшоў, дык гэта мэты свайго падарожжа. Ніхто ня ведае ані паэта Ўільямса, ані ягонага дому. Зрэшты, ня так істотна. Я спрабую ўявіць апошні дзень Эзры ў гэтым горадзе. Наўрад ці ён носіць улюбёны чорны капялюш з шырачэзнымі палямі, аксамітную марынарку, даўгі хвалепадобны шалік пасьля таго, як тыя сталіся доказам абвінавачаньня ў судзе. Мабыць, да яго нехта прыйшоў. Эзра гаворыць, і ягоны ўладны голас прымушае ўсіх слухаць, гаворыць па звычцы кароткімі, насычанымі сказамі. Ён пытае, спрачаецца, пасьмейваецца, нават рагоча. Пра сябе бадай што не гаворыць, больш узгадвае бацькоў. Яны жылі ў Італіі, і Эзра ня мог іх пакінуць у самоце падчас вайны, ня гледзячы на загад з Вашынгтону. А калі тыя памерлі, было ўжо запозна вяртацца ў ЗША.

Каб самому не спазьніцца, сьпяшаюся на аўтобусны прыпынак.

Бацька імагізму, абвешчанага яшчэ ў 1912 годзе, Паўнд верыў у абсалютную свабоду ў выбары тэмаў для паэзіі. Суд з гэтым не пагадзіўся.

Паўнд заклікаў да выкарыстаньня гутарковай мовы, але да слова — дакладнага, ня прыкладнага, адзінага слова. Суд інтэрпрэтаваў ягоныя словы.

Эзра Паўнд казаў, што паэзія мусіць быць яснай, зразумелай, але ў формах верша хаваўся за ўяўныя пераклады з кітайскай мовы, антычнасьці, імітаваў сярэднявечча, дэкаданс; ад яго пачалася мода на танку і хоку. Суд не захацеў разьбірацца.

Усю дарогу дахаты я толькі дзівіўся, што недзе ў тыя самыя часы ў невядомай паэту Беларусі Язэп Пушча напісаў:

Усе, усе мы носім маскі,
Нат скінуць дома баімося.
Да сьлёз сьмяемся ў вечар майскі,
Да сьлёз сьпяваема ўвосень.

Нью-Ёрк.

А ПОТЫМ БЫЎ ЖНІВЕНЬ 1968 ГОДУ...

Анатоль Сідарэвіч — пра карную псыхіятрыю ў БССР

1967 — за крытыку Леніна і ленінізму звольнены з працы ў Ганцавіцкай раённай газэце журналіст і гісторык Анатоль Сідарэвіч.

1968 — пратэсты супраць савецкай акупацыі Чэхаславаччыны (пісьменьнік Фёдар Яфімаў, гісторык Анатоль Сідарэвіч)...

восень 1968 — пасьля допытаў супрацоўнікамі КГБ А.Сідарэвіч абвінавачваецца ў нацыяналізьме, антысаветызьме і "падтрымцы контрарэвалюцыі ў замежных краінах" (за пратэст супраць акупацыі Чэхаславаччыны) і заключаецца на чатыры месяцы ў псыханэўралягічнае аддзяленьне 2-й клінічнай лякарні ў Менску.

(з Кронікі дэмакратычнай апазыцыі і палітычных рэпрэсіяў у Беларусі)

Анатоль Сідарэвіч (н. 1948), публіцыст і гісторык; адзін з заснавальнікаў адноўленае Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. А.Сідарэвіч — адзін з тых людзей, якія непасрэдна з-за свайго вальнадумства патрапілі пад рэпрэсіі з боку таталітарнае сыстэмы. У інтэрвію, якое сп. Анатоль даў Грамадзкаму Архіву Найноўшае Гісторыі, ён вельмі сьціпла акрэсьліў уласны шлях, затое даў досыць выразнае ўяўленьне пра функцыянаваньне мэханізму запалохваньня й рэпрэсіяў.

Яшчэ адна тэма, якую ў сваім інтэрвію закрануў сп. Анатоль, — гэта дыскусія ў 60-70-я гады ўнутры апазыцыйнага беларускага грамадзтва паміж "культурнікамі" і "палітыкамі". Гэтая дыскусія найчасьцей адбывалася ў прыхаванай форме й толькі сёньня мы пачынаем гістарыяграфічна яе фіксаваць. Значнасьць гэтае дыскусіі не асэнсаваная яшчэ наогул, хоць вылучаныя ўжо некалькі радыкальных гіпотэзаў, адна зь якіх тлумачыць палітычныя праблемы сёньняшняга дня ўхіленьнем "культурнікаў" ад праваабарончай дзейнасьці. Як такая традыцыя праваабароны ў нацыянальным асяродзьдзі па-просту не паўстала. Можа быць, адзін з шляхоў вырашэньня гэтае дылемы — прызнаньне наяўнасьці ў нацыі асобнага цела культурнага й асобнага цела палітычнага.

У любым выпадку, праз інтэрвію Анатоля Сідарэвіча, эмацыйнае ў гэтай тэме, "Шуфляда" толькі абвяшчае пра існаваньне такой праблемы Найноўшае гісторыі Беларусі. Мы будзем вяртацца да яе праз успаміны й дыскусіі яшчэ не адзін раз.

Алег Дзярновіч

Анатоль Сідарэвіч: Зь сярэдзіны сьнежня 1966 году я працаваў у раённай газэце "Савецкае Палесьсе". Здаецца, назва да гэтага часу не памянялася. У маладыя гады я вёў свой дзёньнік. А паколькі сам ня маю звычкі па чужых сталах лазіць, дык і гэты дзёньнік ляжаў у маім службовым стале. Але нехта яго прачытаў, і нехта данёс. У тым дзёньніку было сёе-тое: пэўная нязгода, у прыватнасьці там згадвалася імя Ўладзіміра Ільліча. Гэта было падставай для звальненьня мяне з працы. Пра дзёньнік мне не казалі, потым прагаварыліся. Прагаварыўся рэдактар газэты Васіль Праскураў. Далей я працаваў у роднай вёсцы.

Улетку 1968 году мяне зноў звольнілі зь нейкай прычыны. А прычына, мусіць, тая, што былі вядомыя мае кантакты ў Менску: з Алесем Разанавым, Віктарам Ярацам, Львом Барташам ды іншымі. Трэба ўлічыць і тое, што ў мяне ў радні ёсьць пяцідзясятнікі і баптысты. Якраз была "Праская вясна". І я, і мае сваякі цікавіліся падзеямі ў Чэхаславаччыне. Нават праз савецкі друк (вядома, у пераказе, з крытыкай) даходзілі дакумэнты "Праскае вясны". Са сваякамі я абмяркоўваў гэтыя навіны. А трэба ведаць, што пратэстанты — народ апазыцыйны, бо іх заўсёды перасьледавалі і трымалі над кантролем КГБ. А калі цябе перасьледуюць за рэлігійныя погляды, міжволі ў апазыцыю станеш. Пазьней з пэўных словаў, ад пэўных асобаў я даведаўся, што за мною сачылі і ў вёсцы. "Подписку о неразглашении" ці вусны загад чыйсьці тыя людзі выконвалі не да канца.

А потым быў жнівень 1968 году. Высадка савецкага дэсанту ў Чэхаславаччыне, у Празе. Я літаральна на другі дзень пасьля гэтае падзеі паехаў у Пінск, зусім без усякай лішняй, як кажуць, думкі. Сустрэўся з аднаклясьнікам. Зайшоў у францішканскі касьцёл, дзе пробашчам быў цяперашні кардынал Казімер Сьвёнтак. Я, хрышчаны ў праваслаўі, ніколі не пачуваўся праваслаўным. Быў нейкі нутраны недавер да клеру (потым выявілася, што нават патрыярхі супрацоўнічалі з КГБ). Перайсьці ў пратэстантызм, хоць і агітавалі мяне сваякі, таксама ня мог. З маленства ўсьведамляў сябе каталіком. Паколькі ж уніяцкіх грамадаў не было, заходзіў у касьцёл.

Дык вось там, у Пінску, я заўважыў, што нейкі чалавек часта трапляецца мне на вочы. Мусіць, у іх наўме было тое, што я быў у касьцёле: а мо са Сьвёнтакам размаўляў? (А Сьвёнтак жа дзесяць гадоў, калі не памыляюся, сядзеў у месцах "ня гэтак аддаленых".) Калі вяртаўся зь Пінска, гэты чалавек апынуўся ў вагоне. Назаўтра я быў у Ганцавічах, у рэдакцыі раённай газэты. Сяджу, гутару. Дзьверы на калідор насьцеж адчыненыя. Бачу: прайшоў упаўнаважаны Баранавіцкага аддзяленьня КГБ па Ганцавіцкім раёне (прозьвішча ня памятаю, а клікалі Пятром, нават Пецем). Зь ім яшчэ нехта. Мы працягваем размову, а праз колькі часу заходзіць рэдакцыйная машыністка Караліна Цьвірка і кажа: "Толік, цябе кліча рэдактар". Я заходжу да Праскурава й пытаюся: "Вы мяне клікалі, Васіль Фёдаравіч?" — "Не, ня я. Вось гэтыя таварышы". Мяне чакалі Пеця і другі мужчына "ў цывільным". Другі, як я потым даведаўся, быў маёрам КГБ, а звалі яго Михаил Николаевич Песенка. Вось гэтыя два чалавекі прапанавалі мне паехаць у Баранавічы. Пытаюся: "Што я, арыштаваны?" Яны адказалі, што не. "Тады я магу ня ехаць". Мне параілі не адмаўляцца ад запрашэньня. Як я зразумеў, гэта была прафіляктычная гутарка.

Ёсьць у іх такая "мера воздействия". Потым рапартуюць, што праведзеная прафіляктычная гутарка з тым і тым на прадмет... і г.д. Дапытваліся, у прыватнасьці, што казалі мне Юрка Голуб і Алесь Жук пасьля паездкі групы студэнтаў да Ларысы Геніюш. Калі, кажу, вы ведаеце, што была такая сустрэча, дык вы павінны ведаць, што мы сядзелі на беразе Сьвіслачы за стадыёнам "Працоўныя рэзэрвы" (быў такі каля Палацу спорту) з каўбасою і выпіўкаю й пра паездку да Ларысы Геніюш гутаркі не было. Былі таксама пытаньні кшталту "Што Вы скажаце пра Алеся Разанава?" Добры паэт, кажу, "краса и гордость" беларускай паэзіі расьце. (Самае цікавае: потым, калі ў канцы 1968 году КГБ заняўся нацыяналістамі зь філфаку БДУ і калі я быў ужо за кратамі, у сяго-таго пыталіся пра мяне.)

Мне растлумачылі, што такое антысавецкая агітацыя і прапаганда і што такое "падтрымка замежнае контрарэвалюцыі" (быў такі артыкул у Крымінальным Кодэксе). Адправілі мяне начаваць у гатэль, у двайны нумар, дзе начаваў са мною нейкі чалавек. Але мяне мой родны дзядзька, які адсядзеў і ў Бярозе Картускай, і на Калыме, навучыў, папершае, ніколі не размаўляць на палітычныя тэмы зь незнаёмымі людзьмі, па-другое, ніколі не пісаць для КГБ ніякіх папераў.

Памыўшыся халоднаю вадою ў гатэлі, я захварэў на запаленьне лёгкіх і лячыўся ў Малькавічах (Ганцавіцкі раён). А потым трапіў у ганцавіцкую райбальніцу. Мне прапанавалі зрабіць адну невялікую апэрацыю. Нават прапанавалі завезьці ў Менск — у першую клінічную бальніцу да доктара Прохарава. Я згадзіўся, але не зьвярнуў увагі, што ў хірургічным аддзяленьні, груба кажучы, часта круціўся раённы нэўрапатоляг — Іван Міхайлавіч.

У твар я яго пазнаю сярод тысячы людзей, але прозьвішча ў яго тыпова беларускае, таму й забылася. Забягаючы наперад: ужо пасьля псыхбальніцы я сустрэў яго аднаго разу ў Менску — ён працаваў па спэцыяльнасьці ў паліклініцы Міністэрства ўнутраных справаў, значыць, на павышэньне пайшоў. І вось, калі я быў яшчэ ў ганцавіцкай бальніцы, мяне паклікалі ў адзін кабінэт. Там чакаў мяне салідны чалавек. Прафэсар з выгляду. Як высьветлілася, абласны псыханэўроляг. Ён дзеля маёй сьціплай асобы прыехаў зь Берасьця ў Ганцавічы. Пачалася гутарка. Псыханэўроляг на тое псыханэўроляг, каб умець задаваць пытаньні. Дык вось, незаўважна пачалі гаварыць пра дэмакратыю — "буржуазную" і "сацыялістычную". Я яму й сказаў, што дэмакратыя ёсьць дэмакратыя. І пра шматпартыйнасьць сказаў, і аб праве выбіраць паміж альтэрнатывамі, а не галасаваць за аднаго-адзінага кандыдата... І вось чую ад яго вэрдыкт: "У Вас бредовые идеи".

Я быў малады, дваццацігадовы... Хоць і чуў у радыё "Свабода", што ў СССР маюцца псыхушкі і карная псыхіятрыя, але нейк не стасаваў гэтыя весткі да сябе. Я ж гутарыў зь лекарам, а не з чалавекам "у цывільным". І калі праз дзень-другі мне прапанавалі паехаць на машыне мэддапамогі да доктара Прохарава, я ня мог падумаць, што прывязуць мяне ў двор 2-ой менскай клінічнай бальніцы.

Там захаваліся яшчэ два карпусы былога Траецкага уніяцкага кляштара. У крайнім будынку, што бліжэй да Сьвіслачы, знаходзіліся жаночае і мужчынскае псыхіятрычныя аддзяленьні, якія ў сваю чаргу падзяляліся на больш лёгкае і больш цяжкое. І быў там ліфт, на якім вазілі бялізну, ежу і ўсё астатняе. І вось ганцавіцкая машына задам падыходзіць да ліфта. Ні направа, ні налева пайсьці нельга. Наверсе мяне сустракае доктар Алейнікаў. Даведаўшыся, куды трапіў, я засумняваўся, ці туды мяне завезьлі. Доктар Алейнікаў упэўнена сказаў, што я сапраўды хворы. (Потым я даведаўся пра дыягназ: хвароба Блёйлера*, інакш кажучы — шызафрэнія.)

Мне, як належыць, далі амуніцыю, завялі ў палату. Тут я ўбачыў, што такое псыхіятрычнае аддзяленьне: у лекараў і санітарак свае адмычкі ад кожных дзьвярэй, дзьвярэй у палатах няма (каб хто не засіліўся), краты на вокнах, санітары на калідоры (у нас падраблялі студэнты, мардаваротаў не было), няма відэльцаў і гэтак далей. Абмежаваная прастора, адным словам. У гэтым аддзяленьні я прабыў чатыры месяцы. Выйшаў, дакладна памятаю, 13 студзеня 1969 году. Там сустрэў слаўнае 50-годзьдзе БССР, бачыў праз вакно, як даводзілі да ладу Выстаўку дасягненьняў народнае гаспадаркі БССР, як убіралі ў бэтонныя пліты берагі Сьвіслачы. Там пачуў показку: "Што такое камунізм? — Савецкая ўлада плюс ілюмінацыя на Ленінскім праспэкце ў Менску".

Лячыў мяне Фэрдынанд Міхайлавіч Гайдук (наколькі ведаю, сын шчырае каталічкі). Гэта была катэдральная клініка, а катэдру псыхіятрыі тады ўзначальваў Міхаіл Аляксандравіч Чалісаў. Як лячылі? Дзякуй Богу, сульфазінаю** мяне не напампоўвалі. Затое, не папярэдзіўшы, увялі аміназіну***. Пасьля ўколу я добранька ўпаў. Гэтым мэдыкамэнтам мяне і карміў, і калолі. У прафэсара Чалісава была ідэя-фікс — вядомая інсулінатэрапія. Вырашылі ўмацаваць і маё здароўе пры дапамозе інсуліны****. Але мая падстраўнікавая залоза няблага працавала, добра зьядала цукар у арганізьме. Калі мне ўкінулі порцыю інсуліны, я, трохі прайшоўшыся, упаў без прытомнасьці: інсуліна зьела цукар дарэшты.

На маё шчасьце, у Беларусі не было спэцыяльных псыхлячэбніц кшталту Курскай ды іншых, дзе "лячылі" дысыдэнтаў. Пашанцавала, што мяне не завезьлі ў Навінкі, скажам, у знакамітае тады 17-ае аддзяленьне, дзе ляжалі капрафагі... У нашым аддзяленьні ляжалі і студэнты, і дацэнты, і тэлекамэнтатар — цікавая публіка. Там я шмат чытаў. Добрыя людзі, дзякуй ім, адведвалі мяне. Перад адлічэньнем з унівэрсытэту прыходзіў Алесь Разанаў. Янка Брыль быў хадайнікам за мяне. Толькі на пачатку дзевяностых Брыль сказаў мне, пра што была ў яго гутарка з прафэсарам Чалісавым. Прафэсар трымаў мяне за кратамі дзеля таго, каб на волі ня зьелі. Кажу: мне пашанцавала.

Янка Брыль зрабіў так, каб я пасьля бальніцы трапіў у Дом творчасьці ў Каралішчавічах. Там глядзеў незабыўны тэлерэпартаж. Картэж з генсекам і касманаўтамі падыходзіць да Бараўіцкай брамы крамля — і раптам рэпартаж абрываецца. З "галасоў" людзі даведаліся і пераказалі: у Леаніда Ільліча страляў нейкі чалавек. Як высьветлілася, таксама псыхічна хворы. А потым была показка. Кагэбэшнікі пытаюцца ў арыштаванага: "Як жа ты, вайсковец, ня змог пацэліць? — А вы самі паспрабавалі б. Тузаюць за рукі і кожны кажа: дай я, дай я..." Тым часам Міхась Тычына, карэспандэнт "Мінскай праўды" па Слуцкім і сумежных раёнах, знайшоў мне працу ў капыльскай раённай газэце. Праз тыдзень пасьля таго, як я прыехаў у Капыль, у мяне зрабіліператрус. Потым, калі я працаваў ужо настаўнікам у Маларыцкім раёне, за мною таксама сачылі. Адзін знаёмец назваў мне прозьвішча чалавека, які пісаў цыдулі ў КГБ. Была і такая інфармацыя: настаўнік Сідарэвіч чытае ўголас сваёй хатняй гаспадыні Біблію, зьбірае кнігі, выдадзеныя за польскім часам.

Ня ведаю, які канчатковы дыягназ паставілі мне, але (скажу груба) раённыя нэўрапатолягі адчапіліся ад мяне недзе праз два гады. Вельмі цікавае здарылася пазьней. У сярэдзіне 70-х, калі я працаваў у Маларыцкім раёне, быў патоп, бура. Я моцна застудзіўся, "падхапіў" нэўралягію. Прыехаў да доктара Гайдука, на кватэру. Фэрдынанд Міхайлавіч накіраваў мяне ў Менскі гарадзкі псыханэўралягічны дыспансэр да доктара Алейнікава. Той самы Алейнікаў, які сьцьвярджаў, што я хворы, цяпер сказаў, што мне

ніякі псыхіятар непатрэбны, а патрэбны добры нэўрапатоляг. Я быў ужо мудрэйшы, таму й не спытаўся ў Алейнікава: "А што ж ты мне казаў у 68-м?"

***

У вёсцы, прыпаўшы да прыёмніка, я слухаў перадачы "варожых галасоў" пра Сахарава, Салжаніцына ды іншых праваабаронцаў. Прыяжджаючы на сэсіі ва ўнівэрсытэт, шукаў хоць нейкую палітычную апазыцыю. Дайшлі чуткі пра нейкае варушэньне ў Акадэміі, але мне сказалі (людзі зь філязофскіх колаў), што гэта — культурнікі, іх наміткі цікавяць і сымбалі.

Вялікая справа — Пагоня і бел-чырвона-белы сьцяг. Мае вучні ў школе не дадуць схлусіць: я прыносіў у клясу паштоўку з Пагоняй і нацыянальным сьцяжком. Нават у падручніку Абэцэдарскага была Пагоня на рэпрадукцыі вокладкі Статута. Глядзіце, кажу, вось наш герб. Тут, у Менску, маладыя сьпісвалі ў мяне ноты і словы гімну "Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Сур'ёзнага руху не было, а наміткі і ручнікі мяне не цікавілі. Працуючы ў вёсцы, кожны дзень мог убачыць іх.

Дарэчы, у карных органах склаўся быў пэўны стэрэатып беларускага нацыяналіста. Памятаю, як хапалі маладых на першым мітынгу, што праводзіўся на пляцы Волі і быў скіраваны супраць разбурэньня першага менскага тэатру. Дык вось, хапалі іх і дастаўлялі на пастарунак. Вінцук Вячорка пасьля апавядаў, што там адбывалася. Сядзіць нейкі міліцэйскі чын і чытае інструкцыю накшталт біялягічнага вызначальніка, скажам, інсэктаў: "Выгалены-выстрыжаны, грыва — панк! Валасаты-няголены, у залапленых нагавіцах — хіпі! Вышываная кашуля — нацыяналіст!" А тут сядзяць Вінцук ды іншыя хлопцы, апраненыя па-сучаснаму, ніякіх вышываных кашуль... і нацыяналісты. Міліцыянт быў зьбянтэжаны. Калі б усе гэтыя "культурнікі" вывучалі палітычныя тэорыі, займаліся праваабарончай дзейнасьцю — іншае трапіла б у той апазнавальнік. Інакш разгорталіся б падзеі. А так атрымалася, што ў першым сойме БНФ, як я сьмяяўся, было аддзяленьне Саюзу мастакоў і сэкцыя Саюзу пісьменьнікаў.

Палітыцы нашы патрыёты-нацыяналісты не вучыліся. Не маглі адрозьніць камунізм ад сацыял-дэмакратыі, лібэралізм — ад кансэрватызму і многае іншае. У былой Ленінцы некаторых беларускіх дзеячоў можна было сустрэць толькі ў беларускім аддзеле, а вось у аддзел грамадазнаўчых навукаў, куды прыходзілі, скажам, агляды Інстытута навуковай інфармацыі па грамадзкіх навуках, беларускія дзеячы не заходзілі. А там можна было многае вычытаць, знайсьці шмат цікавых кніг. Палітыцы не вучыліся. Цяпер палітыка іх правучвае. Вось гэта першы мой дакор і старэйшым, і аднагодкам.

Працуючы ў Віленскім акадэмічным архіве, я быў непрыемна ўражаны. На папках з гістарычнымі дакумэнтамі я сустракаў прозьвішчы паважаных людзей і, не сумняваюся, патрыётаў. У папках былі паперы Луцкевічаў, Ластоўскага, Смоліча, іншых дзеячоў беларускага руху. І ніхто з тых філёлягаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў не перапісаў, не сфатаграфаваў тыя дакумэнты. Яны зьбіралі матэрыялы для дысэртацыяў і манаграфіяў. Калі зьнікалі цэнзурныя забароны, практычна ніхто зь іх і нідзе не апублікаваў ніводнага дакумэнту з палітычнае гісторыі Беларусі. У шуфлядах яны нічога не хавалі. Гэта ўжо не дакор. Гэта — папрок старэйшым і аднагодкам.

Публікацыю падрыхтавалі Ларыса Андросік і Алег Дзярновіч.

* *Блéйлер Ойген (Bleuler Eugen; 1857-1939) — швэйцарскі псыхіятр і псыхоляг. У 1911 г. апісаў шызафрэнію як самастойнае захворваньне.*

***сульфазына — прэпарат, што ўтрымлівае серу. Ужываецца пры сыфілісе, пры млосьці, пры скурных захворваньнях (кароста й іншыя), а таксама як аслабляльнае. У савецкай псыхіятрыі ўжываўся як карны сродак супраць непакорных. Прэпарат уводзіўся праз сядаліча. Выклікаў жудасныя болі. Рассмоктваўся ў арганізьме вельмі павольна.*

****аміназына — агульназаспакаяльны прэпарат, расслабляе мышцы мускулатуры, пры вялікіх дозах узмацняе дзеяньне сонных і анальгетыкаў.*

*****інсуліна — рэгулюе вугляводы, абмен рэчываў, палягчае пранікненьне глюкозы ў клеткі. Агульнаўзмацняльны прэпарат. Выклікае памяншэньне цукру.*

КУЛЯ ПРАЙШЛА ПРАЗЬ ДЗЬВЕРЫ

*Партызанскімі сьцежкамі — III**

На здымку: Феактыст Міско

Савецка-партыйнае кіраўніцтва не магло разгарнуць у Заходняй Беларусі свайго масавага партызанскага й падпольнага руху без удзелу ў ім мясцовага насельніцтва, а перадусім — былых сяброў КПЗБ. Апошнія яшчэ ў 1941 годзе шмат дзе ўтварылі антыфашыстоўскія арганізацыі, якія аж да канца 1942 г. ня мелі ніякай сувязі з Масквой. Яны дзейнічалі самастойна й кантактавалі ня толькі з савецкаю, але й з народнаю партызанкай. Аднак вясною-летам 1943-га ў заходнія вобласьці прыбылі камуністычныя абкамы й райкамы, якія падначалілі сабе антыфашыстоўскія камітэты, а іх удзельнікаў пачалі выкарыстоўваць як агентуру ў гарадах і вёсках.

Як правіла, сакратар падпольнага райкаму кампартыі разьлічваў атрымаць пасьля прыходу Чырвонае арміі галоўную пасаду ў мясцовай савецка-партыйнай адміністрацыі. Меншыя партызанскія й партыйныя чыны таксама "прыглядвалі" сабе жаданыя месцы будучай працы. Зразумела, што яны не хацелі дапусьціць да ўлады гэткіх небясьпечных канкурэнтаў, як кіраўнікі антыфашыстоўскіх арганізацыяў. А апошнія былі людзьмі папулярнымі сярод насельніцтва, размаўлялі зь сялянамі на роднай мове, а не на расейскай. Баяліся іх ня толькі прыбылыя партыйцы, але й Панамарэнка са сваім штабам, што сядзеў у Маскве. Яны ня ведалі, што рабіць з гэтымі "нацдэмамі" пасьля вызваленьня, але выйсьце было хутка знойдзенае. Пра гібель Я.Урбановіча я ўжо пісаў. На Слонімшчыне падобнай сьмерцю загінуў кіраўнік мясцовага антыфашыстоўскага камітэту Феактыст Міско...

Ф.Міско нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Чамяры Слонімскага павету ў сялянскай сям'і. Яшчэ юнаком далучыўся да таго падпольнага антыпольскага руху, які ачольвала кампартыя Заходняй Беларусі, за што й быў выключаны зь Віленскай Беларускай Гімназіі. Міско вярнуўся ў родную вёску, працаваў на гаспадарцы, быў сакратаром падпольнага Слонімскага акруговага камітэту камсамолу. За ўдзел у забойстве правакатара ў сакавіку 1930 г. ён быў асуджаны польскім судом на 13 гадоў турмы (усю адказнасьць узяў на сябе, абараняючы сваіх сяброў). Феактыст адбываў свой тэрмін зьняволеньня ў сумнаведамай турме Грудзёндз, каля нямецка-польскай мяжы. Пасьля пераходу турмы да нямецкіх акупацыйных уладаў вязьні былі пераведзеныя ў лягер і іх пачалі выкарыстоўваць для рознае працы.

Улетку 1941 году Ф.Міско ўдалося ўцячы і ён прайшоў пешшу ўсю Польшчу, пакуль вярнуўся на родную Слонімшчыну. Дзякуючы яго намаганьням, быў згрупаваны былы актыў КПЗБ і ўтвораны Слонімскі антыфашыстоўскі камітэт. Ф.Міско трымаў шчыльную сувязь зь Язэпам Урбановічам, які стварыў падобны камітэт на Ружаншчыне, а пасьля арганізаваў "Берасьцейскі камітэт барацьбы зь нямецкімі акупантамі". Антыфашыстоўскія камітэты здабывалі важную разьведвальную інфармацыю для савецкай партызанкі, зьбіралі для яе зброю й боепрыпасы, мэдыкамэнты, папаўнялі атрады сваімі людзьмі. Пасьля правалаў і арыштаў, у лістападзе 1943 году кіраўніцтва Слонімскага антыфашыстоўскага камітэту перабралося ў лес Воўчыя норы, у лягер савецкага партызанскага атраду імя Дзяржынскага, дзе знаходзіўся падпольны райкам КП(б)Б. Пра далейшы лёс Феактыста Міско ўспамінае адзін з кіраўнікоў антыфашыстоўскага камітэту Іван Міско (паэт А.Іверс):

"23 лютага 1944 году партыйны кіраўнік міжрайцэнтру Міхаіл Анішчык у брыгаднай зямлянцы праводзіў нараду. Прысутнічалі там і я з Ф.Міско, стаялі недалёка ад акенца пры дзьвярным вушаку. А далей, у глыб зямлянкі, стаяў стол і там сядзелі камандзіры. Раптам за дзьвярыма пачуўся "сухі" стрэл і Феактыст пачаў падаць на мяне. Я й яшчэ пару хлопцаў падхапілі яго на рукі. Праз хвілін пяць ён памёр...

Зь пісталета страляла Анішчыкава радыстка Яўгенія Валахановіч ("Вольга"), якая ішла каля зямлянкі. Куля прайшла праз дзьверы каля самага акенца... Партызаны тут жа хацелі распраўіцца з радысткай, але Анішчык не дазволіў, загадаў пасадзіць яе ў асобную зямлянку й паставіў узброеную варту.

Дакладнага сьледзтва не праводзілася. Анішчык пагадзіўся з тым, што гэта быў "выпадковы" стрэл. Партыйны кіраўнік адправіў забойцу з групай партызан на захад, дзе яна нібыта загінула".

Забітага кіраўніка Слонімскага раённага антыфашыстоўскага камітэту нават не пахавалі з той пашанай, якую ён заслугоўваў. Савецкія партыйцы пашкадавалі новую кашулю — з тых, якія для каманднага складу шыліся з парашутнага шоўку, і Феактыста Міско пахавалі ў адзеньні, залітым крывёю...

Адразу ўспамінаюцца словы аднаго былога савецкага партызана: "Мы былі ім патрэбныя як "гарматнае мяса". А Іван Міско дадае: "Відаць, што была нейкая палітыка на зьнішчэньне нашых актыўных людзей, якія пасьля вайны маглі адыграць вялікую ролю ў дэмакратычным разьвіцьці Беларусі... І я лічу, што радыстка Валахановіч невыпадкова (гэта ўсё зьвялі на выпадковасьць) Феактыста забіла. Гэта, відаць, ужо была нейкая каманда такая, тайная. Анішчык баяўся яго, бо бачыў у ім канкурэнта... Гэтыя партыйцы на нас нейк крыва глядзелі. Ведалі, што мы не стопрацэнтовыя сталінцы. Але бяз нас яны не маглі..."

Што ўжо казаць пра шараговых партызанаў і падпольшчыкаў, калі гэтак бязьлітасна й адкрыта нішчыліся кіраўнікі антыфашыстоўскага падпольля?! Іх жыцьці нічога не каштавалі, а лёсы былі ўжо перадвырашаныя...

Яшчэ задоўга да прыходу Чырвонае арміі савецкае партызанскае кіраўніцтва падрыхтавала сьпісы тых партызанаў, якіх меркавала пакінуць на "вызваленай" тэрыторыі. Гэтага "не былі достойны" былыя паліцыянты, самаахоўцы, удзельнікі Беларускае народнае партызанкі ды іншы "ненадежный элемент". На фронт павінен быў пайсьці амаль увесь шараговы склад савецкіх партызанскіх атрадаў.

Былы партызанскі разьведчык Канстанцін Важэйка ўспамінае пра трагічны лёс партызанаў Ленінскай брыгады (дзейнічала на Гарадзеншчыне):

"Як было летам 1944 году? Партызанаў адпраўлялі ў штрафныя роты... Тым партызанам, якіх пакідалі тут на работу, далі адпаведныя даведкі (сярод іншых і мне), а астатніх — усіх на фронт! А партызаны рваліся на фронт, дабраахвотна хацелі туды, каб помсьціць...

Сабралі партызанаў у лесе, некалькі соцень. Мне й нейкаму афіцэру — партызану "Смаленскаму" (ён родам са Смаленшчыны) далі сьпіс тых партызанаў і пакет, каб той, хто іх будзе прынімаць, на ім расьпісаўся. Партызаны ішлі з ахвотаю, у сваёй адзежы й са сваёй зброяй. Прыйшлі мы ў штрафную роту...

Памятаю я, што на тым баку рэчкі Зэльвянкі былі нямецкія пазыцыі, а на гэты бок замацаваліся штрафнікі... Камандзірам штрафной роты быў нейкі капітан-"турэмшчык". Мы яму аддалі пакет, ён падпісаў. "Стройся, ё... в рот!" — крычыць на партызанаў. Гэтыя строяцца, а мы стаім збоку, "Смаленскі" і я. А як яны пастроіліся, а той убачыў, што мы збоку стаім, закрычаў: "І вы, ё..., становитесь!" Гэты "Смаленскі" гаворыць: "Мы ня станем, нам трэба назад вярнуцца". А ён: "А ну, ё..., тоже становитесь!" І дастае пісталет. А "Смаленскі" гаворыць: "Схавай пісталет, а то я цябе зараз з аўтамата як шарахну!" (А старыя штрафнікі гавораць: "Бі яго, бі!" Ён іх ужо замучыў). Гавару я яму: "Схавай пісталет, я табе апошні раз гавару, а то заб'ю!" Схаваў. Ён думаў, што нас, партызан, напалохае!..

Што зь імі было далей? Назаўтра яны амаль усе й загінулі. Там жа, на Зэльвянцы... Немцы ў акопах сядзелі, а камандзір камандуе: "Узяць штурмам!" Партызанаў пагналі ў тую рэчку й іх там пабілі. Вада чырвоная была... Некаторыя засталіся ў жывых, то прыходзілі й расказвалі, як гінулі партызаны, нават не пераапранутыя ў вайсковую форму..."

Тыя партызаны, што ацалелі ў штрафных ротах і дайшлі да Нямеччыны, ужо ня мелі ілюзіяў наконт "гуманнай" савецкай улады і ейных мерапрыемстваў на Бацькаўшчыне. Былі й такія, што шукалі шчасьця на Захадзе, уцякаючы з Чырвонае арміі да альянтаў. Сьцяпан Янушка ўспамінае: "Хацеў перабрацца да амэрыканцаў у Чэхіі, але нашая частка не дайшла да іх некалькі дзясяткаў кілямэтраў. Я не рашыўся на гэты рызыкоўны крок, палічыўшы, што будзе магчымасьць перайсьці да іх на Далёкім Усходзе. Але й там мне не пашанцавала. Прайшлося застацца ў "савецкім раі"...

Сяргей Ёрш

**Працяг сэрыі матэрыялаў.*
Пачатак у №37 за 1996 і №1-2 за 1997 год.

ПАДЗЕІ ГОДУ

325 гадоў таму (1672) нарадзіўся апошні мараканскі імпэратар Шарыфскай дынастыі, якога празвалі Крывасмокам. У 1703 г. ён быў бацькам 525 сыноў і 342 дачок.

50 гадоў таму нарадзіўся амэрыканец Рон Ален, які ў жніўні 1984-га падняў 113,4 кг і схуднеў на 9,7 кг на працягу 24 гадзінаў. Адбылося гэта ў Нашвіле, штат Тэнэсі, ЗША.

50 гадоў таму памерла амэрыканка Элен Біч Ё, якая 19 студзеня 1896 году ў Карнэгі-Хол (Нью-Ёрк) узяла самую высокую ноту мі 4-й актавы голасам альт-альтысіма.

СТУДЗЕНЬ

175 гадоў таму ў Горадні была закладзеная тытунёвая фабрыка.

125 гадоў, як на Добрушскай папяровай фабрыцы пачалі вытворчасьць паперы.

Заснаваў фабрыку князь Фёдар Паскевіч. Паводле свае тэхнічнае аснашчанасьці і ўзроўню прыбытку яна стаяла ў адным шэрагу зь першаклясньімі фабрыкамі Расеі і Заходняй Эўропы. Сыравінай служылі анучы, салома і асіна. Фабрыка выпускала друкарскую ды іншыя віды паперы. У вытворчасьці выкарыстоўвалася вадзяная сіла ракі Іпуці. У 1881 г. тут працавала 900 чалавек, а ў 1900-м — 1276. Мэдычная абслуга і мэдыкамэнты для працаўнікоў былі бясплатнымі.

50 гадоў назад выйшаў зборнік Янкі Купалы "Спадчына", які быў факсымільна перавыдадзены ў 1992.

Самы працяглы зарэгістраваны выпадак ікаўкі здарыўся з Чарлзам Озбарнам з Энтана (Аёва, ЗША). Ён ікае апошнія 75 гадоў са студзеня 1922 г. Прыступ пачаўся ў момант, калі ён рэзаў парсюка. З тых часоў ён так і ня змог вылечыцца, хоць жыў нармальна, быў двойчы жанаты і мае 8 дзяцей. Ён прызнаецца, што з-за ікаўкі ў яго ў роце не трымаюцца штучныя сківіцы. У ліпені 1996 году ён ікаў 20 разоў у хвіліну, ранейшы ягоны рэкорд — 40.

26 студзеня

25 гадоў таму Весна Вулавіч (Югаславія), сьцюардэса авіяляйнэра DC-9, які ўзарваўся на вышыні 10160 м над Сэрбска-Каменіцэ (Чэха-Славакія), засталася жывой пасьля падзеньня без парашута.

29 студзеня

50 гадоў таму памёр балівійскі алавянны магнат Сымон Ітурбі Паціньё, які вядомы тым, што даў сваёй дачцы Алене самы вялікі з усіх публічна заяўленых пасагаў. Ён даў ёй 8 млн. фунтаў стэрлінгаў з свайго агульнага капіталу ў 125 млн. фунтаў.

30 студзеня

50 гадоў таму ў Менску адкрыўся Інстытут Беларускае Культуры, які пазьней ператворыцца ў Акадэмію Навук.

31 студзеня

200-я ўгодкі аўстрыйскага кампазытара Франца Шубэрта, які памёр на 32-м годзе жыцьця, пакідаючы сваю восьмую сымфонію h-moll "Няскончанай".

ЛЮТЫ

У 1947-м на Менскім велазаводзе быў сабраны першы ровар.

3 лютага

150-я ўгодкі сьмерці нямецкага кампазытара Фэлікса Мэндэльсона (нар. у 1809), бацькі якога ў 1816 г. разам зь пераходам зь юдаізму ў хрысьціянства дадалі сабе прозьвішча "Бартольдзі".

4 лютага

25 гадоў таму ў Ляйтнінг-Рыдж (Новы Паўднёвы Ўэльс, Аўстралія) быў знойдзены самы вялікі ў сьвеце чорны апал (1520 карат). Уладальнік гэтага каменя Пітэр Грэй.

7 лютага

1847 г. У Расеі правялі першую апэрацыю пад эфірным наркозам. Яе правёў прафэсар Ф.Іназемцаў у хірургічнай клініцы Маскоўскага ўнівэрсытэту. Ён апэраваў хворую з пухлінай правай малочнай залозы.

9 лютага

100-я ўгодкі І усерасейскага перапісу насельніцтва. У Менску — 90.912 жыхароў.

Працяг будзе.

АЎТАПАРТРЭТ ІНШАГА

Галерэя візуальных мастацтваў NOVA. Аўтары ідэі і каардынатары Ўладзімер Парфянок і Зьміцер Кароль.

Выстава экспанавалася ў глядзельнай залі Цэнтральнае бібліятэкі імя Янкі Купалы з 8 сьнежня мінулага году. Ня гледзячы на непрыстасаванасьць памешканьня й невялікі розгалас, яна, тым ня менш, сталася значнай падзеяй у сьвеце беларускага фота-арту.

Выстава складаецца з твораў 23-х майстроў фота. Ніколі раней фотавыставы ня ставілі перад сабою такіх экзыстэнцыйных задачаў — выявіць уласнае "Я", як міт, які належыць ня толькі пэрсоне творцы, але і Іншаму. На думку аўтараў праекту, выстава мусіла б адлюстроўваць "...цікавасьць да тае няўпэўненасьці, узбуджэньня, страху і асалоды, да ўсяе тае напружанае драматургіі твару, якая складае істотную частку нашае штодзённасьці".

Калі пагадзіцца з эўропацэнтрызмам аўтараў праекту, якія адназначна сьцьвярджаюць, што "твар у сыстэме сымбалічнае тапаграфіі эўрапейскае культуры выступае дамінантаю", то мы мусім канстатаваць паводле працаў, якія прадстаўленыя ў экспазыцыі, што беларускія фотамастакі пра гэта не здагадваюцца. Адлюстраваньне ўнікальнасьці ўласнае экзыстэнцыі, а тым больш Твару, як самадастатковасьці, — хутчэй выпадковае выключэньне. Нават аўтарам праекту не ўдалося давесьці сваю думку праз творы, зь якіх яны склалі экспазыцыю.

Дзяніс Раманюк. Вялікі трон.

Скрайняя ступень самахаваньня — ад Саўчанкі, які замест Сябе падставіў краявід, да фатаграмы Парфянка, на якой галоўны герой — морская ракаўка, дзе апроч пары рук і кавалку бароды больш алюзіяў на аўтапартрэт няма, — сьведчыць за тое, што нашыя фатографы яшчэ не гатовыя да прэзэнтацыі ўласнага "Я".

Экспазыцыя характарызуецца разнастайнасьцю прафэсійных узроўняў, стыляў і зьместаў. Папросту кажучы, няроўнасьцю... Наіўнае "ню" Вязковай альбо прэтэнцыёзнасьць Кароткінай маглі б глядзецца зусім па-іншаму, калі б побач не было працаў Цярэньцева, Баразны, Ганчарова. Збой у ерархіі прыводзіць часам да парадаксальных вынікаў. Аматар Ізотаў аказваецца адным з найбольш удумлівых аўтараў, ствараючы драму свайго вобразу праз уласны твар і рэчы, такія патрэбныя і звычайныя але... вусьцішна абсурдныя. А прафэсіянал Сібрыкаў, які апроч усяго яшчэ і вучыць новыя генэрацыі фотасправе, дэманструе поўную творчую бездапаможнасьць, якую толькі падкрэсьлівае ў кадры "прылада працы" фатографа. Альбо: аўтапартрэт Аляксея Смольскага выкананы... Аленай Адамчык. Упершыню ў нашай мастацкай практыцы дастаткова быць суаўтарам, каб патрапіць у сьпіс удзельнікаў выставы. Можна разважаць пра ролю майстра ў стварэньні супольнага шэдэўра, але бясспрэчна, гэтая праца ў найбольшай ступені адпавядае зьместу праекту. Партрэт Смольскага выбіваецца з агульнага рэчышча выставы — фотаапаратаў у люстэрках, задуменных паглядаў, ценяў у капелюхах і бязь іх, ... менавіта адпаведнасьцю выставе.

Зьмест праекту адлюстроўвае досьвед самаўспрыманьня, які палягае на тым, што пабачыць сябе збоку можна толькі заняўшы ў прасторы пазыцыю Іншага.

Дзяніс Раманюк разумее такую задачу амаль літаральна. Ён перадусім складае сцэнар, паводле якога мусіць разгортвацца ягоная дзея. Дыптых "Вялікі трон" і "Малы трон" спараджаюць у гледача дыдактычны асацыятыўны шэраг, бясконцы ў культурнай традыцыі Эўропы. Тонкая сьветамадэліроўка здымкаў нагадвае нам, што аўтар найперш мастак-графік і ён разумее сваю задачу між астатнім і як "зробленасьць".

Гэтак жа "літаратурна" ўспрымаецца і творчасьць Міхала Баразны, кожны здымак якога — частка большага, і толькі ў нізках раскрываецца аўтарская драматургія. Цень аўтара сярод рымскіх руінаў — нібыта выпадкова засьпеты сьведка працэсу стварэньня. Цень ад аўтапартрэту.

Цені, цені, цені...

Але і ў гэтых межах "ценяўтварэньня" працы некаторых майстроў сьведчаць, што сярод новых беларускіх кампіляцыяў з эўрапейскага фота можна ствараць сур'ёзнае мастацтва. Працы Ганчарова апраўдваюць дэпэрсаніфікацыю прыцягальнасьцю казачнае гісторыі, якая заўсёды цікавейшая для гледача за проста чужое "Я".

Эрудыцыя — рэч нялішняя, пра што сьведчыць праца Паўлюця. Эксцэнтрычная статыка аўтапартрэту адсылае нас да амэрыканскага пастановачнага фота 70-80 гадоў. Ньютана, Мілера, Ньюмана... Артыстызм, уласьцівы аўтару, прастата і даходлівасьць кампазыцыі, робяць аўтапартрэт Паўлюця праграмным. Але ці ёсьць працяг у такой праграмы напрыканцы XX стагодзьдзя?

Сяргей Харэўскі

Гэты нумар "НН" працягвае традыцыю апытаньняў, распачатую зь першых нумароў аднаўленае газэты.

ШТО ЧЫТАЕМ,

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ,
БСДН "Народная Грамада"

Збольшага часу хапае, каб чытаць філязофскую, паліталягічную й гістарычную літаратуру, неабходную для працы. Мінулым летам падчас дзіцячых вакацыяў чытаў Вайновіча, Уладзімава, Аксёнава й Куртуазных Маньерыстаў. Люблю перачытваць любімыя кнігі. Зь беларусаў — Стральцова, Гарэцкага, Адамчыка, Брыля. З расейцаў — Пушкіна, Лермантава, Тургенева, Цютчава. З палякаў — Жэромскага. Увогуле, я пад старасьць гадоў зрабіўся талстоўцам — імкнуся чытаць дакумэнтальную й мэмуарную літаратуру. Дарэчы, настойліва рэкамэндую пачытаць успаміны Голды Мэер. А пасьля параўнаць іх з успамінамі Вілі Бранта й Франца Ёзэфа Штраўса... Але самае галоўнае, што я чытаю трывала — гэта Біблія. Яна ёсьць у мяне й на працы, і дома.

КАСЯ КАМОЦКАЯ,
гурт "Новае Неба"

Нядаўна перачытала казку Стругацкіх "Панядзелак пачынаецца ў суботу". Я ўвогуле люблю перачытваць казкі. Што да сур'ёзнай літаратуры, апошнім часам проста не магу яе чытаць. Нават газэты чытаць ня хочацца. Праўда, нядаўна даведалася з газэты, што літаратурная Нобэлеўская прэмія была прысуджаная польскай паэтцы. Зь цікаўнасьці пашукала зборнік Шымборскай у перакладзе Ніны Мацяш. Вельмі ўразілася як якасьцю вершаў, гэтак і якасьцю перакладу.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК,
фотажурналіст

Надзвычай дарагой для мяне сталася кніжка, якая называецца "Адзін дзень з жыцьця Ірляндыі". Фантастычная кніга. На працягу дня Ірляндыю здымалі лепшыя фатографы з усяго сьвету. У Беларусі такія экшны ў бліжэйшай будучыні не прадбачацца. У мінулым годзе набываў шмат слоўнікаў, але мастацкую літаратуру амаль не чытаў. Праўда, быў вельмі ўсьцешаны выхадам у сьвет зборніка Натальлі Арсеньневай.

УЛАДЗІМЕР КОЛАС
Беларускі Гуманітарны Ліцэй

Запомніліся трохтомнік Яхіма Фэста "Адольф Гітлер" і кніга Эдуарда Лімонава "Чужаніца ў незнаёмым горадзе". Аўтары розныя, але вартыя параўнаньня. Абодва выкарыстоўваюць выразную філязофскую традыцыю. Першы — нямецкую, другі — расейскую. Абодвух яднае глыбокае пранікненьне ў вызначаную тэму й лёгкасьць і дакладнасьць фармулёвак. Абодвух яднае тэма фашызму. Але, у Фэста атрымаўся антыфашыстоўскі раман, у той час як у Лімонава наадварот. Прычым, у Лімонава адчуваецца нейкае сіроцтва, атрафаванасьць пэўных чалавечых якасьцяў... На жаль, гэты ягоны раман не выпадае з агульнай тэндэнцыі, што запачаткавалася нядаўна ў Расеі. У беларускай літаратуры апошнім часам больш за ўсё зьвяртае на сябе ўвагу эсэістыка. У гэтым жанры мне найбольш імпануюць Валянцін Акудовіч, Уладзімер Арлоў і Адам Глёбус.

ВОЛЬГА КАРАТКЕВІЧ
Беларуская Асацыяцыя Незалежнае Тэлевізіі:

Парадаваў выхад часопіса "Фрагмэнты". Уразілася прачытаньнем твора Мілана Кундэры "Невыносная лёгкасьць быцьця". З паэзіі вельмі спадабаўся адзін зь вершаў зборніка Славаміра Адамовіча "Каханьне пад акупацыяй". Вельмі мужчынскі, мужны верш. Такіх у нас цяпер мала.

АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ
музэй Максіма Багдановіча:

Звычайна чытаю адразу некалькі кніжак: адну пачну, другую скончу... Апошняе, што скончыў — "У бязьмежную даль". Зборнік твораў пра Максіма Багдановіча. Але я пра яе казаць ня буду, бо зьбіраюся напісаць рэцэнзію ў "ЛіМ". Хіба што падзялюся ўражаньнем ад крытычнага артыкула Ніла Гілевіча з гэтай кнігі, напісанага трыццаць гадоў таму. Гэта абсалютова несавецкі тэкст, які цалкам выпадае з традыцыйнага школьнага літаратуразнаўства. Яшчэ адно ўражаньне — ад прачытаньня крытычнага артыкула Антона Луцкевіча "Апраўданьне чыстае красы ў творчасьці Максіма Багдановіча". Тэкст быў напісаны ў дваццатыя гады, але, мяркую, ён і дагэтуль застаецца літаратурнай крытыкай вышэйшага кшталту. За апошні час у беларускай літаратуры для мяне цікавымі сталіся дзьве кніжкі: "Толькі не гавары маёй маме..." Адама Глёбуса і зборнік вершаў Эдуарда Акуліна "На Каляды".

ЗЬМІЦЕР ПАДБЯРЭСКІ,
газэта "Имя"

Апошнюю кнігу, якую прачытаў, напісаў мой сябра Сяргей Крапівін. Шкада, забыўся назву... Часу няма нават каб прачытаць газэту, дзе працую. А мастацкую літаратуру не чытаў гады з тры. Апошняе спрычыненьне да кнігаў было такое — перабраў уласную бібліятэку, і тыя кнігі, што ляжалі на шафе, ці пад шафай, склаў у скрыні.

ІРЫНА КУРАПАТКІНА,
Радыё 101,2

Нядаўна перачытала Бродзкага, зараз узялася перачытваць Джойсавага "Уліса". Я ўвогуле люблю перачытваць любімыя кнігі. З адкрыцьцяў апошняга часу хачу назваць Кевана Ўілса. Ягоная кніга, прысьвечаная Ір-

Рок-каранацы

ДОБРА БЫЦЬ КАРАЛЁМ,

альбо разважаньні на тэму Сьмерці рок-н-ролу

Факт сьмерці рок-н-ролу абвяшчаўся з зайздросным пастаянствам і гэтак жа часта і ўпарта зьняпраўджваўся, пачынаючы з моманту нараджэньня зьявы. Цяпер пра гэты факт маглі б абвясьціць і беларускія рок-н-рольнікі, каб не пытаньне: "А ці быў хлопчык? Можа, хлопчыка й не было?"

23 студзеня ў навастворанай канцэртнай залі "Кастрычнік" (у аднайменным кінатэатры) у Менску адбыўся фэстываль "Рок-каранацыя — 96", які праводзіцца трэці раз і менавіта цяпер ператварыўся зь мерапрыемства "для вузкага кола абмежаваных людзей" у зьяву "рэспубліканскага значэньня".

Сьпіс традыцыйных арганізатараў і фундатараў пашырыўся за кошт новых імёнаў, а гэта адпаведным чынам перадвызначыла маштаб і збольшага характар імпрэзы. З характарам трэба вызначыцца адразу.

Са мной нешта ня тое, бо словы РОК і КАРАНАЦЫЯ для мяне маюць абсалютова канкрэтныя значэньні. Можа, я не адсочваю нейкіх глыбінных працэсаў, не разумею сытуацыі і не адчуваю моманту?.. Можа, праз уласную няўважлівасьць і неарганізаванасьць я прагледзела той момант, калі ў Беларусі расквітнеў шоў-бізнэс, адкрылі свае прадстаўніцтвы сусьветнавядомыя гуказапісвальныя кампаніі, пачалі арганізоўвацца канцэрты, зьявіліся шматлікія музычныя радыёстанцыі, часопісы, чарты, якія й фільтруюць моцную хвалю рознастылёвае музычнае прадукцыі паводле якасьці, папулярнасьці, камэрцыйнасьці, элітарнасьці й г.д. Ня думаю, што мая няўважлівасьць мяжуецца з хваробай псыхалягічнага характару, проста ў становішча ўленьні трэба нешта падправіць. Заплюшчы вочы, скарыстоўвай тое, што ёсьць, і не шукай іншага.

Штучныя зялёныя кветачкі (традыцыйны і сучасны дызайн рэстарацыяў) на сцэне, абавязковыя разгубленыя даўганогія дзяўчаткі ў рэштках прэтэнзіі на авангардавыя мадэлі і, зразумела, шырокі выбар!!! Мы кажам: "Традыцыі і Сучаснасьць", — заўсёды маем на ўвазе "Палац"! Мы кажам: "Найлепшы дэбют", — выходзяць "Stockes" (колькі гадоў трэ было займацца музыкай, каб быць такім чынам прызнанымі?)! Мы кажам: "Найлепшы тэкст", — першым у сьпісе "Ляпис Трубецкой" (плятынавы век беларускай РОК-паэзіі). Мы кажам "Найлепшы альбом" (ня трэба разьлічваць на якасьць, стыль, узровень) — моцным рэхам Камароўскіх кіёскаў адбіваецца "Ранетое сердце" "Ляписа Трубецкого". Мы кажам "Найлепшы гурт" — сумневы зьнікаюць. І правільна. Бо, як прагназуюць сыноптыкі і сьведчаць арганізатары, наступны фэстываль будзе зладжаны накшталт расейскага конкурсу "Песьня году". Ізноўку ж, якія могуць узьнікнуць пярэчаньні? Я нават абедзьвюма рукамі "за", можа, з гэтага моманту зьявы будуць адпавядаць назвам, і не патрэбна будзе рабіць папраўку на геапалітычную сытуацыю і курс даляра. Толькі адзінае засмучае: баюся я чамусьці таго, што наступным годам беларускі (і асабліва беларускамоўны) рок будзе прадстаўлены выключна ў выглядзе "даніны памяці за былыя заслугі і ўнесены ўклад". Бо гэтым разам больш чым дастаткова падставаў (ва ўсіх значэньнях гэтага слова) для такога прагнозу.

Гурты "Крама" і "Рублёвая зона" зьявіліся на сцэне як былыя ўладальнікі Кароны, Кася Камоцкая і "Новае Неба" ў намінацыі "Найлепшы тэкст" выканалі песьню "Лёлек і Болек" (хоць тыя найлепшыя тэксты Міхала Анемпадыстава для "Новага Неба" вядомыя праз іх замоўчваньне), спэцыяльнымі ўзнагародамі "за дасягненьні" адзначылі Івана Маркава і "Братоў... Казлоўскіх... у блюзе", падарункам за інтэрпрэтацыю — "Нейро Дюбель". Адзінымі, хто меў да гэтых самых намінацыяў нейкае дачыненьне, сталі музыкі гурту "NRM". Публіка выкрычала для іхных "Партызанаў" перамогу ў конкурсе на найлепшую песьню.

Але ўсё гэта — разважаньні (занятак няўдзячны). З падзякамі зьвяртаюцца да іншых.

Добра быць Каралём. На пытаньне: "Ці хочацца Вам песень?" — кароль адкажа: "Іх ёсць у мяне!"

Гінэс P.S. Amicus Plato, sed magis amica veritas (Плятон — мой сябра, але ісьціна найперш).

Іра Гінэс

Здымак Уладзімера Шлапака.

У ЧАКАНЬНІ КАЛЯДАЎ

Гутарка з Касяй Камоцкай з "Новага Неба"

Позна ўвечары посуд памыю
і пакіну, каб сохнуў на тацы.
Мы чакалі Калядаў з маленства
і ніяк не маглі дачакацца.

Напрыканцы мінулага году "Новае неба" выпусьціла сваю пятую ўжо праграму — "Мая краіна". Настальгія па маладосьці і зьвязаная зь ёй чысьціні пераважае тут над чыста палітычнымі матывамі. Лідэр "Новага неба" Кася Камоцкая ўжо, бадай, сталася адным з сымбаляў беларускага рок-руху. Зь ёю размаўляе Гальляш Сьвірын.

— Складаецца ўражаньне, нібыта старыя беларускамоўныя гурты ня надта здолелі адаптавацца да новых умоваў.

— А як можна было адаптавацца? Нельга разглядаць нацыянальную музыку, асабліва тую, якая выконваецца на мове, па сутнасьці, меншасьці, асобна ад палітыкі дзяржавы. І нармальнае яе існаваньне немагчымае, калі палітыка антынацыянальная.

— Але ж рок-н-рол заўжды разьвіваўся адасоблена ад дзяржавы, нават у нечым і насуперак ейнай ідэалёгіі, ніколі не прэтэндуючы на дзяржаўную падтрымку.

— Безумоўна. Але дзяржава мусіць падтрымаць іншыя сфэры чалавечай дзейнасьці, напрыклад, нацыянальную эканоміку. І толькі тады могуць зьявіцца мэцэнаты, шоў-бізнэс, і рок-музыка можа нармальна існаваць. Вакол гэтага ўсё круціцца. А непасрэднай падтрымкі дзяржавы рок-музыка ніколі не патрабавала, дый ня мусіць яе мець.

— Апошнім часам палітычныя матывы зьяўляюцца ў творчасьці нават тых, для каго яны зусім не ўласьцівыя. Як ты лічыш, з чым гэта зьвязанае?

— Безумоўна, зь цяперашняй сытуацыяй. Іншая справа, што асабіста ў мяне настрой, як на дадзены момант, цалкам адваротны. І пасьля выпуску доволі палітызаванага альбому "Мая краіна" хочацца нечага філязофскага, пра каханьне. Больш непрабіўнога народу за гэты я нават не магу сабе ўявіць, і таму цяпер хачу зьвяртацца ў сваіх песьнях не да яго, а да лірычнага героя.

— Сярод беларускай інтэлігенцыі наракаць на народ цяпер, мусібыць, нават модна...

— Я ня столькі наракаю, колькі зьдзіўляюся. Зьдзіўляе поўная абыякавасьць да сябе, да свайго лёсу.

— Наш час зрэдку параўноўваюць з пэрыядам застою. Калі, па-твойму, жылося і тварылася лепей — тады ці цяпер?

— Напэўна, усё ж, тварыць было лепей тады. Бо ўсё было яшчэ наперадзе. Людзі разумелі, што застой, Брэжнеў, напаўжывы Андропаў — ня вечныя. А цяпер мы змушаныя хіба суцяшацца прымаўкай: "повторение — мать учения".

— Ты прыйшла ў рок-н-рол ужо ў сталым узросьце, што, у прынцыпе, даволі нетыпова...

— Чаму "нетыпова"? Шмат якія людзі пераасэнсоўваюць свае пазыцыі ў сталым узросьце, гэта ніколі ня позна. А прыход у рок быў зьвязаны, напэўна, з маім характарам. Бардаўская млявая песьня неяк не па мне. Таксама на прыход у рок-н-рол паўплывала тусоўка, маё асяродзьдзе. Калі я пазнаёмілася з творчасьцю "Мроі", іншых музыкаў, захацелася зрабіць нешта падобнае самой.

— Хто найбольш паўплываў на тваю творчасьць у року?

— Бадай, ніхто. Увогуле, цяпер я вельмі мала слухаю музыку. Мабыць, таму, што раней, у дзяцінстве, "пераслухала". Я зусім не зьяўляюся мэляманам. І мне цяжка сказаць, што хтосьці канкрэтна на мяне паўплываў. Мабыць, наадварот, усё йшло ад нейкага невуцтва, недастатковага веданьня ўзораў, на якія трэба арыентавацца.

— Што для цябе нацыянальная рок-музыка?

— Усялякая творчасьць наўпрост зьвязаная з мовай, з мэнтальнасьцю чалавека, з традыцыямі сьветаўспрыманьня. Гэта ўсё рознае ў розных народаў. А што тычыцца рок-н-ролу, дык гэта, напэўна... Ну, ня ведаю. Проста музыка такая, свабодная і вельмі шчырая. Бо калі пачынаецца нейкі фальш, камэрцыялізацыя, рок-н-рол папросту зьнікае. Таму рок-н-рол для мяне — гэта перадусім шчырасьць.

— А як ты лічыш, наколькі нацыянальная музыка спалучальная зь нейкімі агульнасусьветнымі ідэямі і каштоўнасьцямі?

— Ну зноў жа, якая музыка не зьяўляецца нацыянальнай? Можна, вядома, рабіць суцэльную кальку з ангельскіх ці амэрыканскіх узораў, але што гэта дасьць? Бо тады атрымаецца зусім ня нейкая агульнасусьветная музыка. Чаму, напрыклад, творчасьцю ірляндзкіх гуртоў захапляецца ці ня ўвесь сьвет? Менавіта з-за нейкай яе апрычонасьці, адметнасьці. Пад час выступаў за мяжой — у Францыі, Даніі я бачу: каму там патрэбны які-небудзь сурагат ангельскай музыкі барысаўскай вытворчасьці, калі на Захадзе ёсьць магчымасьць слухаць гэтую музыку непасрэдна ў выкананьні ангельцаў? І там анікому ня будзе цікавы гурт, які прыйдзе зь Беларусі й будзе граць клясычны рок па-ангельску, хай сабе і на цалкам нармальным узроўні.

— А як успрымаюць за мяжою вас?

— Выдатна! Дарэчы запрашаюць нас туды менавіта таму, што мы граем нешта адметнае і сьпяваем па-беларуску. Дарэчы, найбольшую колькасьць замежных гастроляў мелі некалі "Песьняры", а цяпер, напэўна, мае "Палац". Наадварот, калі сьвядома арыентавацца на Захад, лепей не "зьдзіраць" клясыку року, а рабіць нешта фолькавае.

— Свае песьні ты пішаш на тэксты іншых паэтаў. Ці няма супярэчнасьці паміж тым, што хочаш сказаць ты і тым, што кажуць яны?

— Раней я пісала музыку да вершаў розных паэтаў у тым выпадку, калі той ці іншы твор адпавядаў мне самой. І песьня атрымлівалася даволі цэласная. Потым пачалася дастаткова мэтанакіраваная праца зь Міхалам Анемпадыставым. Нейкія рэчы мы зь ім адчуваем вельмі падобна, хоць людзі паводле натуры абсалютна розныя. Цяпер тэксты зрэдчасу пішуцца на замову, на зададзеную тэму.

— І апошняе пытаньне, таксама дастаткова банальнае. Якім будзе далейшая творчасьць "Новага неба"?

— Сёньня я ня ведаю ня тое, што пра творчы лёс "Новага неба", а нават і пра свой уласны лёс у гэтай краіне.

НАВОШТА І ЯК?

ляндзкай Рэспубліканскай Арміі мяне вельмі ўразіла.

АДАМ МАЛЬДЗІС,
Цэнтар імя Францішка Скарыны:

Я хачу сказаць пра незвычайную кнігу, якую зусім нядаўна мне прывезьлі з Варшавы. Яна называецца "Dom Sapiezynski". Гэта ці ня поўны збор дасьледаваньняў, прысьвечаных роду Сапегаў. Кніга выдадзеная коштам Эўстахія Сапегі, нашчадка слаўтага роду, які жыве ў Кеніі, дзе мае турыстычны бізнэс — арганізоўвае сафары... Што да мастацкай літаратуры, каюся — больш за тры гады амаль нічога не чытаў. Хіба, калі ў электрычцы па шляху на лецішча прагля даю "Маладосьць" ці "Полымя"...

УЛАДЗІМЕР ПАРФЯНОК,
фотамастак:

Апошняе з моцных уражаньняў ад літаратуры — раман Фаўлза "Маг". Ён мяне вельмі зачапіў, і я прачытаў яшчэ некалькі твораў гэтага пісьменьніка. Дарэчы, калісьці ў савецкай тэлевізіі паказвалі фільм, зьняты паводле Фаўлза — "Жанчына французскага лейтананта"... А больш нічога не чытаў, апрача газэтаў "Свабода", "Звязда" й "Наша Ніва", ды й то нерэгулярна. А яшчэ летась я неяк набыў кніжку "Першацьвета", у ёй мяне кранууў адзін вершык. Вельмі сур'ёзны вершык, вельмі малога хлопчыка...

ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ,
часопіс "Крыніца"

Уразіўся "Сыстэмай рэчаў" Жака Бадрыяра, а таксама "Кнігай цара Давыда" Штэфана Гайма, якая неўзабаве ў перакладзе Васіля Сёмухі выйдзе ў двух нумарах часопіса "Крыніца". Зь беларускай літаратуры хачу адзначыць аповесьць Уладзімера Арлова "Краявід з мэнтолавым пахам", надрукаваную ў "Крыніцы". А таксама "Каханьне пад акупацыяй" Славаміра Адамовіча. А ўвогуле апошнія пяць гадоў — відавочная недастатковасьць прозы ў беларускай літаратуры. Зьяўляюцца добрыя тэксты, але іх недастаткова, каб сфармаваць чытача. Гэтаксама, як недастаткова некалькіх навальніцаў, каб зазеляніліся пустыня.

ГЕНАДЗЬ САГАНОВІЧ,
"Беларускі гістарычны агляд"

Наймацнейшае ўражаньне — ад прачытаньня "Картэзіянскіх разваліна ў" Міраба Мамардашвілі. Складана адным сказам пракамэнтаваць свае ўражаньні... Я чытаў кнігу ў глыбокай адзіноце... Гэта сапраўдная філязофія. З мастацкай літаратуры — тое, што ўвесь час насіў з сабою, гэта зборнік Натальлі Арсеньневай, які нядаўна выйшаў у выдавецтве "Беларусь". Перачытваў асобныя зборнікі Ўладзімера Караткевіча... Калі шчыра, мінулы год быў надзвычайна неспрыяльны для развагаў аб культуры, і ўвогуле для рэфлексіяў. Страшны быў год.

ВІТАЛЬ ТАРАС,
беларуская служба радыё "Свабода"

На чытаньне мастацкай літаратуры не хапае часу... Адносна нядаўна прачытаў трылёгію Толкіена "Уладар колаў". Не скажу, што ўразіўся, але было цікава.

СЯРГЕЙ ЧЫСЛАЎ,
"Белы Легіён"

Скончыў чытаць "Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі" Энтані Сьміта. Перачытаў "Каласы пад сярпом тваім" Караткевіча. Але збольшага летась я амаль не чытаў мастацкую літаратуру. І рэч ня ў тым, што з-за актыўнага палітычнага жыцьця краіны не хапала часу. Проста з моманту, калі ў 1991 годзе я звольніўся з войска, у мяне наступіла пэўнае перанасычэньне інфармацыяй. Дарэчы, у мяне ў вайсковай характарыстыцы ёсьць анэкдатычны запіс: "Шмат чытае, палітыку партыі не падтрымлівае". Сёньня ў мяне пэрыяд агульнага пераасэнсаваньня. Думаю над праграмай "Легіёну".

Падрыхтаваў Севярын Квяткоўскі

КАРАНАЦЫЯ ПА-АМЭРЫКАНСКУ

На мінулым тыдні адбылася апошняя ў гэтым стагодзьдзі інаўгурацыя прэзыдэнта ЗША. Апошняя яна і для зноў перавыбранага прэзыдэнта Ўільяма Джэфэрсана Клінтана — 42-га і 43-га прэзыдэнта Злучаных Штатаў.

Звычайна інаўгурацыя амэрыканскіх прэзыдэнтаў мала чым саступае каранацыі эўрапейскіх каралёў. Пасьля афіцыйнай часткі адбываецца тое, што ў нас называюць масавымі гуляньнямі, дзе даюць канцэрты розныя слынныя зоркі масавай і нямасавай культуры, і раздаецца бясплатная ежа. Хлеб і відовішчы, так бы мовіць.

Зрэшты, сама афіцыйная частка — гэта ўжо прыклад амэрыканскай масавай культуры ў стылі апошніх патрабаваньняў палітычнай карэктнасьці і мультыкультуралізму. Інакш кажучы, адбылося бабілёнскае зьмяшаньне стыляў, расаў і палітычных прыхільнасьцяў, што добра зафіксавала тэлекамэра наўпроставай тэлетрансьляцыі. Нават панэўрапейскі францускі тэлеканал "Euronews" (неверагодна, але факт!) перарваў свой традыцыйны выпуск навінаў, што ідзе кожныя паўгадзіны, і паказваў узыходжаньне на трон па-амэрыканску.

Прэзыдэнт і віцэ-прэзыдэнт зь іншымі важнымі пэрсонамі зьявіўся перад амаль паўтарамільённым натоўпам людзей за браняваным шклом, якое атачала трыбуну. Палітычная карэктнасьць і мультыкультуралізм былі бачныя ўва ўсім. Цырымонію вёў сэнатар-рэспубліканец. Вядомы баптысцкі прапаведнік Білі Грэм, які таксама вядомы сваімі кансэрватыўнымі рэспубліканскімі поглядамі, памаліўся за ўвесь амэрыканскі народ, а таксама за прэзыдэнта —лібэрала-дэмакрата Біла Клінтана, які разам з жонкай Хілэры, што на сьпірытычным сэансе выклікала дух Элеаноры Рузвэльт, наведвае мэтадысцкую лібэральную царкву, пастар якой выступае за правы тых, хто практыкуе садомскі грэх.

Праўда, малітва Білі Грэма больш нагадвала не традыцыйны для баптыстаў імправізаваны зварот да Бога сваімі ўласнымі словамі, а чыталася на працягу пяці хвілінаў з загадзя падрыхтаванага тэксту. Білі Грэм, як гэта робіцца пры чытаньні звычайнай справаздачы, раз-пораз адрываўся ад паперкі і пазіраў на аўдыторыю. Народ паводзіў сябе адпаведна: нехта маліўся, а некаторыя (адзін у габрэйскай ярмолцы) назіралі за "прамоўцам" у бінокаль. Паводле зьместу малітва таксама нагадвала зварот да партыйнага зьезду (зь лёзунгамі, дэклярацыямі і нечым накшталт сацыялістычных абавязацельстваў).

Пасьля хлопец-скаўт лацінаамэрыканскага выгляду і з выразным гішпанскім прозьвішчам ад імя ўсяго скаўцкага руху ЗША прысягнуў на вернасьць краіне і прэзыдэнту. А прадстаўніца афраамэрыканскай меншасьці (па-нашаму, негрыцянка; кажуць, тамтэйшая зорка опэры) выканала гімн ЗША. Прэзыдэнт прысягнуў на Бібліі, якую чамусьці трымала ягоная жонка, а хор, складзены з старанна падабраных прадстаўнікоў усіх расаў і народнасьцяў, у суправаджэньні вайсковага духавога аркестру выканаў шэраг патрыятычных песьняў.

Клінтан вырашыў зрабіць сваё другое ўзыходжаньне на прэзыдэнцкі трон больш сьціплым, чымся 4 гады таму, калі болей за 4 дні грукаталі фэервэркі і гучала музыка. Сёлета амэрыканскі прэзыдэнт, які за папярэднія гады падназапасіў досьведу і мудрасьці, зьменшыў памеры ўрачыстасьцяў. Усе мерапрыемствы афіцыйна доўжыліся толькі 3 дні, адбываліся ўсяго ў 8 часовых павільёнах-намётах замест колішніх 65-ці і, галоўнае, былі непараўнальна больш таннымі. На гэты раз быў адменены рука-за-руку шпацыр сотняў школьнікаў праз Мэмарыяльны мост, які мусіў пад перагук званоў па ўсёй краіне сымбалізаваць уваходжаньне нацыі і яе прэзыдэнта ў XXI-ае стагодзьдзе.

Незвычайнай "сьціпласьці" інаўгурацыі паспрыяў і зьвязаны зь перадвыбарачай барацьбой скандал, калі Клінтана абвінавацілі ў выкарыстоўваньні для сваёй прэзыдэнцкай кампаніі грошай адной азіяцкай фірмы. Таму на гэты раз Клінтан забараніў выкарыстаньне прыватнага капіталу, беспрацэнтных ссудаў і рознага роду ўскоснай рэклямы (у падобных выпадках розныя кампаніі прадстаўляюць свае паслугі ўзамен на паблісіці), што звычайна былі неад'емнай часткай падобных мерапрыемстваў.

Становішча ратавала тое, што для інаўгурацыі, якая праводзілася яшчэ чатыры гады таму, было сабрана гэтулькі грошай, што частка іх засталася і на гэтую. Да таго ж была арганізаваная камапнія збору сродкаў праз продаж запрашальных квіткоў і сувэніраў. Самым хадавым сувэнірам былі мэдальёны з выявай самога Клінтана і ягонага віцэ-прэзыдэнта Гора коштам 40 даляраў за штуку. Іх продаж ажыцьцяўляўся праз звычайную для ЗША паштовую рассылку на папярэднія тэлефонныя замовы. За хвіліну працы тэлефоннае лініі, праз якую рабіліся замовы, было закуплена такіх сувэніраў на 10 тыс. даляраў. Запрашальныя квіткі мелі ня меншы попыт. Нават ня гледзячы на тое, што яны прадаваліся па коштах зь некалькімі нулямі. Чым лепшым было месца (бліжэй да прэзыдэнта), тым даражэйшымі былі запрашальнікі. Самыя лепшыя месцы дасталіся, натуральна, прадстаўнікам дэмакратычнай партыі. Далей ішлі тыя, хто зрабіў больш фінансавы ўклад падчас перадвыбарнай кампаніі.

У сваёй інаўгурацыйнай прамове прэзыдэнт Клінтан пахваліўся посьпехамі, якіх дасягнула краіна пад ягоным кіраўніцтвам, адзначыўшы зьмяншэньне злачыннасьці і рост дабрабыту. Ён намаляваў вясёлкавыя пэрспэктывы для сваіх суграмадзянаў на будучыню, запэўніўшы, што іх дзеці будуць бесклапотна гуляць на бясьпечных вуліцах, дзе ня будзе ані ўзброеных бандаў, ані наркаманаў. Прэзыдэнт ЗША зрабіў невялікі экскурс у гісторыю краіны, прыгадаўшы першых перасяленцаў, якія на біблійны манер разглядалі Новы Сьвет як Зямлю Абяцаную. На гэты раз Біл

Клінтан паабяцаў прынесьці сваю краіну ў Зямлю Новага Абяцаньня.

Уладзімер Баранчч

Навагоднія падпальшчыкі

Розныя краіны вызначаюцца сваімі незвычайнымі традыцыямі сустрэчы Новага году. Напрыклад, італьянцы выкідаюць у вокны розныя непатрэбныя рэчы, у тым ліку і мэблю. А вось у ЗША, за адсутнасьцю якіх-кольвечы экстравагантных звычаяў, даводзіцца кожнага разу штосьці прыдумляць. Напрыклад, спальваць кнігі.

Звычайна словазлучэньне "спальваць кнігі" носіць злавесны характар. Адразу прыходзяць на розум вогнішчы сярэднявечнай інквізыцыі ці нацысцкія шабашы. Але ў дадзеным выпадку – гэта проста мастацкае дзеяньне, свайго роду авангардовы пэрфоманс. Людзі, якія займаюцца гэтым, на самой справе любяць і шануюць кнігі. Яны – студэнты і выпускнікі ўнівэрсытэтаў і каледжаў, мастакі, настаўнікі, радыёжурналісты і нават выдавец зь бібліятэкарам. У іх вельмі сур'ёзныя адносіны да кніг. Нагэтулькі сур'ёзныя, што яны заснавалі адмысловы штогадовы рытуал пад назвай "Навагодняе кніжнае спальваньне". Агню падлягаюць усе кнігі, зь якімі ня згодныя, ці якія ня любяць удзельнікі рытуалу, кнігі, што знаходзяцца па-за межамі іх разуменьня (занадта "завумныя" ці напісаныя вычварнай мовай высакалобых прэтэндэнтаў у мудрацы, ці якія-небудзь аднахвілінавыя маскультаўскія бэстсэлеры).

Ідучы ў нагу з часам, аматары пагрэцца каля нязвыклага вогнішча паляць ня толькі кнігі, але і ўсё, што толькі ўтрымлівае інфармацыю: часопісы, газэты, рэклямныя аб'явы сабачай ды кацінай ежы, плякаты з розных перадвыбарчых кампаніяў, магнітафонныя і відэакасэты, вінілавыя грамафонныя кружэлкі, кампакт-дыскі (музычныя і кампутарныя), паштоўкі і ганаровыя граматы. Адзінай умовай для адданьня носьбіта інфармацыі агню мусіць быць вялікая нелюбоў, што зыходзіць з глыбіні душы, нудота, злосьць ці раздражненьне, выкліканае ім.

Першае ўрачыстае адданьне агню ненавіснай літаратуры адбылося пад 1994 г. Натуральна, што першай ахвярай сталася кніга Рэя Брэдбэры "451 градус па Фарэнгейту", дзе спальваньне кніг апіс-

ваецца і асуджаецца як цемрашальскія захады таталітарнага тэхнакратычнага рэжыму.

Навагодняе вогнішча з кніг – гэта ня проста відовішча натоўпу адурнелых ды азьвярэлых ад чытаньня, глядзеньня ці слуханьня чагосьці невыноснага для іх людзей. Гэта, са словаў саміх удзельнікаў, – "сьвята кнігі, сяброўства і ежы". І рыхтуецца гэтае сьвята, як і належыць, загадзя, з стараннай прапрацоўкай дэталяў. За месяц да Новага году ўдзельнікі гэтага неафіцыйнага клюбу пачынаюць дасылаць на адрас арганізацыйнага камітэту тое, што павінна згарэць у агні. Тады ж арганізатары рассылаюць запрашэньні ўдзельнікам урачыстасьці.

Кожны ўдзельнік абавязаны прынесьці з сабою і пакласьці на агульны стол як мага болей ежы (яна спальваецца выключна ў нетрах страўнікаў падпалшчыкаў). Алькаголь строга забаронены. Арганізатары кніжнага вогнішча лічаць гэтае мерапрыемства занадта сур'ёзным дзействам, каб рабіць яго на п'яную галаву. Бо можна спаліць ня тое (ці ня тога), што трэба. Спаленьне кніг – вельмі дакладнае мастацтва і вымагае скрайняга самакантролю і каардынацыі рухаў, магчымых выключна ў цьвярозым выглядзе.

Сьвята пачынаецца ў 7-8 гадзінаў вечара перад самым Новым годам. Кожны ўдзельнік прапануе на конкурс прынесены для спаленьня экзэмпляр. Кнігі-ахвяры суправаджаюцца спэцыяльнымі цыдулкамі з тлумачэньнямі, дзе падаюцца прычыны, чаму яны заслугоўваюць такога несамавітага канца. Пасьля праводзіцца тайнае галасаваньне з апусканьнем у скрыню бюлетэняў, якія пасьля падліку галасоў урачыста спальваюцца разам з самой скрыняй. Кнігі-пераможцы абвяшчаюцца пры распаленым вогнішчы апоўначы.

Першы акт спаленьня адбываецца менавіта апоўначы, другі —праз дзьве гадзіны. На працягу гэтага прамежку часу ўдзельнікі ўрачыстасьці спаборнічаюць у конкурсах на абжэрлівасьць, найлепшую плётку, жарт, анэкдот, абразу і гуляюць у карты. Перш, чымся кінуць кнігу ў агонь, трэба прамовіць абвінаваўчы прысуд, у якім трэба аргумэнтавана выкласьці прычыну, зь якой кніга заслугоўвае агню. Адвакаты не прадугледжваюцца.

Уладзімер Баранчч

КУХНЯ

Чаму Леў Талстой ці Джэймс Джойс, пісьменьнікі першай велічыні, не атрымалі літаратурнай нобэлеўскай узнагароды? Бо ніколі не былі вылучаныя на яе!

Пасьля сьмерці абодвух мінула дастаткова шмат часу, каб атрымаць у Стакгольме адпаведныя тлумачэньні. Ня гледзячы на гэта, сьледапыты нобэлеўскіх скандалаў па-ранейшаму пішуць, што Талстой як пісьменьнік здабыў дастатковае прызнаньне чальцоў журы, толькі "лад ягонага жыцьця" выклікаў багата сумневаў. Сярод вялікіх прайгранцаў называюць таксама Альбэрта Маравія і Грэма Грына. Падобна, Грын цягам апошніх дзесяцёх гадоў свайго жыцьця быў на нобэлеўскай біржы пэўным кандыдатам – і памёр без узнагароды.

– Афіцыйна мне няможна ведаць, хто быў кандыдатам цягам апошніх 50 гадоў, а калі б усё ж ведаў, то мне няможна даваць гэтую інфармацыю, – прызнаўся доктар Міхал Брон, супрацоўнік Стакгольмскай Нобэлеўскай бібліятэкі. – Магу толькі сказаць, што канфлікт паміж Грынам і знаным пісьменьнікам Артурам Лундквістам, вельмі ўплывовым сябрам Акадэміі быў сакрэтам полішынэля.

Усе архіўныя матэрыялы, дачынныя нобэлеўскай узнагароды, падлягаюць 50-гадоваму "каранціну". Толькі пасьля гэтага Акадэмія можа, але не абавязаная, адкрыць да іх доступ. Рэглямэнт узнагароджаньня не дазваляе выдаваць ніякіх падрабязнасьцяў падрыхтоўчай працы, няможна нават адказваць на крытыку. Нобэлеўскія камітэты просяць таксама ўсіх людзей, што маюць права вылучаць кандыдатуры, захоўваць рэкамэндаванае прозьвішча ў таямніцы. Аднак многія расказваюць ня толькі сябрам, але й журналістам пра тое, каго вылучылі. Некаторыя з рэкамэндаваных, уведзеныя такім спосабам у прысеньне вечнай славы, упісваюць у свае візытоўкі –"Кандыдат на "Нобэля". Чальцы Акадэміі таксама не заўсёды захоўваюць таямніцу. Дзякуючы гэтаму, сродкі масавай інфармацыі ўсё часьцей уваходзяць у нобэлеўскую кухню, зазіраюць у камору і ў сьмецьцевае вядро. Тое, што знойдуць, бывае матэрыялам для інфармацыі, якую нідзе афіцыйна не ўдаецца пацьвердзіць, але ж дасягаецца эфэкт узбуджэньня грамадзкай думкі.

Эйнштэйн? Не тлуміце нам галавы!

Таму й "ведаюць усе", што ў сьпісе кандыдатаў на ўзнагароду міру апынуўся акурат перад пачаткам вайны Адольф Гітлер. Што сярод пялакаў вялікімі прайгранцамі былі Ежы Анджаеўскі і Яраслаў Івашкевіч. Што Жан-Поль Сартр, які ў 1964 годзе адмовіўся прыняць узнагароду, зьвярнуўся па яе на схіле жыцьця, зьбяднеўшы, але грошай не атрымаў. Насамрэч Сартр – адзіны, хто адмовіўся ад "Нобэля" з уласнае волі – з ідэйных матываў. Ці хацеў ён пазьней з празаічных прычынаў займець грошы, гэтага мы не даведаемся цягам яшчэ доўгіх гадоў, а можа, ніколі, калі такою будзе воля Швэдзкай акадэміі. Другім літаратарам, які не прыняў прэміі, быў Барыс Пастэрнак, але яму не дазволіла савецкая ўлада (1958 г.).

Нобэлеўская прэмія ўвесь час застаецца найпрэстыжнейшай узнагародаю, хоць не адзін ляўрэат аказаўся толькі сэзоннай зоркаю, а многія творцы з пазачасавымі літаратурнымі дасягненьнямі не былі ўганараваныя. Прыклад памянёных на пачатку Талстога і Джойса анэкдатычны, але слушны. Абодва ўжо пры жыцьці былі такімі славутасьцямі, што нікому не прыйшло ў галаву вылучыць іхныя кандыдатуры на нобэлеўскую ўзнагароду. Пазьней аднак шмат хто спэкуляваў на тым, чаму яны не атрымалі прэміяў.

Гісторыя нобэлеўскай узнагароды ня вольная ад кампрамэтацыйных памылак. Вядома, што геніям ня шчасьціць у сучасьнікаў, афэрысты ж вызначаюцца вялікім дарам угаворваньня. Таму Альбэрт Эйнштэйн са сваёй тэорыяй адноснасьці быў адпраўлены зь мілым ліхам: швэдзкія акадэмікі не паставіліся да яго сур'ёзна. Узнагароду з галіны фізыкі ён атрымаў толькі праз дзесяць гадоў (1921 г.) за адкрыцьцё фотаэлектрычнага эфэкту. За чатыры гады да Эйнштэйна (1917 г.) ляўрэатам у гэтай галіне стаў ангельскі фізык Чарльз Баркла. Прысуджа-

Згодна з тэстамэнтам Альфрэда Нобэля, узнагароды яго імя прысуджаюцца з 1901 году Швэдзкай акадэміяй у Стакгольме (у галіне літаратуры), Нобэлеўскім сходам інстытуту Каралінска (мэдыцына і фізіялёгія), Каралеўскай акадэміяй навук (фізыка і хімія) і Нарвэскім камітэтам Нобэля ў Осла (узнагарода міру). З 1969 году прысуджаецца таксама ўзнагарода ў галіне эканомікі, заснаваная Цэнтральным банкам Швэцыі ў памяць Альфрэда Нобэля. Рыхтуюць працэдуру і дбаюць пра адбор кандыдатаў выбраныя на тры гады Нобэлеўскія камітэты (па 5 чалавек), але пастановы аб прысуджэньні ўзнагароды прымаюць вышэйпамянёныя асяродкі ў поўным складзе. Увосень камітэты пасылаюць лісты асобам, якія маюць права вылучаць кандыдатаў (у галіне літаратуры гэта акадэмічныя прафэсары і прадстаўнікі нацыянальных зьвязаў пісьменьнікаў), прымаюць адказы, папярэдне адбіраюць вылучаных кандыдатаў. Вясною наступнага году яны даюць чальцам журы 5-6 кандыдатур і задаюць працу на лета – чытаньне твораў і жыцьцяпісаў, каб пасьля вакацыяў тыя былі гатовыя прымаць пастанову. Абвяшчэньне вэрдыктаў адбываецца ў кастрычніку.

Віслава Шымборска

Польская паэтка Віслава Шымборска (нар. у 1923 г.) — дзявятая ў сьвеце жанчына, уганараваная літаратурнаю ўзнагародаю Альфрэда Нобэля (1996 г.). Стварае рэфлексійную лірыку, якая засяроджаная вакол экзыстэнцыйных матываў і вызначаецца інтэлектуальнай вынаходлівасьцю й фармальнай віртуознасьцю. Будучы майстрам іроніі, лучыць у творчасьці горыч досьведу з жартаўлівай паблажлівасьцю. Пасьля кніжнага дэбюту ў 1952 г. выдала некалькі зборнікаў, сярод якіх тры найважнейшыя: "Вялікая лічба" (1976), "Людзі на мосьце" (1986), "Канец і пачатак" (1993). У 1991 годзе ў сэрыі "Паэзія народаў сьвету" выйшлі выбраныя творы Віславы Шымборскай па-беларуску ў перакладах Ніны Мацяш ("Сьвет, варты вяртаньня"). Ніжэй друкуюцца некалькі вершаў з пазьнейшае лірыкі леташняй нобэлеўскай ляўрэаткі..

АДЗЕНЬНЕ

Здымаеш, здымаем, здымаеце
плашчы, жакеты, пінжакі, блюзкі
з воўны, бавоўны, элянабавоўны,
штаны, спадніцы, шкарпэткі, бялізну,
вешаючы, кладучы, перакідаючы праз
сьпінкі крэслаў, крылы шырмаў;
пакуль што, кажа доктар, нічога страшнага,
папрашу адзецца, адпачыць, выехаць,
прымаць у выпадку, калі б, перад сном,
пасьля яды,
паказацца праз квартал, праз год,
праз паўтара;
бачыш, а ты думаў, а мы баяліся,
а ўсе дапускалі, а ён падазраваў;
пара ўжо завязваць, зашпільваць
дрыготкімі шчэ рукамі
шнуркі, кнопкі, "маланкі", спражкі,
раменьчыкі, гузікі, гальштукі, каўняры
і выцягаць з рукавоў, з сумачак, з кішэняў
скамечаны, у кропкі, палоскі, краскі, клеткі,
шалік,
прыдатнасьць якога прадоўжылася раптам.

КОТ У ПУСТОЙ ГАСПОДЗЕ

Сьмерць — яна не прыходзіць кату.
Бо што мае рабіць кот
у пустой гасподзе.
На сьцены драпацца.
Між мэбляю абціраццa.
Нічога тут быццам ня зьменена,
і ўсё ж папамяняна.
Быццам не перасунута,
і ўсё ж папарассоўвана.
І вечарамі лямпа ўжо ня сьвеціць.

Чуваць крокі на сходах,
але гэта ня тыя.
Рука, што рыбу кладзе на талерку,
таксама ня тая, што клала.

Нешта не пачынаецца тут
сваёй звычайнай парою.
Нешта ня дзеецца тут,
як павінна.
Нехта тут быў і быў,
пасьля зьнік раптоўна,
і ўпарта яго няма.

Шафы ўсе прагледжаныя.
Паліцы прабяжаныя.
Уціснулася пад дыван — праверыла.
Забарону нат парушыла
і раскідала паперы.

Што ж яшчэ зрабіць.
Спаць і чакаць.

Няхай ён толькі вернецца,
няхай пакажацца.
Ужо ж ён дазнаецца,
што так нельга з катом.
Памаленьку,
як бы зусім неахвотна,
кот будзе йсьці ў яго бок
на вельмі абражаных лапах.
І ніякіх скокаў, піскаў на пачатку.

ПРА СЬМЕРЦЬ БЕЗЬ ПЕРАБОЛЬШАНЬНЯЎ

Ня знаецца на жартах,
на зорках, на мастох,
на горным промысьле, на ткацтве,
на земляробстве
на будаваньні караблёў ды пячэньні пірагоў.

У нашыя размовы пра пляны на заўтра
ўстаўляе сваё апошняе слова
че на тэму.

Ня ўмее нат таго,
што наўпрост зьвязана зь яе прафэсіяй:
ані выкапаць магілы,
ані зьбіць труны,
ані прыбраць за сабою.

Занятая забіваньнем,
робіць гэта няздарна,
без сыстэмы й навыку.
Быццам на кожным з нас вучылася толькі.

Трыюмфы трыюмфамі,
але ж колькі няўдачаў,
нятрапных удараў
і спробаў, чыненых нанова!

Часамі не стае ёй сілы,
каб муху сапхнуць з паветра.

Зь не адным вусенем
прайграе гонку ў поўзаньні.

Усе тыя клубні, струкі,
вусікі, плаўнікі, дыхніцы,
шлюбныя пёры й зімовая поўсьць
сьведчаць пра недаборы
ў яе маруднай працы.

Злой волі недастаткова,
і нат помач нашая ў войнах і пераваротах —
гэта, як дасюль, замала.

Тахкаюць у яйках сэрцы.
Растуць шкілеты немаўлятаў.
Насеньне нажывае два першыя лісткі,
а часта й дрэвы высокія на гарызонце.

Той, хто сьцьвярджае пра яе ўсемагутнасьць,
сам — жывы довад,
што не ўсемагутная яна.

Няма такога жыцьця,
якое б хоць імгненьне
не было несьмяротным.

Сьмерць заўсёды позьніцца
на гэтае мгненьне.

Дарма торгае клямку
нябачных дзьвярэй.
Таго, што ты пасьпеў,
забраць у цябе ня можа.

НІШТО НЕ ДАРАВАНА

Нішто не даравана, пазычана ўсё.
Я па вушы ў даўгох.
Давядзецца сабой заплаціць за сябе,
за жыцьцё аддаць жыцьцё.

Так ужо ўладжана,
што сэрца падлягае вяртаньню
і печані падлягаюць,
і кожны палец паасобку.

Запозна разрываць дагавор.
Даўгі спагнаныя будуць
разам са скурай.

Хаджу па сьвеце
ў натоўпе іншых даўжбітоў.
Адны мусяць
аплаціць свае крылы.
Другія — хочуць ня хочуць
разьлічацца за лісьце.

З боку "Вінен" —
кожная тканка ў нас:
ніводнай вейкі ці жылкі,
каб захаваць назаўжды.

Сьпіс вельмі дакладны,
і, здаецца,
мы застаемся зь нічым.

Не магу прыпомніць,
дзе, калі й нашто
я дазволіла, каб адкрылі мне
гэты рахунак.

Пратэст супраць яго
называецца душою.
І гэта адзінае,
чаго няма ў сьпісе.

ПЕРАКЛАЎ З ПОЛЬСКАЙ ЮРАСЬ БУШЛЯКОЎ

ХТО І ЯК РЫХТУЕ НОБЭЛЕЎСКУЮ ЎЗНАГАРОДУ?

ПАДЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

ная яму ўзнагарода за адкрыцьцё "выпраменьваньня J" — вялікая пляма ў гісторыі нобэлеўскай справы: такога выпраменьваньня папросту ня йснуе...

Аднак найцяжэйшае заданьне стаіць перад камітэтам узнагароды міру: на яго рахунку найбольшая ў гісторыі нобэлеўскай прэміі колькасьць спрэчных вэрдыктаў. Ацэньваньне палітыкаў з сучаснай пэрспэктывы бывае падманлівым. Жорсткай гульні за ўладу можна надаць выгляд "ахвяраваньня для чалавецтва", а сярод людзей, якія кладуць канец пагрозьлівым канфліктам, нярэдка можна спаткаць вінаватых у іх. Заўжды таксама былі выйграныя бітвы, але прайграныя войны. Найбольшым схібеньнем у гісторыі гэтай узнагароды лічыцца прысуджэньне яе ў 1973 годзе Генры Кісэнджэру і Ле Дук Тхо за шматабяцальныя перамовы ў справе міру ў Віетнаме. На жаль, нобэлеўская ўзнагарода не ўвянчала працы: перамоўцы неўзабаве дазналі паразу.

Старыя, катэгарычныя, сварлівыя?

"Нобэлеўская ўзнагарода старэе!" — вернуць насы апошнім часам крытыкі, спасылаючыся ня толькі на ўзрост (па малым часе, у 2001 г., ёй споўніцца 100 гадоў), але й на такія тыпова старэчыя нядужаньні, як акасьцянеласьць і канфліктавасьць чальцоў журы, а таксама на адарванасьць самой ідэі ўзнагароды ад сучаснасьці. Альфрэд Нобэль верыў, што вялікія індывідуальнасьці ў навуцы, грамадзкім жыцьці і літаратуры зробяць сьвет лепшым. Хацеў пазбавіць геніяў матэрыяльных турботаў, каб маглі свабодна тварыць. Прыгожа, але... За сто гадоў, якія ў сьнежні мінулі пасьля яго сьмерці, сусьветныя і лякальныя войны паглынулі мільёны жыцьцяў. Літаратура ня стала ўлюбёнай настаўніцаю пазытыўных узораў для масавага пераймальня, а прагрэс у навуцы перастаў быць клопатам ахвярных адзінак, што экспэрымэнтуюць у малых майстроўнях. Вялікія адкрыцьці робяцца калектывамі, якія выкарыстоўваюць агромністы капітал і вельмі дарагое абсталяваньне, засяроджанае ў найбольшых лябараторыях.

Сьвет, якім яго ўяўляў Нобэль, ня йснуе, але адпаведныя яму крытэрыі прысуджэньня ўзнагароды засталіся. Не зьмяніўся цырыманіял урачыстага ўручэньня, які зласьліўцы называюць апэрэткавым — заўсёды 10 сьнежня, ва ўгодкі сьмерці заснавальніка. Падобна, калі літаратурную ўзнагароду атрымаў Аляксандар Салжаніцын (1970 г.), найбольшай праблемаю было схіліць яго напрануць абавязковы фрак. Аднак перакананаць не ўдалося — пісьменьнік застаўся ў гэнісцы, якую цырыманіяльны майстар замаскаваў яго густой барадою.

Летась узнагарода складала 7,4 мільёны швэдзкіх каронаў, або 1,12 мільёна даляраў у кожнай з шасьцёх галінаў. Капітал, прызначаны на яе ў тэстамэнце Альфрэда Нобэля, ня быў растрачаны, яго вартасьць роўная цяпер блізу 1 мільярду швэдзкіх каронаў. Узнагароду выплачваюць з працэнтаў ад выгадных укладаньняў (галоўным чынам, у каштоўныя паперы і нерухомасьць), якія робіць фонд, заснаваны у 1900 годзе для рэалізацыі тэстамэнту.

Фонд перабывае ў спакоі. А тым часам няма спакою ў колах, адказных за прысуджэньне ўзнагародаў у галінах, што найбольш моцна хвалююць грамадзкую думку (літаратура, міратворчасьць). Швэдзкая прэса, а ўсьлед за ёй між іншых італьянская, шмат пісалі апошнім часам пра скандальныя нібыта канфлікты ў колах Швэдзкай акадэміі, якая прысуджае літаратурную прэмію. Чуліся шматлікія В навачаньні ў адрас Стурэ Алэна, сталага сакратара Акадэміі, які звычайна абвяшчае прозьвішча ляўрэата. Зь іх паўставаў вобраз катэгарычнага старога інтрыгана, што ўзурпаваў у Акадэміі абсалютную ўладу. Алэн мае 68 гадоў (ён далёка не найстарэйшы, а згодна са статутам, мандат страчвае сілу з моманту сьмерці ўладальніка). Назіральнікі сьцьвярджаюць, што чалецтва ў Акадэміі аўтаматычна гарантуе даўгавечнасьць — яе чальцы жывуць у сярэднім 80-90 гадоў. Найстарэйшы цяпер — 92-гадовы паэт доктар Яганэс Эдфэлт, наймалодзейшая — таксама паэтка, 43-гадовая Катарына Фростэнсан, выбраная ў Акадэмію чатыры гады таму ў атмасфэры сэнсацыі (надта маладая і надта прыгожая).

Палітычна правільны кандыдат

Тое, што сродкі масавай інфармацыі называюць скандаламі, у колах нобэлеўскай кухні ацэньваецца як непазьбежныя нутраныя канфлікты, якія ня шкодзяць ані Акадэміі, ані правільнасьці яе пастановы. Апошняга разу толькі 14 са статутнага ліку 18-ці акадэмікаў бралі ўдзел у прысуджэньні літаратурнай узнагароды. Раскол у гэтым асяродку адбыўся ў сувязі з канфліктам вакол справы Салмана Рушдзі. Калі Хамэйні абвясьціў сьмяротны прысуд для пісьменьніка, швэдзкія акадэмікі пастанавілі большынёю галасоў, што кожны зь іх павінен пратэставаць індывідуальна або як сябра творчага зьвязу, але не ад імя Акадэміі, якая ніколі ў сваёй гісторыі не выступала ў палітычных справах. Не згадзіліся з гэтым і адышлі Ларс Гілэнстэн і Кэрсьцін Экман. Пазьней, матывуючы свае дзеяньні непрыхільнасьцю да празьмерна цікаўных журналістаў, адышоў паэт Вэмэр Аспэнстром, а ў студзені летась прыпыніў удзел у працы Акадэміі Кнут Агнлунд.

— Гэта сапраўдная страта, — сьцьвярджае Міхал Брон, — бо Агнлунд — вялікі знаўца раманскай і лацінаамэрыканскай літаратуры. Трэба аднак усьведамляць псыхічныя нагрузкі, пад якія падпадаюць тыя людзі. Маюць выбраць найлепшага пісьменьніка, але што гэта значыць? Як сумясьціць розныя крытэрыі і чаканьні? Каго б ні выбралі, заўсёды будуць бітыя прыхільнікамі іншых кандыдатаў!

Апошнімі гадамі чальцоў журы ня столькі б'юць, колькі пашчыпваюць і высьмейваюць за адступаньне ад існасьцевых крытэраў у імя прынцыпу палітычнай правільнасьці. Папікаюць ім, што вышэй за талент і даробак ставяць яны расавую, моўную і геапалітычную раўнавагу. Ці гэта кепска? Перад II сусьветнай вайной нобэлеўскіх журыстаў дакаралі за расавую і нацыянальную старроннасьць. Там, дзе дзеляцца слава і вялікія грошы, кожнае рашэньне здаецца падазроным.

Polityka

ПЕРАКЛАЎ З ПОЛЬСКАЙ Ю.Б.

Найбольш нобэлеўскіх узнагародаў маюць амэрыканцы — звыш 200. Наступныя месцы ў нобэлеўскіх статыстыках займаюць брытанцы, немцы і французы. Чым бліжэй да сёньняшніх дзён, тым большая разнастайнасьць краінаў паходжаньня ляўрэатаў прэміяў за літаратуру і міратворчасьць. Цягам апошніх 20 гадоў, да прыкладу, літаратурная нобэлеўская ўзнагарода адпраўлялася ў ЗША (4 разы (уключаючы Мілаша)), Гішпанію (2), Мэксыку (2), Польшчу (2 (Мілаш — Польшча/ЗША)), Грэцыю, Баўгарыю, Англію, Чэхаславаччыну, Францыю, Нігерыю, Расею, Эгіпет, ПАР, Японію і Ірляндыю.

Лявон Вольскі

ТАБЕ ГАМОН!

Апавяданьн

Сьцяпан Пятровіч працуе журналістам. Ён робіць рэпартажы, актуальныя інтэвію ды аналітычныя перадачы на тэлевізіі. Яшчэ ён працуе ў газэтах, піша камэнтары да розных падзеяў. Сьцяпан Пятровіч — ідэалягічны жуналіст. Калісьці даўно ён займаў даволі высокую пасаду ў партыйнай арганізацыі журналістаў. Тыя часы незваротна мінулі. Але Сьцяпан Пятровіч ніколі не сварыўся з уладамі. Пэўны час ён займаўся нарысамі нораваў, рабіў праблемныя матэрыялы. Цяпер жа, калі, нарэшце, усталявалася моцная ўлада, Сьцяпан Пятровіч стаўся рупарам гэтае ўлады. Сьцяпан Пятровіч мае вялікую кватэру (нядаўна зрабіў рамонт). Сьцяпан Пятровіч мае машыну. Сьцяпан Пятровіч мае жонку й сына.

Z. мае сярэдняга памеру балён з чырвонай фарбай. Z. выходзіць на вуліцу. Неўзабаве ён падыходзіць да доўгага бэтоннага паркану й піша на ягонай шэрай шурпатай паверхні антыўрадавы лёзунг. Потым спрытна хавае балёнчык з фарбай у кайстру ды дварамі й завулкамі. (ён добра ведае гэты раён, даўно тут жыве) дабіраецца да свайго пад'езду. Чырвоны лёзунг зьзяе на шэрым паркане дзень, другі, пасьля чаго яго замалёўваюць. Z. баіцца міліцыі. Ён зьдзіўлены, што яна дагэтуль не адрэагавала на ягоныя дзеяньні. Кожнага разу ён доўга ходзіць ля паркану й піша толькі тады, калі канчаткова ўпэўніваецца, што паблізу нікога няма. Z. нідзе не працуе, бо лічыць амаральным супрацоўніцтва з гэтымі ўладамі, а камэрцыяй займацца ня любіць і ня ўмее.

Сьцяпану Пятровічу за 40. На тэлецэнтар пастаянна прыбывае маладое папаўненьне, і Сьцяпан Пятровіч тлумачыць ім: некаторыя гавораць, што мы з вамі займаемся несумленнаю справай. Гэта ня так. Мы працуем на дзяржаву. Дзяржава нам плаціць грошы. Што ж тут несумленнага? Уявіце сабе: вы рабочы на заводзе. Вам майстар прыносіць чарцёж і гаворыць: зрабі такую дэталь. вы ж ня будзеце зь ім спрачацца й казаць, што чарцёж няправільны, што гэтыя дэталі непатрэбныя, і трэба вырабляць зусім іншыя. Вось так і ў нас. Мы — людзі паднявольныя.

Сьцяпан Пятровіч вяртаецца дадому позна. Час ад часу ён сустракае суседа па пляцоўцы.

— Добры вечар, Сьцяпан Пятровіч, — заўсёды ветліва гаворыць сусед.

— Добры, добры, — бадзёра адказвае журналіст.

Мастак жыве на тое, што малюе першых асобаў дзяржавы. Але ён малюе іх з пэўнай фантазіяй: на кані, за стырном трактара, у вайсковай форме, у выглядзе касманаўтаў. Раней бізнэсмэны вельмі добра куплялі гэтыя сьмешныя партрэты. Але цяпер тавар пайшоў кепска: айчынныя заможныя людзі баяцца купляць гэтае небясьпечнае мастацтва. (Які ж тут крымінал?! — абураецца мастак. — Гэта ж проста фантастычны рэалізм!) Толькі зрэдку якісь замежны аматар мясцовых сувэніраў купляе ў мастака экзатычны твор. Мастак ня ўмее гандляваць і заўжды заніжае кошт.

Ідучы зранку на працу, Сьцяпан Пятровіч заўжды забірае з паштовае скрыні ранішнія газэты. Гэтым разам ён таксама адчыняе скрыню. Разам з газэтамі Сьцяпан Пятровіч выцягвае са скрыні белую капэрту. Потым ён выходзіць на двор, заводзіць машыну й едзе на працу.

Мастак ідзе па вуліцы й думае: зьяжджаць ці заставацца? Калі зьяжджаць, дык будучыня выдае на нейкі туман. Па-першае, мастак ня ведае замежных моваў. Па-другое, калі нават зборльшага вывучыць ангельскую ці францускую, дык на якую працу ён можа разьлічваць? Грузчык? Прыбіральшчык? Мастак — адначасова чалавек лянівы ды ўпарты і хоча займацца толькі тым, чым яму падабаецца...

А калі заставацца тут? Праблема з мовай адпадае. Праблема з працай застаецца тая ж. Грузчык, прыбіральшчык, вартаўнік... Гэтыя прафэсіі мастаку не падабаюцца, а на нешта больш высакароднае разьлічваць не выпадае.

Сьцяпан Пятровіч за працоўным сталом чытае прэсу. Нічога экстраардынарнага. У Сярэдняй Азіі — бясконцая вайна. У Расеі — вайна кампраматаў. На роднай зямельцы ўсё як мае быць. На сяле — пэўныя посьпехі. Эканоміка падымаецца з руінаў. Раптам сярод газэтаў Сьцяпану Пятровічу трапляе белы прастакутнік — капэрта. Ён ускрывае яе і чытае:

ТЫ ПАСКУДА Й МЯРЗОТНІК. САМ ВЕДАЕШ ПРА ГЭТА І ЎСЁ АДНО ПАСКУДЗІШ. РЫХТУЙСЯ ДА САМАГА ГОРШАГА.

Сьцяпан Пятровіч азіраецца: ці не прачытаў хтосьці з супрацоўнікаў гэтыя радкі праз ягонае плячо? Не. Абышлося. Сьцяпан Пятровіч кладзе аркушык у кішэню. Разглядае капэрту — на ёй няма нічога. Ані адраса, ані пячаткі, ані імя адрасата. Ніякае выявы, ніводнага надпісу — абсалютна белая капэрта. Так, — думае Сьцяпан Пятровіч і адчувае ўнутры мярзотны халадок, — гэты гад ведае, дзе я жыву.

Сьцяпан Пятровіч бярэ інтэрвію ў чарговага старшыні калгасу. Старшыня гаворыць блытана, ужывае шмат ненарматыўнае лексыкі (ад хваляваньня). Але Сьцяпан Пятровіч вопытны журналіст, ён выража што трэба, што трэба пакіне, і ўсё будзе як належыць. З дваццаці хвілінаў размовы застануцца тры. Вось толькі б пысу табе падгрымаваць, — думае Сьцяпан Пятровіч. — Ды гэты страшэнны шэранькі гарнітурчык замяніць. А гальштук, божа ж мой, што за гальштук!

На мантажы Сьцяпан Пятровіч дастае з кішэні свае нататкі ды зноўку натыкаецца на мярзотны ліст. Брыдкая халодная хваля зноў нахлынае на журналіста. Ня думаць пра гэта! — загадвае ён сабе й працягвае мантаж.

Z. упэўніваецца, што ля паркану нікога няма. Час позьні, ліхтар далёка. Каму ахвота хадзіць па цёмнай вуліцы ў позьні час? А ўраньні ўсе пабачаць чарговы скандальны надпіс на бэтоне. Z. адчувае сябе барацьбітом Супраціву, мужным і бескампрамісным чалавекам. Гэтага адчуваньня яму вельмі бракуе ў шэрым дзённым жыцьці. З балёну струменіць чырвоная фарба, і Z. з асалодаю ўдыхае атрутны пах ацэтону.

Сьцяпан Пятровіч падымаецца ў пад'езьдзе па лесьвіцы. Спачатку ён сустракае бабу Франю. Яна зноўку нападпіткy. Просіць пазычыць грошай. Невялікую суму. Сьцяпан Пятровіч пазычае ёй, хоць і ведае, што гэтыя грошы ня вернуцца.

Потым журналіст сустракаецца з суседам.

— Добры вечар, Сьцяпан Пятровіч, — зычліва кажа сусед.

— Добры, добры, — бадзёра адказвае Сьцяпан Пятровіч. Хоць... якая там бадзёрасьць пасьля цяжкага вечаровага мантажу ды гэтых... гэтых мярзотных цыдулак.

Здымак Міхала Баразны

Андрэй Дынько

ІФІГЕНІЯ

Іфігенія, як і ўсе, калекцыянавала. Яна калекцыянавала тых, хто выбіраў сабе вайну, хто ехаў на вайну. Артур стаў бы файным экспанатам у яе калекцыі. На Ўсходзе Артура лічаць шчасьліўцам: атрымаў нідэрляндзкае падданства, служыў у Пэрсідзкай затоцы пад час вайны. Яны ня ведаюць, што Артур быў ужо на трох войнах і забіраўся на чацьвертую, прычым у трэці раз на партызанскую, у пэўным сэнсе безнадзейную.

Калі чалавек едзе на вайну, ён ужо нейкі непаўнавартасны, інакшы, абсечаны. Нібы зь ягоных, прыпусьцім, ста абліччаў захавалася дваццацьтрыццаць і баста. Яго прасьцей клясыфікаваць і каталягізаваць. Ён зьмесьціцца ўсяго ў некалькі столак. І ў той жа час ён у такія хвіліны шыкоўны, надзвычай шыкоўны. Іфігенія не баялася людзей, што выбіраюць вайну. Па працы яна заўсёды мела ля сябе кольт з глушыльнікам у форме дэадаранта. Яна прафэсійна нічога не баялася.

Упершыню Іфігенія магла б сустрэць Артура ў Менску гады з два назад, але ў той дзень здарыўся галалёд, яна лясьнулася адразу ля пад'езду і вярнулася дахаты. Да таго ж, тады яна думала, што захварэла на пранцы, і праклінала і ўвесь гэты Ўсход Эўропы, і сябе, што выбрала такую прафэсію.

Паўтары гады назад Іфігенія патэлефанавала на брусэльскую кватэру, і манерны голас адказаў ёй, што "Артур чакае вас а сёмай у Люксэмбургу ля помніка каралеве Брыгіце". У Вялікім герцагстве знайшоўся толькі манумэнт прынцэсе, і не Брыгіце, а Шарлоце. Брыгіта, калі ён меў на ўвазе Брыгіту Швэдзкую, была занадта экспансіўная, каб ёй ставілі помнікі яшчэ й не на бацькаўшчыне. Ня самы ветлівы спосаб адмовы – ганяць чалавека ў Люксэмбург, – падумала Іфігенія тады.

З год назад не адбылося іх спатканьне ў Амстэрдаме. Яны меліся сустрэцца ў порце. У амстэрдамскім порце, як вядома з клясыкі францускай эстрады, маракі плачуць і танцуюць, праціраючы пуза дамам сваім пузам. Фу, як брыдка ў перакладзе... Хадзіце сюды, мілорд, прысядзьце за мой стол, я партовая дзеўка, я вулічны цень... Як брыдка ў перакладзе... Пуза марака па-картасараўску... Асацыяцыі якраз з Артурам, улічваючы ягоныя густы і мінулае.

Тады, у порце, яны не спаткаліся, але напэўна, Іфігенія бачыла яго. Апоўначы Артур патэлефанаваў і папрасіў прабачэньня за тое, што ня змог прыйсьці. Маўляў, ён зьбіў нейкі ровар за пятнаццаць хвілінаў да ўмоўленага часу і адвозіў кагосьці ў шпіталь. Мусіць, Артур і тады маніў. У порце яна злавіла позірк маладога чалавека, апранутага зь вясковай элегантнасьцю, у той момант, калі запусьціла руку сабе пад швэдар. Ён глядзеў на яе зь непратэстанцкай зацікаўленасьцю. Хлопец надта адрозьніваўся ад усіх гэтых амстэрдамцаў з тварамі колеру штучнага раю і марыхуанавымі мяшкамі пад вачыма, ад усіх гэтых білятэрак Райксмузіума і паліцэйскіх на воперах. І крочыў ён па-матроску. Лягічны аналіз прыводзіў да высновы, што гэта быў Артур.

Сарвалася яшчэ спатканьне ў Будапэшце, ля цырульні на вакзале Келеці. Іфігенія паўгадзіны прастаяла, як дурная, гледзячы на фрызуры а-ля Джо Дасэн у вітрыне цырульні. Але яна ніколі ня крыўдзілася на патэнцыйных экспанатаў сваёй калекцыі.

Яшчэ за Савецкім Саюзам Артур адслужыў на Паўночным флёце. Падарожнічаючы па Ўкраіне, Іфігенія аднойчы піла зь дзядзькам, што быў у войску ў марской пяхоце ў Кранштаце. Каб схадзіць у самаволку, ён даплыў з Кранштату да Пецяргофу, трымаючы форму высока ў адной руцэ, каб не запырскаць. Гэтага ўкраінца засадзілі на гаўптвахту, але зараз жа паднялі ў чыне. Іфігенія ўяўляла сабе Артура крыху падобным да гэтага дзядзькі.

У Брусэлі Артур жыў у прыемным квартале: як ісьці ад плошчы Чэрчыля ўніз да расейскай амбасады – у доме каханка ягонай каханкі. Іфігенія лёгка магла б высачыць Артура, убачыць, але яна ўзяла сабе за правіла: не карыстацца прафэсійнымі прыёмамі ў прыватным жыцьці. Інакшай было б не жыцьцё – кашмар. Паўгады назад Іфігенія зноў патэлефанавала на брусэльскую кватэру. Ізноў ёй адказваў манерны голас... А, гэта вы... Артур прасіў перадаць вам, што ён усё ў жыцьці даручае волі фартуны: калі вы пазнаеце адзін аднаго ў наўтопе на карнавале ў Бэншы –добра... Ну што вы, зусім ня ў стозе сена... Проста ён ужо дамовіўся са сваімі сябрамі. Яны ўжо там, у Бэншы, п'юць піва...

Можаце лічыць Іфігенію дурной, але яна паехала нават у Бэнш. Яна ведала з досьведу калекцыянэра, што чалавека, які вырашыў выправіцца на вайну, лёгка ідэнтыфікаваць паводле лініі вуснаў. А Артур якраз тады ад'язджаў у Курдыстан.

Цяпер пытаньні. Пытаньне першае: хто на карнавале трапіў ёй у правае вока памаранцам? Хто стаяў глыбока ў натоўпе, адкуль прыляцеў памаранец?

І вось сёньня Іфігенія зноў затэлефанавала. На гэты раз яны дамовіліся сустрэцца ў гэты ж дзень роўна праз год (альбо роўна праз два тыдні пасьля таго, як усемагутная Амэрыка прызнае незалежнасьць Чачэніі, не чакаючы года). Месца спатканьня – таварна "Minsk" на Вандэркіндэрэстраат, а дзявятай. Артур будзе ў шэрым, Іфігенія – з ружай. А сёньня ён нібыта ляціць у бок Чачэніі.

Ён не загіне, але ня прыйдзе, – паківала галавой Іфігенія.

Пытаньне другое: што за "Сааб" ехаў сьледам за Іфігеніяй ужо васямнаццаць хвілінаў? Чорны, нумары флярэнтыйскія, за рулём бляндынка зь

Сьцяпан Пятровіч прыехаў у сталіцу зь невялікага правінцыйнага гарадка. Царква, касьцёл, дом культуры, унівэрмаг, дзьве крамы — вось і ўсе задавальненьні. Сьцяпан Пятровіч добра вучыўся й пасьля школы паступіў на журфак. Яшчэ студэнтам ён пачаў працаваць у газэтах. Потым неяк сама сабою падвярнулася тэлевізія. І паехала, і паехала...

Сьцяпан Пятровіч трымае ў руцэ аркушык. На аркушыку надпіс: ТАБЕ ГАМОН! Сьцяпан Пятровіч думае: ці заяўляць у міліцыю? Можа, гэта недарэчныя жарты? Але чые? Супрацоўнікаў? Немагчыма. Супрацоўнікі — сур'ёзныя, заклапочаныя людзі. Значыцца, гэта нейкі сапраўдны зламысьнік. Нейкі тэрарыст. Значыцца, трэба заяўляць. А тут яшчэ жонка з ідыёцкімі пытаньнямі: што на працы, што на працы? Сьцяпан Пятровіч уключае тэлевізар і глядзіць свой сюжэт са старшынём калгасу. Жонка таксама падыходзіць, яна любіць глядзець мужавы матэрыялы. Сын, 19-гадовы бэйбус, спыняецца ў дзьвярах, каб таксама паглядзець. Раптам Сьцяпана Пятровіча нібыта працінае электрычнасьцю: у чыставы матэрыял невядомым чынам закраліся два словы бруднае старшынёвае лаянкі. Хоць старшыня выкарыстоўваў гэтыя словы "для зьвязкі словаў" і прагаворваў іх даволі невыразна, усе гледачы, відаць, іх пачулі. Прынамсі, сын мярзотна захіхікаў і пайшоў у свой пакой. ЯК ГЭТА МАГЛО ЗДАРЫЦЦА? Усё ж было адгледжана! Ніколі ў жыцьці не было гэткіх ляпаў!

Сьцяпан Пятровіч раіцца з Галяй, даволі маладой жанчынай. Яны сядзяць у галінай кватэры, у гасьцёўні. Сьцяпан Пятровіч распавядае Галі пра свае апошнія беды — пра пагрозы, пра эфірны ляп — пра ўсё. Галя раіць журналісту заявіць, усё ж, у міліцыю. Сьцяпан Пятровіч кажа, што пакуль пачакае. Час даволі позьні, трэба схаць дадому. Але перад ад'ездам Сьцяпан Пятровіч кахаецца з маладой яшчэ жанчынай Галяй. Кахаецца адчайна, нібыта ў апошні раз.

Раніцай разам з прэсай Сьцяпан Пятровіч атрымлівае чарговую цыдулку: ЧАКАЙ. ФІНАЛ БЛІЗКІ. ТАБЕ ГАМОН. Сьцяпан Пятровіч прыяжджае на працу, дзе яго адразу выклікаюць да шэфа. Шэф жорстка й мацерна выгаворвае яму за ляп у эфіры, які абурыў ці насьмяшыў палову краіны. Сьцяпан Пятровіч тлумачыць шэфу, што ўсё гэта з-за пагрозаў, якія ён атрымлівае штодня. ДЫК ЧАГО ТЫ НЕ ЗАЯВІЎ У ОРГАНЫ?! — абураецца шэф. Ён сам выклікае міліцыянта, але ўсё адно Сьцяпан Пятровіч атрымлівае строгую вымову. Праца ёсьць праца.

Дома Сьцяпана Пятровіча чакае чарговы перагрус: жонка даведалася пра йснаваньне Галі. З ананімнага тэлефанаваньня. Сьцяпан Пятровіч крычыць, што гэта няпраўда, гэта нейкія інтрыгі зайздросьнікаў. Але жонка дастае з патаемнае шуфляды лісты. Тыя лісты, што Галя пісала Сьцяпану Пятровічу з Крыму летась. Як яна знайшла гэтую шуфляду?! Сьцяпан Пятровіч клянецца, што гэта памылка, гэта ніколі не паўторыцца. Жонка кажа: "Калі паўторыцца, я пайду да твайго кіраўніцтва!" Сьцяпан Пятровіч ніякавее.

Z. азіраецца. Быццам бы нікога. Дзеля поўнае ўпэўненасьці Z. два разы праходзіць уздоўж усяго паркану. Нікога. Як толькі Z. піша першую літару, нехта навальваецца на яго. ЁСЬЦЬ! —крычыць нехта. — УЗЯЛІ! Наручнікі халодна пабліскваюць у месяцовым сьвятле. Z. атрымлівае ў твар, падае сьпінаю на асфальт. ПАСКУДА! ТЭРАРЫСТ Х..Ў! — чуе ён і атрымлівае каваным ботам пад дых.

Сьцяпан Пятровіч адчыняе дзьверы свае кватэры, каб даведацца, што там за крыкі й шум на пляцоўцы. Тры міліцыянты выводзяць суседа Сьцяпана Пятровіча з суседавай кватэры. Той малады чалавек, што так культурна вітаўся са Сьцяпанам Пятровічам, моцна зьбіты, скрываўлены. АКАЗВАЎ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ, —тлумачыць лейтэнант. — НА СЬЦЕНАХ РОЗНУЮ БРЫДОТУ ПІСАЎ. ТЭРАРЫСТ. ТУТ ЖА, НЕДАЛЁКА. НА ПАРКАНЕ. НУ, ВЫ Ж ВЕДАЕЦЕ ГЭТЫ ПАРКАН?

— Ведаю, — зьбянтэжана азываецца журналіст.

Праз два дні сусед Сьцяпана Пятровіча, ён жа Z., на сьледзтве прызнаўся ў тым, што гэта ён кідаў у паштовую скрыню вядомага журналіста пагрозьлівыя лісты. "ТАБЕ ГАМОН" — узгадаў Сьцяпан Пятровіч. НЯ МНЕ ГАМОН, ТАБЕ ГАМОН, ДАРАЖЭНЬКІ СУСЕДЗЕ, —усьміхаецца вопытны журналіст.

Мінаюць яшчэ два дні. Сьцяпан Пятровіч жыве спакойна, як раней, калі не лічыць лёгкае канфрантацыі з жонкай. Хоць гэтая канфрантацыя паступова вычухаецца (ад Галі давялося адмовіцца).

Сын Сьцяпана Пятровіча, 19-гадовы бэйбус, скончыў мастацкую вучэльню. Ён здымае майстэрню ў рабочым раёне. Адзін кут майстэрні загрувашчаны партрэтамі кіраўнікоў дзяржавы. Кіраўнікі на конях, за стырном трактара, у вобразе касманаўтаў... Сын Сьцяпана Пятровіча ўключае маленькі пераносны тэлевізар і глядзіць навіны. Потым бярэ са стала аркуш паперы, аловак і роўнымі друкаванымі літарамі піша: ТАБЕ ГАМОН!

Занатоўк эгаіста

Адам Глёбус

ЛАКУНЫ Ў МАІХ СНАХ

Нагадаю, лакуны — страты ў тэксьце. Яны вабяць таемнасьцю, незваротнасьцю, магчымасьцю бясконцых варыяцыяў і цемраю. Чытаеш і правальваесься ў пельку... Знакі адсутнічаюць. Лёгікі няма. Сэнс не зьўляецца, не праяўляецца, не акрэсьліваецца...

"Калі..., каб (?) змагацца... калі (?) ты... мне, волат будзе забіты. Калі ты пабачыш... глядзі на кракадзіла". Фрагмэнт з тэксту на папірусе "Царэвічава наканаваньне" часоў Новага царства, якое існавала ў першым тысячагодзьдзі да нашае эры. Падобнымі лакунамі, абсурдамі, алягічнасьцямі перапоўненыя мае сны.

Бачыўся касьцёл: велізарны, змрочны, недаадрэстаўраваны. Алтар захіналі рыштаваньні. Хто намаляваны на алтарнай сьцяне. Ня бачна. Хрыстос? Дзева Марыя? Бог-бацька?

Той ня Бог, хто нарадзіўся на нашых вачах... Думка Савініа. Як яна апынулася ў сьне?

Ксёндз у залацістым арнаце ходзіць па цэнтральным нэфе як непрыкаяны. Сяляне ў зімовых адзежах сноўдаюць між калёнаў, шукаюць калядныя падарункі. Я з дачкою, Ядзяю. Ёй — тры гады, хоць у сапраўднасьці — трынаццаць. Па вінтавой лесьвіцы ўздымаемся на хоры. Крэсла арганіста пустое. Шолахі. Уздыхі. Шоргат падэшваў. Водгульле крокаў. На падлозе валяюцца пустыя мяхі. "Вам не хапіла падарункаў," — у жанчыны хваравіты твар. У шэрых вачах — спачуваньне. Спазьніліся. На галаве ў яе пуховая хустка. Ёй цёпла. У яе ёсьць падарунак з цукеркамі. Яна — манашка, на баку гаспадара. Набліжаная. Бяскроўная. Белая, як аплатка. Нам халодна... Мне... Лакуна — прагал, адсутнасьць існасьці. Пустэльня. Ноч. Гарачыня. Дарога ў гарах (?).

"І вось калі асьвяцілася зямля і наступіў другі дзень, прыйшоў..." Зноў з "наканаваньня..."

Процьма пабітых аўтамабіляў. У яркіх жоўтых, чырвоных, блакітных, пакарабачаных машынах сьцякаюць крывёю трупы шафёраў. На ўзбочыне гудзе натоўп. Пасярэдзіне гармідару ўзвышаецца паліцыянт у бурачковай форме. Ён спрабуе супакоіць прысутных выкрыкамі і ўзмахамі доўгіх рук. Абыходжу людзей, машыны, нябожчыкаў і бачу бандыта. Ён сядзіць на мосьце, што навісае над трасаю і творыць аварыі. Прадзіраюся да паліцыянта і спрабую растлумачыць прычыну аварыяў: пра мост, пра бандыта. Не даганяе. Ніхто навокал не разумее ніводнага слова. Трапляю ў пастку чарговай лакуны. Зрываю з паліцыянта фуражку і кідаюся ў бок моста. Бягу. Бандыта няма. Зьнік. Прапаў. Уцёк. Натоўп на чале з даўганогім паліцыянтам набліжаецца. Варожа рыпіць мост. Ён стары, збудаваны з круглых смаляных бярвеньняў. Пад ім на вяроўках пагойдваюцца мяхі, такія ж ляжалі ў касьцёле на хорах...

Ківач Фуко набыў бы сакральную значнасьць, каб замест груза разгойдваўся труп самазабойцы... Зь якога тэксту сказ? Няма калі высьвятляць.

Мяхі разгойдваюцца. Асьцярожна падыходжу. Зь мяха выдзіраецца бандыт. У калматай барадзе разяўляецца пашча з гнілымі ікламі. Жахаюся...

Сон перарываецца. Разьвіднела. Мора ціхае. Неба ў ружовых пёрах воблачнага фламінга. Рана. Можна спаць і спаць. Да сьняданка больш за тры гадзіны.

"Калі разьвіднела рана раніцою, тады..." — пачыналі старажытныя эгіпцяне, а я вярнуўся ў ложак, каб зноў заснуць і бачыць ці ня бачыць (як пашанцуе) сны...

Менск. Цэнтральны ўнівэрсам. П'ю каву. Падыходзіць мулат Эрык. Бацька ў яго кубінскі мурын, маці з тутэйшых. Эрык — звычайны мулат-беларус. Тыдзень таму я паабяцаў Эрыку сустрэчу, на якую не пайшоў. Эрык жабрак, папрашайка... А я ведаю шмат розных спосабаў прыстроіць грошы, акрамя таго, каб аддаць іх чалавеку, няздатнаму зарабляць. На душы ніякаватасьць. Падмануў чалавека. Эрык ня згадвае абяцанкі. Ён выцягвае з валізы на сьвет божы сапфіравае блюда. "Куплю. Трэба есьці, а грошай няма. Скраў блюда. Сапраўдныя сапфіры й золата. Ніхто не купляе. Баяцца..." "Давай выйдзем з унівэрсаму. Людзі азіраюцца..." "Ты ідзі на вуліцу, а я куплю цыгарэты й даганю".

Лета. Гарачыня. Асфальт мяккі, як плаўлены сыр. Вуліца Леніна бязьлюдная. Сядаю на лаўку ў ліповым сквэрыку. Прыходзіць Эрык. Мулат плача — згубіў сапфіравае блюда... Дзе згубіў? Як згубіў? Прачынаюся. Сонца высока.

Можна ўсё ператлумачыць, запоўніць страты, падапісваць сказы й зьвязкі паміж падзеямі. Не хачу. Паэзія сноў існуе паміж словамі, між абзацамі, у лакунах.

Калі ты пабачыш — глядзі на кракадзіла.

Хургада — Менск. 1997 год.



Здымак Алены Адамчык

італьянскімі вуснамі. Службовая інструкцыя не дазваляла, каб нейкая машына сядзела на хвасьце больш за паўгадзіны. Іфігенія сьвята шанавала службовыя інструкцыі.

Сусед кіроўцы, відаць, ніколі не расставаўся з чорнымі акулярамі. Пазіраў ён крыху спадылба, прымружыўшы вочы. Сінія, здаецца. Акуляры ляжалі на тым плячы, якое бліжэй да бляндынкі. Іфігеніі было б шкада забіць такога мужчыну.

Жанчына за рулём раздражняла. Усё ў ёй раздражняла. Цёмна-сіні пінжак і каралі раздражнялі. Іфігенія ўяўляла сабе, як туфлі колеру хурмы націскаюць на газ. Нейкія Габрыэле і Эльза. Не, Габі не пасуе, Пэпэ лепей. Нудная Эльза і Пэпэ.

Ля базылікі ніякі д'ябал ня езьдзіць, а "Сааб", вытрымаўшы ветлівую адлегласьць, выкруціў за ёй на Сіманіс. Але пэсымістычна, вельмі пэсымістычна вяла машыну Эльза. У такіх на пальцах нанізана палова таго, што прадаецца на Понтэ-Вэк'ё. Такія доўга не жывуць. Бязвольная морда. Бязвольная смазьлівая морда.

Пасьля базылікі Іфігенія патэлефанавала Бобу. "Не, Боб, мабыць, абодва італьянцы. Жанчына дык дакладна, што не расейка... Што дзякуй Богу? Што дзякуй Богу?.. Едуць за мной дваццаць... Ніяк не рэагуюць. Тэлефон — не Калашнікаў, каб рэагавалі... Не перажывай, праблем ня будзе... Бывай".

Мы па-рознаму ставімся да людзей, цікавых для нас з гледзішча сэксу, і тых, што ў гэтую катэгорыю не ўваходзяць. Лепей бы гэтыя двое ехалі кожны на сваім "Саабе". Усё адно Іфігенія прафэсійных праблем ніколі ня мела.

Чаравічкі тупу-тупу, а пайшлі б вы ў дупу, ў дупу... Кольт! Калі яна заверне за рог гэтай ублюдачнай вуліцы, з "Сааба" яе ня будзе бачна тры сэкунды. Далей два выгодныя рагі па сэкунды чатыры кожны. Прапароць сядзеньне, пісталет — у цёплае месца між ляжкамі. Пад пісталет Іфігенія заўсёды клала памаду. Забабоны... Іфігенія была адным зь лепшых супрацоўнікаў усходняга дэпартамэнту. У лепшых супрацоўнікаў губы заўсёды мусяць быць чырвоныя.

Ну вось ён, нарэшце, парк. Ці лес, як называюць бэльгійцы. Усё, да першага павароту, і прывітаньне. Хоць бы за першым паваротам не апынуўся нейкі скаўцкі лягер. Гэта ж Бэльгія, тут усе бегаюць у кароткіх штоніках. Уся выхаваўчая праца пойдзе насмарку, калі пасярод лягеру дзядзька і цёткі пачнуць страляцца.

Можа, гэтыя на "Саабе" проста хочуць прыкалоцца? Іх праблемы. Рызыкаваць нельга. Шкада Сінявокага. Патэнцыйны баец. Няхай пажыве. Трошкі даўжэй.

Першую кулю — Нуднай, другую — Сінявокаму.

Тормаз дзьверцы пшык... ёсьць!.. дзе Сіня... пабах... пабах... пабах... пабах.

Іфігенія ўпусьціла Сінявокага, і той цяпер не шкадаваў патронаў, прыціскаў Іфігенію да зямлі...

пшыкцьвінк... пабах... пабах.

І раптам цішыня. І задаволены голас:

— Не страляйце, я — Артур!.. Бедная Ліза! А вы не пудлуеце, Іфігенія, трапілі проста ў лоб!..

Аказалася, што ў Баку нялётнае надвор'е, і рэйс перанесены на заўтра. Аказалася, што, на думку Артура, імя Іфігенія добра пасавала б як назва вакзальных кляззэтаў. І вось ужо гучыць самі ведаеце што з Шонбэрга. Нежывая Ліза чакае, калі яе знойдзе першы паліцэйскі патруль. Артур і Іфігенія едуць на Вандэркіндэрэстраат. Нібы вечна новыя фільмы, мінаюць дні нашага жыцьця. Ўаў, дні як дні, як тая шматзначная нага з шасьцю пальцамі, якую Іфігенія знайшла ў Амстэрдамскім порце намаляванаю на кардоне і забрала дахаты.

ГРАМАФОН.

Аляксандар Антончык

ПРОВАДЫ

Прысьвячаецца ваярам, палеглым пры Грунвальдзе

У шлях далёкі адпраўляе
Маці свайго сына,
Хлопца слаўнага чакае
Вітаўта дружына.

Адпраўляе, горка плача,
Шкода ёй крывінку.
Вусны ссохлі, ціха шэпчуць:
Шчасьця табе, сынку.

Конь пад хлопцам гарачыцца
Рыюць дол капыты
Чуе бітвы ён крывавай
Пах даўно забыты.

Неахвота вараному
Пакідаць абшары,
Дзе сваімі яму сталі
Рэчка, луг і хмары.

Дзе іскраціца раніцою
Ад расы палеткі,
І дубы на ўзгорку спораць
Зь ветрам, як падлеткі.

Разьвітаўся сын з бацькамі
І памчаў па полі.
Не убачыць мілы твары
Болей ён ніколі.

Хутка меч крыжацкі востры
Праб'е хлопцу грудзі.
І закрыюць яму вочы
Незнаёмы людзі.

Не пазнае мужны воін
Шчасьця перамогі.
Зьнікнуць зь ім, як сон-прывід
Радасьці й трывогі.

Вестка чорна родну матку
Скосіць, як былінy.
Стары ж бацька глуха войкнуў,
Вытра з воч сьлязіну.

Каму ж выкажа тугу
Красуня дзяўчына,
Што ня ўбачыць яе любы
Маленькага сына.

Не убачыць сынок татку
І яго магілу.
Зарасьце яна травою
Сярод поля, пылу.

Вырасьце праз час малеча
Ў дужага мужчыну.
Замест бацькі стане ён
Бараніць Айчыну.

Будзе маці адпраўляць
У шлях далёкі сына.
Родны дом яму заменіць
Грозная дружына.

Язэп Вісарыёнаў

ПРАВАДЫР І ВОРАГІ

Месяц павольна поўз у гару.
Поўнач. За вокнамі шолахі.
Млосна на сэрцы правадыру, —
Зноўку сасьніліся ворагі.
Быццам бы яву, відовішча ў сьне
Бачыў ён, жахам ахоплены,
Нібы ня ён, а Зянон на сьцяне
Ў рамцы, багетам аздобленай!
Нібы ня ён, а Пазьняк — прэзыдэнт,
Усенародна прызначаны,
А лука-шэнтаўскі імідж ушчэнт
Іхнай ягомасьцю страчаны!
Быццам ня ён, а нібыта над ім
Чыняць злачынна рэпрэсію...
Сон адляцеў неўзабаве, як дым,
Ды ж засталася дэпрэсія.
"Сон не ў руку відавочна, бо блеф!
Мроі капрызныя ў розуме!
Я ж задушыў назаўжды бээнэф,
Хопіць палохаць пагрозамі!!!
Каб не Барыс, дык запёк бы ў турму
Ўсіх бээнэфаўскіх лідэраў!
А каб саюз — гэт-бы на Калыму
Іх да апошняга б вытурыў!
А Калыма — гэта ж не Вашынгтон!
Кедры там бураць напільнікам,
Кормяць там "Сьнікерсам" кожны сэзон,
Зрэдку — апілкамі з быльнікам!
Ат бы іх дручылі там маскалі
Мовай расейскай з жаргонамі!
Бокам бы вылезьлі ім Віскулі
Й Хельсынкі ўсе зь Лісабонамі!
Я адмяню, калі прыйдзе пара,
Саміты ўсе ды канвэнцыі..."
Месяц схапаўся. Сьвятло ліхтара
Пляміць пакой рэзыдэнцыі...

Яўген Гучок

* * *

Ха-ха! Навошта друкі тут?
Аддай ім лепей чыстую паперу.
Да семачак прыладзяць хай яе.

* * *

Мой Бог! Чаму ну хоць бы я не эфіёп?
Бо там і Слова Божае, і кніга
Наўкол прымакцца людзьмі.

* * *

Так, кніжка пойдзе ў сьвет,
Ды ўсё часьцей людзкі падман узьнёслы
Ў яе з часамі будзе запаўзаць.

* * *

Адных да Бога кніжка прывяла,
Да д'ябла іншым
Паказала шлях.

* * *

Шчэ больш распусьнымі,
Баюся, зробіць кніга
Некаторых.

Генадзь Драгун

РЭВАЛЮЦЫЯ

Кожную раніцу народ як кісель кіпіць
Выліваецца з кватэр
Запаўняе сабою транспарт
Хвалюецца булькае пад стольлю
Прывозіць сябе на месца працы
Павольна выцякае
У той дзень народ ня стаў
Распырскваць сябе па трамваях
Пругкай кісельнай масаю пакрыў
Вуліцы плошчы праспэкты
паркі й сквэры
Так пачалася рэвалюцыя
Цяжка прыйшлося потым
прыбіральшчыкам
Змываць з асфальту чырвоныя
кісельныя плямы
Вычышчаць з бруку салодкія кавалачкі
крухмалу
О гэта было для ўсіх незабыўнае
ўражаньне

Алесь Макрацоў

* * *

Народ незалежны
гаворыць з сусьветам
сам-насам.

Залежны народ
размаўляе з сусьветам
праз пасярэднікаў.

* * *

Расейская мова —
гэта страўнікавы сок,
з дапамогай якога
Расея,
як пачварная амёба,
пераварвае
захопленыя народы.

Агата Нагорная

РОЗДУМ КАЛЯ ХРАМУ

Жывем у час, калі прадаць
Магчыма ўсё: Радзіму, душы.
У сябе самой хачу спытаць:
Навошта і куды мы рушым?

Жыцьцё — кірмаш, душа — тавар,
Які заўсёды мае попыт,
І ўвіхаецца сьвятар,
Нібыта ўладальнік шопу.

І адчуваецца прымус
У цеснаце "сьвячное крамы",
Таму даруй жа мне, Ісус,
Я не малюся ў гэтым храме.

Малітва — гэта стан душы
І найінтымнейшы занятак,
Шкада, калі яе вяршыць
Няўцямны і балючы статак.

Каб адбывалася ў душы
Сьвятла над цемрай перамога,
Разглядзець трэба праз крыж
Свой асабісты шлях да Бога.

Сяргей Папар

ГАРЫЗАНТАЛЬНЫ СЮЖЭТ

У паэта была карэта,
для сюжэта — дарога ў лета
і пагода... Была свабода,
і жанчына — адна пагода!

Што за кратамі
у сакрэце?
Што за кропкаю
у сюжэце?
Толькі сэнсу натхнёны круг,
бессэнсоўны
падумкі
рух.
(І жанчына — каханка-друг).

Без карэты сядзець паэту
там, дзе Пушкін мяняў манжэт...

Вэртыкальнаму сілуэту
супрацьўнічае
сюжэт.

Сяргей Прылуцкі

* * *

Наш дом. Які ён?
Навошта мы?
Якая наша місія?

I

Як выйдзеш у поле,
Размаляванае пялёсткамі жывымі
Рознакаляровымі,
Ды патрывожыш цішыню
Ветрападобным крыкам —
Прыслухаецца рэха,
Паўторыць, панясе яго
Над роднымі лугамі,
Туманна цёмна-сінімі
Лясьнымі гушчарамі,
Азёрамі, рачулкамі,
Што ўцісьнуліся паміж
Духмяных траў і векавых дубоў,
Сьвятых вёсак і таямнічых хутароў.
Гукі паляцяць
У бясконцую далечыню
Скрозь сьнежныя аблокі,
У самы цэнтар Сусьвету...
Ды зьнікнуць непрыкметна
За малочнай фіранкай
Соннай імглы.

Хвіліну, дзьве стаім, гадзіну,
Ужо й сьлёзы з вачэй пацеклі —
Бліснуць усё перад табой
Радаснай усьмешкай —
Праменьчыкі ласкаюць
Жоўтым сонечным цяплом.
І гучыць у вушах,
Гучыць чароўным непаразуменьнем:
"Няўжо ж гэта шчасьце, няўжо?!"
І чутна ўсё і ўсіх.
І нават сьціплыя каменьчыкі
На дне маленькай
Празрыстай шкляной крынічкі
Лапочуць нешта мілагучнае, прыемнае,
так сьмешна перакульваюцца,
Скачуць адзін цераз аднаго.
"Ш-ш-шо-Ш-ш-шо",—
Самотна абураецца
На шэрых галінах
Зялёнае, жывое канфэці,
Трымціць.
Свавольніка-ветрыка сварыць.
А яму што?
Такі бязьлікі,
Такі далёкі і такі блізкі.
Хто ён такі,
Бясклапотны і свабодны?
Весяліцца — ягоны крыж.

II

Бясконцая, бясконцая зямля...
Маўклівая дзявочая прыгажосьць...
З-за цёмнага рогу
Выглядвае, нэрвуецца вечар.
Вось час ляціць.
Ужо чырвоным захадам гучыць:
"Я — Сонца!"
Упарта рэха непакорлівае грыміць:
"Я — Чалавек!"
Свабода,
Свабода!
Вакол — свабода,
Вакол — любоў,
Начэй сакрэты.
Там, дзесьці на Кудыкінай гары
Успыхваюць кропкі-ліхтары,
Над лесам белай прасьцінай
Усплываюць туманы.
На чорным небе — белая камэта.
І цішыня...

III

Ці задаваў ты сабе, сябра,
Пытаньне:
"Навошта я жыву?
Зь якой місіяй
Прысланы я зь невядомасьці?"
Птушка нараджаецца,
Каб у гукі пераўтвараць
Крышталынасьць прыроды,
Жывёліны — быць часткай свабоды.
А ты і я? Зь якой нагоды
Існуем мы?

Быў час, жылі бясклапотна,
Спакойна паміралі,
Змагаліся, гінулі
У імя ідэі,
Блізкай сэрцу.
Хто шчасьце прынес,
А хто — крыві мора,
А хто надзею пацягнуў
У магілу за сабой
І ў кожнага,
Каго прыслаў у гэты сьвет Усявышні,
Было, ёсьць, будзе
Прызначэньне.
Яно замуравана ў сэрца.
Мэта ж місіі — ня гора,
Ня крыж, ня смог —
Жыцьцё ў імя чалавека.
Дзеля жыцьця ўсяго жывога,
Дзеля будучыні,
Але, але...
Ня ўсе дайшлі да канца.
Загінулі без супраціву
У пачатку цяжкага шляху.
Не даглядзелі іх,
Ня ратавалі.
Прашу цябе,
Не павяліч чорнага сьпісу.

Барані цябе Гасподзь
Ды любоў блізкіх.

Браніслаў Пяткевіч

ЯВА

Няўжо Беларусь зьнемагла?
Пад ботам чужынца дыханьне
З усходу няволі імгла
Прынесла заўчасна зьмярканьне.
Грукоча няшчасьця цягнік,
Ад жаху панікла жывое.
Груган прыляцеў на пікнік,
Узброены шчэццю канвоя.
Зямное жыве, не жыве,
Прытушаны зоры Пагоні,
Раструшчаны кветкі ў траве,
Культуры зьнявечаны скроні.
У здрады нахабны дыктат,
Узьлезла на шчыт беззаконьне.
З часовых дзяржаўных палат
Шпурляньне жыцьця у бяздоньне.
А крызыс кусае, грызе
Наш лёс, нешчасьлівую долю.
Закон на зламанай назе
Імкнецца з надзеяй на волю.
У сілу ідзе патрыёт,
Хоць сэрца яшчэ маладое.
Ён вырасьце ў моцны народ
Ад роднай расы сырадою.
Хто хворы — падніме з калень,
У цемру пранікне сьвятлом,
Абсяг аббяжыць, як алень,
І кіне гнілое на злом.

Тацяна Сьнітко

* * *

... Ня руху адсутнасьць,
а кропка дарогі —
Прыпынак...
Утульна паклаўся пад ногі
Пункцірам нябачным асфальтавы
шлях
Я бачу муры ды зубчатыя вежы...
Размытыя цені начнога памежжа,
І шэрань, і вільгаць туману ў вачах.

І раптам цямнее, і проста па твары —
Шалёным даждом азьвярэлыя хмары,
Па шчоках зямных б'юць сьлязамі нябёс.
І шэпат, нібыта наўкола ня горад —
Высокія дрэвы счарнелага бору.
На змытай дарозе рыпеньне калёс...
Душа ледзянее. Ні гуку, ні зоркі.
А з грунту, як чорт
павыцягваў падпоркі —
Зямля хістанулася, бруд хадуном...
Тут лясьнуў пярун!
Секанула маланка...
Паўмёртвы ад жаху, ля нечага ганку
Выкідвае конь пад зубчатым мурам.

Палалі ў каміне сагрэтыя рэшткі
Сышоўшага лета.
Чырвонаю сьцежкай
Чарговая восень прысьпешвала крок.
Штосьці не адпускала... Палац
старажытны?..
Ці вочы з пытальніка
дзіўным адбіткам?..
І я адвярнулася. Бы незнарок.

* * *

Не, мне не халодна...
Агеньчык з каміну —
Пякучая ноша!
... А ранак мясьціну
Бяззгубна і ўпэўнена адваяваў
Агністаю стужкай над вежай
зубчатай.
Ды што гэта?
Вусны жалезныя кратаў,
І горад над багнай дрыгнюткаю
стаў...
І побач з касьцёлам з-за муру
старога
(чырвонага й белага)
нібы прысуд:
То позірк знаёмы — з акна на дарогу:
"Ну што я казаў?
Зноў вы там... А я тут!.."

* * *

Ах, вось як?!
Няпраўда!..
Забыліся, мусіць:
Мы разам, таму што мы —
ў Беларусі!
На гэтай падоранай Богам зямлі!
І ў гэту праклятую Богам часіну!
Сюды, у сутарэньне часоў і краінаў
Якія вятры вас цяпер занясьлі?!
Навошта?..
А рэшткі нястлелага лета,
Узятыя мною калісь напракат,
Вяртаю!..
... Прывід кратаванай карэты
Імчыць па Нямізе з канвоем салдат...

Яўген Сялюк

БЕЛАРУСЬ

Жыве Беларусь, мая родная маці,
Адольвае горда і цемру, і час.
Калодкі зьмяняе, бывае, на лапці,
Зьнішчае ўсе помнікі жудасных каст.

Ідзе яна ціха, але непрыпынна,
Як быццам далёка яе хто заве,
Навокал яна аглядаецца пільна,
Бо была ўжо ў вялікай бядзе.

Жыве Беларусь і жыць яна будзе,
Нічога, што жыць не жадаюць ёй даць.
Ніхто Беларусь маю не загубіць,
Няма чаго сьмерці краіны чакаць!

У РОДНЫМ КРАІ

Прырода маёй Беларусі,
Такой ва ўсім сьвеце няма.
Каб толькі былі ў мяне гусьлі,
Аб ёй загучала б струна.

Лясы, палі і балоты —
Свабоды маёй сябрукі.
Пчаліныя мілыя соты —
Бы ў вершы прыгожым радкі.

Вільготны ветрык наш родны
Нам жарты на крылах нясе.
Азёры блакітам лагодны,
Бліскучы ва ўласнай красе.

Так вы ж спадары Беларусі,
Вы людзі свабоднай зямлі.
Трымайце мацней свае гусьлі
Ды крочце па цёплай ральлі!

Тацяна Ульянычава

НАВАЛЬНІЦА

Цемра. Усе ўжо сьпяць,
На небе зоркі не зіхцяць.

Раптам грымнула, зазьзяла,
Неба наўскасяк парвала.

Людзі ўсё жыцьцё ілгуць,
Грахі спаць ім не даюць.

— Гэта наша пакараньне? —
Задаюць сабе пытаньне.

Доўга Бог нас усіх пужаў,
Але дождж страх разагнаў.

* * *

Радзіма мая Белай Руссю завецца
І гонар у сэрцы маім не зьвядзецца.
Я з сумам кладуся ўвечары спаць,
Пад гімн расейскі ізноў мне ўставаць.

ЖЫЦЬЦЯ ГАДЫ

Прыйшлі гады...
Ня веру я ўжо ў цуды,
У перамогу добрага над злым,
У моц юнацкага кахання,
Сяброўства вернага над усім.
Ідуць гады...
Надзея ўжо памерла,
І вера гасьне ўсё хутчэй,
А сэрца стукнула, замерла,
Мо памыляцца мне звычней?
Прайшлі гады...
У душы мацнее недавер,
Дзявочая наіўнасьць не зьнікае,
Жаданьне ёсьць вярнуцца на спатканьне
З надзеяй, вераю, каханьнем.

ЗБАВЕНЬНЕ

Вось хутка прыйдзе і вясна,
Прачнецца ўся прырода з сна,
І сэрцы чалавечыя адмерзнуць,
І пасьля сьнежнай белізны адверзнуць
Свае вароты.
Зойдзе ў іх вясна.
Варожыя паміраца народы,
Забудзецца вайна,
Хутчэй прыйдзі, вясна.
І людзі ўжо ня будуць так сьпяшацца
Злавацца, баяцца, сварыцца,
І лёсы нашыя ня будуць так ламацца,
Рвацца, біцца, нібы шкло.

Пачуцьцяў чысьціня ізноў адновіцца,
І добрыя адносіны ўзновяцца.
А зараз усё яшчэ ідзе яна,
Чачэнская вайна.

II.1996 г.

МЕНСК

Мой родны горад, як я сумавала,
Як цяжка ў разлуцы нам было.
Тут упершыню я плакала,
І ўпершыню дазналася пра зло.

Мой родны горад, я зачаравана
Чароўным пахам ліпавых алей,
Цьвіценьнем яблыневых кветак
І летнім шолахам тваіх палей.

Мой родны горад, часам я блукала
Па ціхіх вулічках начных,
З табою ранак сустракала
І не дзялілася ні з кім.

Мой родны горад, тут схаваны
Бясцэнны скарб маёй душы,
Цябе забыць мне ўсё складней,
Сустрэчы час хутчэй бяжы.

Так горад родны ўспаміналa,
Калі аднойчы пакідала.

Андрэй Храпавіцкі

БЕЛАРУСЬ

Мой сябра, якога я ведаў калісьці,
казаў на вэрандзе ў цяні ад дрэваў:
"О, Беларусь! Якой бы ты ні была
ты мая Радзіма, і я цябе люблю!"

Зараз скажу й я табе! О, Беларусь!
шукаў тваю я пэрліну ў кнігах,
у вершах Багдановіча, Купалы,
і нават на рэпрадукцыях Малевіча,
у музэях і кнігарнях.
Але цяпер я зразумеў, дзе цябе шукаць.
Шукаць цябе ў лесе, у амшары трэба,
у вёсцы сярод заімшэлых хатаў,
ля замкаў і млыноў, што ляжаць у руінах,
лістоты, што расьце праз мінуўшчыну
І гэта Ўолт Ўітмэн кажа пра тваю
несьмяротнасьць.

О, Беларусь! знайшоў цябе я там,
дзе не знайшоў ніхто.
Я ўбачыў цябе на закінутай фэрме.
Ты зьявілася мне прыгажосьцю сваёй
прыроды,
і я зьліўся з табой і ажыў.

Цяпер я — гэта ты і ты — гэта я.
Мы з табой разам, мая краіна!
Сьвяці мне, Беларусь, сьвятлом
Сырыўса,
напоўні мяне сваёй энэргіяй.
Беларусь, якая ты насамрэч,
Я ведаю, дзе цябе шукаць!

Юля Ціхановіч

Ахвярую Славаміру Адамовічу

Белы колер — чысьціні.
Шэры колер — бруду...
Што яшчэ магу сказаць
Гэткаму я люду?
Ён крычыць: "Ведь я живу!"
Ды не заўважае,
Што жыцьця няма яму,
Што ён памірае.
Паміраньне не спыніць,
Люд ня выйдзе з хаты.
Той жа, хто спрабуе жыць,
Хутка йдзе за краты.
Гэтак усё нармальна тут,
Гэтак тут "и надо".
Быў бы толькі сала пуд,
Люд і будзе рады.
І ня трэба люду больш
Ні жыцьця, ні волі,
І пляваць, што будзе горш.
Ён "всегда доволен".
Белы колер — чысьціні,
А крыві — чырвоны...
Толькі я прашу: жыві,
Сябра мой палонны!

* * *

Маё сапраўднае чаканьне —
Незразумелы цяжкі грэх:
І паміж намі не спатканьне,
А несьціханы горкі сьмех.
Глядзець у вочы — забарона,
І шэры пыл зьляцеў ізноў,
А горкі пах чужых далоняў
І шэраг будучых сяброў
Не разумеюць, што патрэбна
Яшчэ хвіліну прапаўзьці.
Хто дажыве, той будзе верна
Каля майго пляча ісьці.
Калі ж ракой крыві зноў сьмела
Зальюць бялюткія сьнягі,
Краіна бел-чырвона-белай
падобнай стане на сьцягі.

Ірэна Янчанка

Вось і ўсё. Вось і скончыўся год...
Сьнежань дзён завяршыў карагод.
Усе мары, памкненьні, надзеі
Замятае зімою завея.

Гэтай ноччу мой горад ня сьпіць,
Сноў звычайных спакойна ня сьніць.
Тлуму поўны ён ды мітусьні,
І паўсюль елкі, людзі, вагні...

Дрэвы ж дыхаюць ціха у сьне,
Калі гэта ня мроіцца мне,
Ці здаецца — памерлі яны,
Сапраўды ж — то чаканьне вясны.

Асэнсоўваеш пройдзены шлях,
Сьнег іскрыцца да болю ў вачах,
Ў думках жа незвычайны спакой,
Розум пасябраваў з галавой.

Новы хутка пачнецца ўжо год,
Дзён ізноў замігціць карагод,
Будуць новыя думкі, надзеі.
А пакуль што прыціхла завея.

* * *

Зіма. Пустэча. Халадэча.
Ўсё так салідна — ды ня вечна.
Чакай-чакай, прыдуць часы,
І ручаінаў галасы
Парушаць мёртвы твой спакой,
Ды нас паклічуць за сабой
Туды — ў нязьведаны абшар,
Дзе ёсьць прытулак нашых мар.
І ведаю ж я ўсё цудоўна,
Што тамка хістка ўсё, няўлоўна,
Што гэты жвавы ручаёк,
Так раздражнюўшы незнарок,
Кудысьці раптам уцячэ
І больш ня вернецца яшчэ.
Але яго вясёлы звон
Я буду чуць праз столькі дзён!..

Чакай, абрыдлая зіма,
Ты шчэ ня ведаеш сама,
Што ўся нязьменлівасьць твая
Баіцца звону ручая,
Што як ты сьнегам не мяці,
Як завірухі не круці,
Ды як ня сковывай ільдом
Маю рачулку ды мой дом.

Я ж буду хутка назіраць,
Як станеш сьпешна уцякаць,
Ды плакацца мне ледзяшамі
Вясёлымі Вясны дзянькамі.
І футра, футра падбяры!
Бо паглядзі — ляціць з гары
Табе, салідная, наўздагон,
Халодных ручаінак звон...

А гледзячы на тваю веліч
Мне мала хто цяпер паверыць.
За вокнамі — ўсё ветру стогн.
Тады адкуль я чую звон?..

* * *

Сьветла, сонечна ўранку,
Бо зімою калыханку
Адсьпявалі мне вятры,
Сівера правадыры.

Тыя казкі, што мне пелі,
Працягнуць не захацелі,
Ды я ведаю й сама,
Што прыносіць мне зіма.

* * *

Чыста, бела ўсё, прыгожа
Нават сумна троху можа,
Каб ня гронкі трох рабін
І ня лапікі ялін.

Асабліва той адной,
Што мой заняла пакой
Ды ня супраць пазмагацца,
Гаспадынькаю каб стацца.

Паглядае зьверху ўніз,
Выдумляе свой капрыз.
Але я ўжо не малая
І прыгожая (я знаю!).

Зараз стану на канапу,
Пацягну цябе за лапу,
Хоць ты й норава майго,
Паглядзім шчэ: хто каго!

Пад ялінкай падарункі,
Разьбірай хутчэй пакункі,
Шмат цікавага там ёсьць.
Дзякуй елка. Вось дык вось!

Можа даць табе цукерку?
Мандарыны — у талерку.
Ганарлівая, ня хочаш.
І ня трэба! Зьем сама.

За дзяцінства елчын подых
Дзякую табе, зіма!

* * *

Вось і скончыўся мой першы дзень,
Першы дзень мо' апошняга года...
А мінулага прывідны цень
Захінуў ужо той доўгі дзень,
Ў якім сонца адчайны прамень
Для настрою ну чым не нагода?

Для настрою на будучы шлях,
Шлях адметны, цікавы, нялёгкі.
Ад напругі цямнее ў вачах —
Я адольваю мой доўгі шлях,
Што губляецца недзе ў вяках.
Дзе знайсьці моцы мне ці палёгкі?

Ды слабее папруга ў майго
Коня чорнага, як ноч узімку,
І ня ведаю я да таго ж,
Нарачы як мне коня майго,
Зь перабітаю правай нагой,
Што загоіцца па адпачынку?

Адпачынак чакае ўжо нас,
Бо зусім мы наблізілі мэту,
Што натхняе увесь гэты час,
Зоркай сьвеціць, і толькі для нас.
Дасягнем мы яе ў гэты раз.
Я амаль што ўпэўнена ў гэтым!

Зьвяртацца праз ***тэлефон*** *у Менску 239-78-49, спытаць Віталя;*
па пошце: *220085 Менск, а/с 5, Супрановіч Віталь Канстанцінавіч.*

Новыя кнігі, дасланыя ў рэдакцыю

Багдановіч М. Выбраныя творы / Уклад. С.Забродзкай, Э.Золавай і інш. Уступ. словы Н.Гілевіча і А.Бяляцкага. —Менск: "Беларускі кнігазбор", 1996. — 496 с. (4) л. іл. ISBN 985-6318-07-6

Каўка Аляксей. Жывом! Старонкамі беларускага самапазнаньня. —Масква-Менск: Выдавецтва Дзядзькі Язэпа, 1997. — 160 с., 6 іл.

Пяткевіч А. Літаратурная Гродзеншчына: Публіцыстыка. — Менск: Выд. цэнтар "Бацькаўшчына", 1996.

Сыны і пасынкі Беларусі / С.Барыс, С.Тарасаў, Г.Ланеўскі і інш.; уклад. Барыс С. — Менск: Полымя, 1996. — 416 с.: іл. 4200 ас. ISBN 985-07-0026-2

Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь: Текст с изм. и доп. по состоянию на 1 окт. 1996 г. / Вступ. ст. И.Мироничечко. — Менск: "Амолорес", 1996. — 272 с. 5000 ас. ISBN 985-6015-37-5

Церкви и Приходы Минска. — Менск: Свято-Петро-Павловский собор, Белорусское Православное Братство Трех Виленских Мучеников, 1996. — 192 с. 3000 ас. ISBN 985-6143-05-5

НАВІНКА

Выйшаў другі (пасьля "Выбраных твораў" Яна Чачота) том сэрыі "Беларускі кнігазбор". Гэта "Выбраныя творы" Максіма Багдановіча, куды ўключаныя ўсе найбольш значныя яго творы.

Том паступіў у кнігарні ў абмежаванай колькасьці. Але кнігу можна набыць у Доме літаратара ў пакоі 209. Тэлефон 236-09-09, спытацца сп. Генадзя Вінярскага.

НАВІНКА

Зьявіўся новы нумар навуковага выданьня KRYUJA , прысьвечанага, як адзначаецца ў падназьве, праблемам Крывікі, Балтыкі, Індагерманікі. KRYUJA — непадобнае на іншыя беларускае выданьне, якое ўводзіць зацікаўленага чытача ў сьвет этнакасмалёгіі.

НАВІНКА

Аляксей Каўка. Жывом! Старонкамі беларускага самапазнаньня. — Масква-Менск, 1997.

На матэрыяле гісторыі, літаратуры, асабістага досьведу аўтар разважае над праблемамі нацыянальнае самасьвядомасьці, духоўна-культурнае тоеснасьці сваіх суродзічаў.

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 30.000 БРБ):

1. **Новае Неба.** Сон у трамваі (1995).
2. **Новае Неба.** Go home (1995).
3. **Новае Неба.** Дзеці чоргнага гораду (1991).
4. **Крама.** Камэндант (1995).
5. **Крама.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **Крама.** Гэй там налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLa (1995).
8. **Ulis.** Life (1996).
9. **Уліс.** Чужаніца (1991).
10. **Уліс.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **Бонда.** Найлепшыя песьні.
12. **Мясцовы час.** Наша ўскраіна (1991).
13. **Палац.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **Рэнэсанс** (беларускі джаз).
16. **Беларускія народныя казкі.**
17. **Беларуская музычная літаратура** (т.т. 1-4).
18. **Беларуская гітарная музыка.**
19. **Залаты фонд беларускага рок-н-ролу** (т.т. 1-5).

т.1: Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **Мроя.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **Уліс.** Блуканьне (1996).
22. **Віктар Шалкевіч.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **Камэлот.** У краіне талераў (1995).
24. **Zindan** (1994).
25. **Крама.** The Best (1996).
26. **Андрэй Мельнікаў.** Гэта — Мы! (1996).
27. **NRM.** Одзірыдзідзіна (1996).
28. **Andrej Mielnikau.**
29. **Andrej Mielnikau.**
30. **Andrej Mielnikau.** Uspamin (1994-1995).
31. **Andrej Mielnikau.** Salam Samkam (1993).
32. **Valzyna Ciarescanka** (1991-1995).
33. **Ліцьвіны.** 5 сакавіка (1996).
34. **Беларуская сымфанічная музыка** (1996).

Зьвяртайцеся праз тэл. 239-78-49. Праз пошту: 220085, Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

Прадаю скэйт новы. Кошт 220 тысяч рублёў. Тэл.: 260-96-88. Бацюшка Сяргей

Увага! Толькі ў нас. Подпісы вядомых палітычных і грамадзкіх дзеячоў на фотаздымках, газэтах, кніжках. Замаўляйце. Тэл.: 236-50-98. Алесь Філіповіч

Катэдж у Радашкавічах мяняю на кватэру ў Менску ці прадам за 36 тыс. даляраў. Тэл.: (237) 9-45-30

Танна прадаецца крыху незавершаны вялікі катэдж у цэнтры Барысава. Пэйджынг 781101, абанэнт 434

Набуду часопіс "Крыніца" №9, 10, 11, 18. Тэлефанаваць у Маладэчна ў працоўны дзень з 8 да 17 гадзінаў. Тэл.: (8-273) 7-00-65. Спытаць Алеся

Куплю беларускамоўны адрыўны каляндар 1977 году. Тэл.: 2-83-25. Мазыр. Мікола Засінец

Любыя графічныя працы алоўкам ці тушам, эксьлібрысы. Тэл.: 234-79-17. Сяргей

Куплю польска-беларускі слоўнік. Прадам газэты Польшчы. Пісаць 224022 Берасьце-22, да запатрабаваньня, Уладзімеру Сямашку

Пазнаёмлюся зь беларускімі патрыётамі для сяброўскай перапіскі і сустрэч у Беларусі і Ўкраіне. Пішыце, званіце! Тэл.: (8-038-52) 5-24-09. Пятрусь Капчык

Запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх, каму дарагая ідэя Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы ў Беларусі. Кантактны адрас газэты БАПЦ "Царкоўны пасланец": 220005, Менск-5 а/с 185

Прадаю гараж "Ракаўка". Тэл.: 223-91-38. Сяргей

Вырабляем помнікі. Тэл.: 223-91-38. Сяргей

Паседжаньне Заходнепалескага навуковага таварыства "Загародзьдзе" пройдзе ў аўторак, 28.01. Тэма: "Готы і Зах. Палесьсе". Дакладчык — праф. Мартынаў. Найбольш запрашаюцца берасьцейцы і пінчукі. Інф. праз тэл.: 231-69-91

Сястрычкам Кацюшы й Веранічцы: віншую з Днём нараджэньня! Цалую абедзьвюх. Павал

Neways запрашае да супрацоўніцтва прафэсіяналаў MLM, лекараў, усіх ахвотных быць здаровымі і заможнымі беларусамі. Прывабныя ўмовы. Тэл.: 264-80-14. Наташа

Эканаміст (25) шукае працу з камандоўкамі ў Эстонію. Кампутар; анг., эст. мовы; катэгорыя "В"; жыльлё ў Таліне. Аляксей Шастакоў. Тэл.: 222-30-76 (сл.), 247-62-75 (х.)

Прывітаньне Юлі Івановай ад Пяткоўскай Машы. Юля, ты сапраўдная сяброўка!

Юля Ціхановіч! Твае сябры, Вітаўт і Сяржук, віншуюць з днём народзінаў. Жадаем усяго найлепшага!

Ігар Пушкін з Магілёва! Я згубіў тваю абвестку. Лявон.

КУПОН Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.
220123, Менск, а/с 71

Даведкі

Тодар Лебяда

Шаноўная рэдакцыя! Я хачу даведацца пра беларускага паэта Тодара Лебяду, што загінуў у савецкім канцлягеры ў часе другой сусьветнай вайны.

Мікола Сянкевіч, Бярозаўскі раён

Тодар Лебяда (сапр. Шырокаў або Шыракоў Пятро; 6.1.1914, Віцебск — 1970; пахаваны ў пасёлку Воршава Пуцяцінскага р-на Разанскай вобл.) драматург, паэт, празаік, публіцыст.

Зь сям'і рабочага. З маленства спазнаў галечу і нішчымніцу: бацька рана памёр, маці працавала праваднічай на чыгунцы. У Віцебску ён скончыў сямігодку і чыгуначную рамесную вучэльню, а ў 1933 паступіў у Менскі пэдагагічны інстытут. У гэты час піша нарысы і вершы, якія зьмяшчае ў газэтах "Віцебскі рабочы", "Савецкая Беларусь", "Піянэр Беларусі". У 1936 ён і яшчэ адзінаццаць студэнтаў інстытуту былі абвінавачаныя ў "буржуазным нацыяналізьме" і арыштаваныя. Вярхоўны суд БССР асудзіў яго на 5 гадоў. Тэрмін адбываў у Новасібірскай вобласьці. У 1940 на хадайніцтва жонкі Т.Лебяду прывезьлі ў Менск "для перагляду справы". Зь Менску адправілі ў Чэрвень, дзе і застала яго вайна. У час акупацыі жыў зь сям'ёй у Віцебску. У 1943-44 рэдактар газэты "Беларускае слова". Пісаў вершы, апавяданьні, драматычныя творы. Тут напісаная яго п'еса "Загубленае жыцьцё" — першы антыбальшавіцкі твор у беларускай драматургіі. У 1943 рэжысэр В.Сялях-Качанскі паставіў гэтую п'есу на сцэне Менскага гарадзкога тэатра, а ў 1952 яна выйшла ў Канадзе асобным выданьнем. У 1944 у Менску зьявіўся і першы паэтычны зборнік паэта "Песьні выгнаньня". У яго ўвайшлі вершы, напісаныя ў сталінскіх лягерах. У маі 1947 ваенны трыбунал войскаў МУС Менскай вобласьці зноў асудзіў Лебяду, на гэты раз на 25 гадоў. У якіх раёнах Сібіры адбываў ён свой тэрмін, невядома. Вядома толькі, што 30 жніўня 1956 ён быў вызвалены з-пад варты, а ў 1960 прыехаў у Слонім, дзе працаваў рэзчыкам паперы на кардоннай фабрыцы "Альбэрцін". Тут напісаў п'есу ў трох актах "У нас, на Гарадзеншчыне", прысьвечаную вясковаму жыцьцю. Пісаў і апавяданьні. У студзені 1962 пераехаў у Чэрвень і працаваў там у райгазэце. У канцы 1962 назаўсёды пакінуў Беларусь.

(Паводле "Біябібліяграфічнага слоўніка", т.6. — Менск, 1995)

Эміграцыя ў ЗША

У нашай непрадказальнай краіне такімі ж непрадказальнымі робяцца і нашыя жыцьці. Мне гэтага зусім ня хочацца. Хоць ня хочацца і пакідаць Беларусь. Аднак хто ведае, што нас чакае заўтра? У кожным разе нейкія зьвесткі пра магчымасьці эміграваць, напрыклад, у ЗША ня будуць лішнімі. Кажуць, існуе нейкая лятарэя для ахвотных пераехаць у гэтую краіну?

Лена К., Віцебск.

Паводле ўстаноўленай іміграцыйным законам ЗША візавай лятарэі 55.000 грамадзянаў іншых краін могуць выйграць візы на ўезд і сталае пасяленьне на амэрыканскай зямлі.

Хоць лятарэя й пачалася ў 1990-м годзе і, да прыкладу, палякамі была выкарыстаная так шырока, што сёлета ім удзел у ёй зачынены, у Беларусі яна амаль няведамая.

Права запісацца на лятарэю і, выйграўшы візу, прыехаць у ЗША маюць усе народжаныя ў Беларусі і ў краінах СНГ, калі маюць сярэднюю асьвету, або два гады практыкі ў прафэсіі, вызначанай Дэпартамэнтам Працы ЗША. Школьныя пасьведчаньні або довады працоўнае практыкі ня трэба пасылаць, запісваючыся на лятарэю, а чакаць, пакуль яны будуць запатрабаваныя. Можна падаваць толькі адну заяву на ўдзел у лятарэі, хто падасьць больш, будзе зусім адкінуты. Заяву можна падаць самому, або цераз пасярэднікаў.

Заяву трэба пісаць машынкай або ад рукі друкаванымі ангельскімі літарамі на аркушы звычайнае паперы, падаючы асабовыя дадзеныя, як паказана ніжэй:

1. Прозьвішча, імя й другое імя, калі ёсьць (не пісаць імя па бацьку). Прозьвішча абавязкова трэба падкрэсьліць.
2. Дата й месца нараджэньня (дзень, месяц, год і горад / сяло, вобласьць, край).
3. Імёны, даты й месцы нараджэньня жонкі (мужа) й малодшых за 21 год нежанатых (незамужных) дзяцей.
4. Поўны й дакладны адрас заяўніка (куды павінен ісьці адказ). Нумар тэлефону пажаданы.
5. Родны край (native country), калі іншы ад краю нараджэньня (country of birth). Тады, каб лучыць у лік эмігрантаў (квоту) зь Беларусі, можна падаць беларускае грамадзтва (Belarusian citizenship), калі яно ёсьць, або паходжаньне (Belarusian origin). Хто народжаны й жыве ў Беларусі, хай ня піша нічога.
6. Да гэтак выпаўненага ліста трэба прымацаваць празрыстай прыклейнай стужкай (прышчэпкі й шпількі не дазваляюцца) сваю нядаўнюю фатаграфію 37 мм х 37 мм, на другім баку якое друкаванымі ангельскімі літарамі напісанае прозьвішча й імя.
7. Заяву трэба падпісаць звычайным подпісам.

Запоўненую заяву трэба выслаць звычайным (не заказным) лістом у капэрце ад 15 да 25 см даўжыні і ад 9 да 11 см шырыні, заадрасаваўшы яго перш у верхнім левым куце таксама друкаванымі ангельскімі літарамі гэтак:

Край нараджэньня (BELARUS, або іншы).
Прозьвішча й імя.
Вуліца, нумар дому й кватэры.
Горад, вобласьць, паштовы код.
Край (BELARUS, або інш.).
Ніжэй заадрасаваць:
DV 98 PROGRAM
NATIONAL VISA CENTER
PORTSMOUTH. NH 00212 USA

Заяву выслаць поштай, найлепш авеятранай, каб дайшла не раней за 3 лютага і не пазьней за 5 сакавіка 1997 году, інакш яна будзе адкінутая.

Тыя, што выйграюць візы, будуць паведамленыя пра гэта ўлетку 1997 г., і тады атрымаюць далейшыя інструкцыі ў справе выезду. Іхныя жонкі (мужы) й непаўналетнія дзеці будуць таксама мець права на атрыманьне візаў. Афармленьне ўсіх дакумэнтаў на ўезд мусіць быць закончанае да 30 верасьня 1998 году.

Пачаткі жыцьця ў ЗША могуць быць нялёгкія й разьлічваць на якую-колечы дапамогу ў гэтых абставінах нельга, а трэба спадзявацца на свае сілы.

Інфармацыя падрыхтаваная Іміграцыйным Аддзелам Кансысторы Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Нью-Ёрку.

Дасылайце свае адказы пасьля апошняга пытаньня. Пераможца атрымае прыз.

Навацыі ў сыстэме распаўсюджаньня "НН"

З 1 лютага 1997 году (пакуль толькі ў Менску) найбольшая колькасьць газэтаў, што прадаюцца ў розьніцу, будзе паступаць у БАЗАВЫЯ ШАПІКІ, гэта значыць тыя, якія раней прадавалі найбольшую колькасьць газэтаў і выгодна разьмешчаныя ў горадзе. У іншыя шапікі будзе паступаць меншая колькасьць асобнікаў газэты. Мы спадзяемся, што нашым чытачам будзе зручней стала набываць газэту ў традыцыйных пунктах.

Апроч таго, з 1 лютага "Нашу Ніву" ў Менску можна будзе набыць у кнігарні "Сьветач", што на праспэкце Машэрава.

БАЗАВЫЯ ШАПІКІ "НН" У МЕНСКУ
(працуюць безь перапынку на абед і ў выходныя дні)

раён	№ шапіка	адрас
Ленінскі	№11	пр. Ф.Скарыны, 10 (каля Паштамту)
	№110	вул. Пуліхава, 3 (каля гастраному)
Цэнтральны	№1	пр. Ф.Скарыны, 38 (крама "Хлеб", мэтро "Пл. Перамогі")
	№109	вул. Заслаўская, 9 (каля гастраному "Заслаўе")
Кастрычніцкі	№41	вул. Маскоўская, 20
	№303	АС "Дружная"
Маскоўскі	№255	пр. газэты "Праўда", 14а
	№289	пр. Любімава, 26-1
Фрунзенскі	№14	вул. Арлоўская — Фінская запраўка
	крама №21	станцыя мэтро "Пушкінская"
Савецкі	№133	вул. В.Харужай, 6
	№225	вул. Кальцова, 48
Першамайскі	№162	пр. Ф.Скарыны, 89
	№164	пр. Скарыны — мэтро "Парк Чалюскінцаў"
Заводзкі	№200	пр. Партызанскі, 36
	№254	вул. Сурганава, 17
Партызанскі	№214	пр. Ракасоўскага, 119 (насупраць кіно "Салют")
	крама №2	пр. Ф.Скарыны, 44 (каля крамы "Оптыка")

"Наша Ніва" незалежная газэта
НАША НІВА
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
заснавальнік Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
выдавец БГФ "Наша Ніва"
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі Андрэй Лапцёнак, Віктар Корзун, Уладзімер Бараніч
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Тацяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125

 Наклад 5100. Нумар падпісаны ў друк 19[55], 26/1/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова №430. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.